Міжнароднае грамадскае аб’яднанне
«Згуртаванне беларусаў свету
«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

# Нашчадкі змагарнай славы

Сачыненні пераможцаў дзіцячага конкурсу
(люты–красавік 2004)

**Мінск**
**«Беларускі кнігазбор»**
**2004**

KAMUNIKAT.org

УДК 373.18(079):882.26.09
ББК 74.200.58
Н 37

***МГА «ЗБС «Бацькаўшчына»***
***выказвае шчырую падзяку***
***сп. Ірэне Калядзе-Смірновай (ЗША) —***
***мецэнату конкурсу і спонсару***
***выдання гэтай кнігі.***

© МГА «ЗБС
«Бацькаўшчына», 2004
© Афармленне, МГА
«Беларускі
кнігазбор», 2004

**ГАННА МІКУЛІК**
*(11 гадоў, г. Іванава Брэсцкай вобл.)*

## НАШЧАДКІ ЗМАГАРНАЙ СЛАВЫ

Я жыву ў горадзе Іванаве Брэсцкай вобласці на вуліцы Каліноўскага, 29.

Як толькі мы тут сталі жыць, мяне вельмі зацікавіла, хто такі Каліноўскі? Чаму яго імя ўвекавечана ў назве вуліцы?

Адказ я знайшла ў сабранай мной літаратуры, прачытала ўспаміны. Я зразумела, што гэты чалавек — змагар за нашу свабоду. Ён у самыя рашучыя моманты гісторыі змог павесці за сабой тысячы людзей. Гэты чалавек, якога нельга было ні напалохаць, ні збіць з тропу, ён адзін каштаваў сотні.

Мяне здзівіла, што навуковая і навукова-папулярная літаратура пра яго ёсць на дзесяці мовах.У мастацкай жа літаратуры з'явіліся такія выдатныя творы, як балада П. Броўкі «Кастусь Каліноўскі», паэма Аркадзя Куляшова «Хамуціус», раман У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» і трагедыя «Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць».

Цікава было даведацца, адкуль ён родам, з якой сям'і. А нарадзіўся Кастусь (сапраўднае імя Канстанцін Вікенцій) 2 лютага 1838 года ў вёсцы Мастаўляны Гродзенскага павета. Паходзіў са шляхецкага роду Каліноўскіх. Род меў свой герб Калінава — па назве аднайменнага маёнтка, якім продкі К. Каліноўскага валодалі ў Бранскай зямлі, але ў другой палове XVIII стагоддзя Калінава было прададзена, і Каліноўскія сталі беззямельнымі.

Рана хлопчык застаўся без маці. У доме паявілася другая жанчына, якая больш увагі аддавала сваім дзецям, чым пасынку. Кастусь вучыўся спачатку ў Свіслацкай гімназіі, пасля заканчэння пераехаў у Маскву да старэйшага брата Віктара. Праз некаторы час браты пераехалі ў Пецярбург, Кастусь стаў студэнтам юрыдычнага факультэта універсітэта.

Чаму я так падрабязна пішу аб гэтым? Таму што перыяд вучобы — гэта час, за які адбылося станаўленне светапогляду Каліноўскага. У гэты перыяд ён па-сапраўднаму адчуў сябе сынам Беларусі, зразумеў, што за яе будучыню трэба змагацца з тымі, хто зневажае правы карэнных жыхароў роднай зямлі. Кастусь вельмі ганарыўся беларусамі, якія прынялі ўдзел у паўстанні 1794 года, а

пасля і 1831-га. Ганарыўся і сваім земляком Тадэвушам Касцюшкам.

Я была ўражана тым, наколькі Каліноўскі быў адказным і мужным чалавекам. Ён спачатку стварыў падпольную арганізацыю на Гродзеншчыне, а пасля ў Вільні ўзначаліў Правінцыйны камітэт: гэта быў галоўны арганізацыйны цэнтр «чырвоных» Беларусі і Літвы.

А як ён любіў свой народ! Ён лічыў, ды яно так і ёсць, што наш народ вельмі слаўны багатай нацыянальнай гісторыяй і традыцыямі.

Кастусь Каліноўскі і яго паплечнікі смела і рашуча падтрымалі паўстанне 1863 года ў Польшчы.

Мне вельмі спадабаўся пароль паўстанцаў:

— Каго любіш?

— Люблю Беларусь.

— Так узаемна!

Нельга не захапляцца і тым, што Кастусь Каліноўскі ніколі не здрадзіў свайму народу. Прызнаваўся ён аднаму са сваіх паплечнікаў: «Не дбаю ані чуць, то праз акно на дах, то іншымі спосабамі заўжды шчасліва з іх рук [меў на ўвазе царскія ўлады] выслізгваю. Бог нада мною апякуецца, а калі прыйдзецца павіснуць, то хай гэта будзе на пацеху ўсім літоўскім панам».

Але шпікі даведаліся канспіратыўны адрас Каліноўскага. Ён быў адпраўлены ў турму.

А як годна ён паводзіў сябе там. Літасці не прасіў. У вольны час пісаў «Пісьмы з-пад шыбеніцы».

Мне вельмі спадабаўся яго верш «Марыська чарнаброва, галубка мая...».

Для сваёй любай вось гэтыя радкі:

Марыська чарнаброва, галубка мая,
Гдзе ж ся падзела шчасце і ясна доля твая?
Усё прайшло, — прайшло, як бы не бывала,
Адна страшэнна горыч у грудзях застала.

Кастусь верыў, што не марна пражыў на зямлі.

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе.
І часам спамяні пра Яську свайго,
Што згінуў за праўду для дабра твайго.

Недарма пражыў свой век гэты цудоўны чалавек. Ён лічыў, што аб’ядноўвае людзей толькі любоў да Радзімы, да Беларусі.

З цікавасцю я даведалася пра ўсё, што напісала.

Я ганаруся тым, што жыву на вуліцы Каліноўскага, і хачу быць дастойнай яго.

Мае малодшыя брат Андрэй і сястрычка Каця яшчэ толькі ў другім класе, але таксама цікавяцца асобай Каліноўскага. І гэта зразумела. Мы — нашчадкі яго змагарнай славы.

KAMUNIKAT.org

**ВАЛЕРЫЯ ВАРШУК**
*(11 гадоў, г. Петрыкаў Гомельскай вобл.)*

## СТЭФАН БАТОРЫЙ

Стэфан Баторый (1533–1586) — адзін з самых уплывовых і моцных каралёў. Паходзіў са старажытнага венгерскага роду Баторыяў. У 1576 годзе пасля каранавання ў Кракаве прызнаў раўнапраўе Польшчы і Вялікага княства Літоўскага ў складзе федэратыўнай дзяржавы. Вядомы Стэфан Баторый і як рэфарматар, дыпламат, мецэнат навукі.

Я пра Стэфана Баторыя напісала верш.

Стэфан Баторый, у Кракаве каранаваўся,
Каралём, вялікім князем зваўся.
Дыпламат, палкаводзец,
Шмат атрымаў перамог,
Храбра, мужна ён змагаўся
І крэпасць адбіць ён змог!

## ПІСЬМО З XVI СТАГОДДЗЯ

З Гародні пішу. Веюць ветры гісторыі. Цякуць рэкі. Зімы змяняюцца вёснамі.

Сам час прызначыў мне, Баторыю, ролю палкаводца. Я — кароль Рэчы Паспалітай. 15 лютага 1563 года войска Івана IV захапіла Полацк (да Вільні было 200 км). Вільня не хацела губляць Полацк. Вялікае княства Літоўскае звярнулася да Польшчы. У 1579 годзе я з войскам у 40 тысяч чалавек рушыў на адваяванне Полацка. Рускія жаўнеры паводзілі сябе дастойна. Жывым я дараваў волю; з майго стану адарыў шляхецтвам таго, хто праявіў сябе мужна.

У 1580 годзе мы рушылі на Пскоў. Як мы змагаліся! Мае воіны і нашчадкі, то прыклад для Вас! Мяне называлі шчодрым мецэнатам, умелым дыпламатам, храбрым ваяром. Я шчаслівы быў гэтым.

*Я, Стэфан Баторый*

**МІХАСЬ КАЗАК**
*(12 гадоў, г. Рыга, Латвія)*

## ЛЕЎ САПЕГА — ГОНАР МАЁЙ АЙЧЫНЫ

Мне вельмі падабаецца чытаць кнігі па гісторыі, асабліва па гісторыі Беларусі. Бо трэба ведаць, як жылі людзі да нас, што яны рабілі. Тым больш трэба ведаць сваю гісторыю — гісторыю сваёй краіны, гісторыю свайго народа. Бо народ без мовы — не народ, а краіна без гісторыі — не краіна. У гісторыі Беларусі было шмат цікавых, значных і важных перыядаў. Напэўна, самы галоўны з іх у гісторыі да XX стагоддзя — гэта XVI век. Гэты час ва ўсёй Еўропе вядомы як перыяд Рэфармацыі. Рэфармацыя на Беларусь зрабіла не меншы ўплыў, чым на многія іншыя еўрапейскія краіны. Рэфармацыю называюць залатым векам Беларусі. Гэты час даў краіне вельмі шмат знакамітых беларускіх дзеячаў, такіх, як Францішак Скарына, Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Астафій Валовіч, Леў Сапега, Ян Кароль Хадкевіч і многія іншыя, якімі павінен ганарыцца кожны беларус. На мой погляд, самай значнай асобай у эпоху Рэфармацыі ў Беларусі быў Леў Сапега, які больш за трыццаць гадоў быў канцлерам Вялікага княства Літоўскага. Дзякуючы яго дзейнасці як дзяржаўнага дзеяча, дыпламата, юрыста, палітыка, публіцыста наша краіна падчас яго кіраўніцтва дасягнула найбольшай незалежнасці і росквіту. Калі я даведаўся пра жыццё і дзейнасць гэтага беларуса з некалькіх кніг, то быў вельмі ўражаны, наколькі самаахвярным, адданым Айчыне было ўсё яго жыццё.

Леў Сапега нарадзіўся 4 красавіка 1557 года ў маёнтку Астроўна Віцебскага ваяводства. У Беларусі род князёў Сапегаў быў вельмі старажытным. У Льва былі ад прыроды вялікія здольнасці да навук. Бацькі аддалі яго ў лепшую ў той час Нясвіжскую пратэстанцкую школу, якая існавала пры двары беларускага князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Яшчэ ў дзяцінстве Леў Сапега акрамя беларускай мовы выдатна аваладаў польскай, нямецкай, лацінскай, грэцкай мовамі. Ужо ў 13-гадовым узросце Леў Сапега паступіў вучыцца ў знакаміты Лейпцыгскі універсітэт у Германіі, дзе ён вывучаў творы антычных філосафаў, гісторыю рымскага і царкоўнага права, хронікі сярэднявечных гісторыкаў, а таксама пазнаёміўся з рэфармацыйнымі вучэннямі Лютэра і Кальвіна.

Пасля таго як вельмі разумны і працаздольны малады Леў Сапега вярнуўся на радзіму, яго прынялі на службу да двара Стэфана Баторыя.

Калі на Вялікае княства напала Маскоўшчына, Леў Сапега за свае грошы сабраў і ўзброіў харугву і стаў яе камандзірам. За мужнасць у змаганні з ворагам Льва Сапегу прызначылі на пасаду сакратара Вялікага княства. Потым ён стаў галоўным пісарам Канцылярыі Вялікага княства. Вялікім дасягненнем Льва Сапегі ў той час было стварэнне разам з канцлерам Астафіем Валовічам і падканцлерам Крыштафам Радзівілам (Перуном) Трыбунала Вялікага княства — апеляцыйнага гаспадарчага суда. Потым Леў Сапега паказаў сябе як бліскучы дыпламат. На поўдні нашай Бацькаўшчыне пагражалі туркі і крымскія татары, таму, каб адбіцца ад іх, трэба было падпісаць замірэнне з іншым ворагам — Масковіяй. Леў Сапега, якому тады яшчэ не споўнілася і 27 гадоў, паехаў з пасольствам да расійскага цара. Ён узначальваў пасольства ў складзе 275 чалавек. Леў Сапега падпісаў мірную дамову з Масковіяй на 10 гадоў, а таксама вызваліў з царскага палону без ніякага выкупу 900 беларусаў. Удалыя перамовы зрабілі Л. Сапегу славутым дыпламатам. За гэта ён атрымаў ад Стэфана Баторыя пасаду падканцлера Вялікага Княства. Гэтая пасада дала магчымасць Л. Сапегу свае веды, розум, талент выкарыстаць для стварэння магутнай беларускай дзяржавы, якая магла б супрацьстаяць ворагам, эканамічна і палітычна быць незалежнай ад Польшчы.

У 1588 годзе Львом Сапегам разам з канцлерам Астафіем Валовічам быў падрыхтаваны трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага. Статут быў зацверджаны каралём, але не быў надрукаваны, і амаль ніхто з ім не хацеў лічыцца. Нават сам кароль парушаў законы Статута, напрыклад, аддаваў дзяржаўныя землі і пасады ў Вялікім княстве палякам. Тады Леў Сапега на асабістыя сродкі надрукаваў Статут і разаслаў яго па ўсіх дзяржаўных установах. Трэці Статут быў тады самым перадавым і самым дэмакратычным зборам законаў у Еўропе. Шмат якія з прынцыпаў Статута былі вельмі прагрэсіўныя на той час, напрыклад, прэзумпцыя невінаватасці, рэлігійная талерантнасць. Закон прадугледжваў, напрыклад, адказнасць шляхціца за забойства простага чалавека, больш суровую кару за злачынствы супраць жанчын, кожны вольны чалавек меў права паехаць за мяжу,

вольныя людзі не маглі быць аддадзенымі ў няволю, іншаземцы не маглі валодаць зямлёй і займаць дзяржаўныя пасады ў Вялікім княстве, ад крымінальнай адказнасці вызваляліся падлеткі і дзеці да 18 гадоў. Статут абараняў прыроду, каштоўных звяроў і птушак. З выданнем Статута 1588 года Вялікае княства стала больш незалежным ад Польшчы. Згодна са Статутам, дзяржаўнай мовай была беларуская мова, на ёй гаварылі і пісалі ўсе дакументы ва ўсіх установах, ёю карысталіся ўсе галоўныя асобы княства. Статут быў напісаны і надрукаваны таксама на беларускай мове, зразумелай практычна кожнаму жыхару Вялікага Княства. «Не чужой якой-небудзь мовай, але сваёй уласнай правы свае пісаныя маем і на любую крыўду адпор сваімі законамі дадзім», — гэта словы Л. Сапегі з яго прадмовы да Статута. Статут складзены і выдадзены быў для таго, каб гарантаваць абарону правоў усіх жыхароў Вялікага княства, каб стварыць прававую дзяржаву, гэта таксама напісаў у сваёй прадмове да друкаванага Статута Леў Сапега. Статут быў перакладзены на лацінскую, польскую, нямецкую, французскую, рускую і ўкраінскую мовы. Гэты Статут дзейнічаў вельмі доўга, нават тады, калі Беларусь ужо апынулася пад Расійскай імперыяй — да 1840 года.

У канцы XVI стагоддзя, калі Леў Сапега ўжо быў канцлерам, пасля аб’яднання Вялікага княства Літоўскага з Каралеўствам Польскім у Рэч Паспалітую, у нашай краіне пачало ўзмацняцца каталіцтва. У Вялікім Княстве большасць жыхароў былі праваслаўнымі, і маскавіты хацелі захапіць Вялікае княства пад выглядам абароны адзінаверцаў. Беларускія праваслаўныя патрыярхі варожа адносіліся да католікаў, таму магла пачацца рэлігійная вайна. Рашыць гэтую праблему дапамагло стварэнне уніі, якая як бы аб’яднала ў Беларусі каталіцкую і праваслаўную веру. Леў Сапега падтрымаў унію, хоць сам быў католікам. Бо ён, як і многія іншыя, хацеў не толькі аб’яднаць абедзве веры, але і стварыць нацыянальную царкву беларусаў, незалежную ад маскоўскіх цароў і палякаў. Ён пісаў: «Я католік і з ласкі Божай католікам хачу памерці, але спакой Айчыны сваёй да скону дзён сцерагчы буду». Леў Сапега сам як каралеўскі камісар прысутнічаў на Берасцейскім царкоўным саборы, дзе падпісвалі унію, і выступіў з палымянай прамовай у яе падтрымку. Ён заўсёды стаяў на баку уніятаў. Ва уніяцкіх храмах казанні прамаўляліся на беларускай мове, таму з цягам часу большасць беларусаў стала уніятамі. Унія

праіснавала больш за 240 гадоў, яна абараняла беларусаў ад польскага і маскоўскага духоўнага прыгнёту.

Канцлер Леў Сапега паказаў сябе як выдатны ваявода і дыпламат яшчэ ў дзвюх войнах: з Масковіяй і ў вайне са шведамі. Спачатку ён адваяваў захопленыя раней Масковіяй Смаленшчыну і Чарнігаўшчыну. З Масковіяй быў падпісаны мір у 1618 годзе, па якому была скончана спусташальная для Беларусі вайна і былі аб'яднаны этнічныя беларускія землі. Калі шведскі кароль з вялікім войскам рушыў на Вільню і Полацк, Леў Сапега, які быў тады вялікім гетманам, ахвяраваў усю сваю маёмасць і скарб, набытыя за жыццё, каб выставіць перад ворагам вялікае і моцнае войска. Яго сын таксама на ўласныя грошы ўзброіў харугву, якая мужна змагалася са шведскімі захопнікамі. Шведскаму каралю тады не ўдалося захапіць Вялікае Княства Літоўскае, і са Швецыяй быў падпісаны мір. Шмат уласных грошай Леў Сапега ахвяраваў таксама на пабудову храмаў і на ўпарадкаванне архіва ВКЛ, а яшчэ ён сабраў вельмі багатую бібліятэку. У горадзе Бярозе, што побач з г. Белаазёрскам, дзе нарадзілася мая мама і жывуць мае бабуля і дзядуля, у 1618 годзе на грошы Л. Сапегі таксама быў пабудаваны велічны кляштар над ракою Ясельдай. На жаль, ён быў разбураны ў часы Расійскай імперыі пасля паўстання Тадэвуша Касцюшкі, і зараз ад яго захаваліся толькі часткі муроў і вежы, а выгляд кляштара я бачыў на малюнку Напалеона Орды.

Галоўным у жыцці Льва Сапегі была краіна, інтарэсы незалежнасці і дабрабыту краіны, а не свае асабістыя інтарэсы. Такімі павінны быць кіраўнікі Беларусі і ў наш час. Ім ёсць з каго браць прыклад.

**ГАННА ЮРУЦЬ**
*(12 гадоў, в. Рудск*
*Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.)*

## Я — НАШЧАДАК

«Хто я ёсць?» — часта думаю я. Перш-наперш дачка сваіх бацькоў, сястра, вучаніца, прагная да пазнання, да ведаў. У адным я ўпэўнена: я — чалавек, не пазбаўлены памяці, а значыць, і ўдзячнасці людзям, якія жылі да мяне.

Кім былі мае продкі?

З гонарам магу сказаць, што дзед быў калгаснікам, дваццаць гадоў кіраваў калгасам. За сваю добрасумленную працу ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі.

Прадзед жыве ў памяці маіх блізкіх як добрасумленны селянін, які ўсё жыццё працаваў на роднай зямлі, а ў час Вялікай Айчыннай вайны абараняў Радзіму. Удзельнічаў у баях пад Берлінам, дзе і сустрэў вялікую Перамогу.

З расказаў сваёй бабулі ведаю, што прапрадзед славіўся на ўсю ваколіцу сваім сталярным майстэрствам.

А хто далей? Ніхто не змог адказаць на маё пытанне. Як зазірнуць у невядомую, але прывабную глыбіню гісторыі, як даведацца пра сваіх продкаў?

Я хачу ведаць мінулае дзеля будучыні, хачу зразумець, нарэшце, сваё месца на зямлі, зразумець і вярнуць сабе багатую гістарычную спадчыну.

А можа, маімі продкамі былі тыя людзі, якія праславілі Беларусь?

Кожны народ памятае заснавальнікаў княжацкіх і царскіх дынастый. У французаў гэта Меравінгі і Бурбоны, у аўстрыйцаў — Габсбургі, у немцаў — Гагенцолерны, у рускіх — Рурык і Раманавы. У нас жа — Рагвалод і яго дачка Рагнеда, дзеці і ўнукі якой прадоўжылі дынастыю полацкіх князёў. Яны ўславілі старажытную Беларусь, з іх імёнамі беларуская гісторыя выходзіць з небыцця на арбіту сусветнай гісторыі, перастае быць безасабовай і ананімнай.

Рагвалод быў першым, чыё імя не згубілася ў глыбіні стагоддзяў, ён стаў першым полацкім князем. Рагвалод быў мужны і разумны кіраўнік. Пры ім Полацкае княства стала адным з самых

моцных сярод славянскіх княстваў, а Полацк — адным са слаўных гарадоў таго часу.

Вядома, што дачка Рагвалода — Рагнеда — славілася сваёй прыгажосцю. Гэтая ганарлівая жанчына адмовіла князю Уладзіміру стаць яго жонкай. За сваю гардыню ёй давялося плаціць жорсткай няволяй, спаленым Полацкам, смерцю бацькоў, братоў, уласным згвалтаваннем. Рагнеда жыла з пачуццём радзімы, роднага кута. Як жанчына, як маці яна зберагла для Полацкай зямлі яе княжацкі радавод і дала працяг роду вялікіх кіеўскіх князёў.

Паміж мною і тымі далёкімі продкамі майго краю пралягло не адно стагоддзе, але яны паўстаюць перада мною людзьмі з жывой, чулай душой, з нескароным пачуццём чалавечай годнасці.

Тая далёкая пасівелая гісторыя, яе славутыя асобы — мая спадчына, самае каштоўнае і дарагое, што можа быць у чалавека, які ўсведамляе сябе яе нашчадкам.

Я спадзяюся, што буду вартай сваіх продкаў, зраблю ўсё магчымае, каб стаць сапраўдным грамадзянінам сваёй Радзімы, чалавекам з прыстойнай душой, турботным сэрцам, ясным розумам, чыстым сумленнем.

KAMUNIKAT.org

**АКСАНА НАВАГРАДСКАЯ**
*(12 гадоў, г п Радунь*
*Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл.)*

## МАЛАДЫ. ГАРАЧЫ. СМЕЛЫ НАРБУТ

Прысвячаецца паўстанцу 1863–1864 гг.,
нашаму земляку Людвіку Нарбуту

Малады. Гарачы. Смелы Нарбут.
У службе чыннай Баляслаў
Інсургентам стаў умелым,
Ад'ютантам спрытным стаў.

З Нацкай пушчы ў шлях трывожны
Конь імчаў цябе не раз,
Толькі вецер спадарожны
Сябрам быў тваім ў той час.

У выведцы толькі ветру
Мог даверыцца ў бядзе,
Ды пушчанскім цёмным нетрам,
А яшчэ — рачной вадзе.

У той бок ляцелі кулі,
Ды не выбілі з сядла.
Бо малітвамі матуля
Зберагчы цябе змагла.

## ЕЎФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Ужо ў юнацтве Еўфрасіння перапісвала і перакладала з іншых моваў кнігі, пісала сама. Яна заснавала ў Полацку два манастыры, надала пашырэнню пісьмовага слова вялікі размах. Гісторыкі звязваюць з яе імем полацкае летапісанне і збіранне бібліятэкі Сафійскага сабора. Князёўна рупілася, каб вучні манастырскіх школ навучыліся грамаце і выхоўваліся добрымі і загартаванымі людзьмі.

Еўфрасіння нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, стала нашай першай мецэнаткай. Па яе заказу дойлід Іаан пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса. Майстар Лазар Богша

зрабіў для асветніцы свой слынны крыж, які стаў неацэнным творам старажытнабеларускага ўжытковага мастацтва.

## УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ

Жыццё Усяслава Чарадзея натхняе паэтаў. Яго розум, энергія і знаходлівасць, уменне знайсці выхад з самых цяжкіх і складаных абставін здзіўляюць людзей, робяць моцнае ўражанне нават на ворагаў. Поспехі Усяслава, яго спрытнасць і рашучасць людзі лічаць чараўніцтвам. У народзе ходзяць чуткі, быццам князь Усяслаў умее абярнуцца ў рысь ці ваўка і блукае ўначы па дарогах. Кажуць, быццам ён можа ператварыцца ў туман і знікнуць у адным месцы, каб апынуцца непрыкметна ў другім, дзе яго зусім не чакаюць.

Часта даводзіцца Усяславу трапляць у цяжкае і бязвыхаднае становішча. Вось і сёння бязрадасны дзень для Чарадзея. Халодны сакавіцкі дзень 1067 года. Усяляк намагаецца Усяслаў захаваць незалежнасць Полацкай зямлі ад вялікіх князёў кіеўскіх, але сілы няроўныя. Вялікі князь кіеўскі Ізяслаў рушыў з двума братамі на Полацкую зямлю і падступіў да Менска.

Мянчане зачыніліся ў горадзе. Яны ўпарта супраціўляліся спачатку на валу і сценах, потым у вузкіх вуліцах пасада. Але кіеўскія воіны ўзялі Менск. У сувязі з бітвай на берагах Нямігі ўпершыню трапіў Менск на старонкі гісторыі.

**АЛЯКСАНДР ПАЛІЎКА**
*(12 гадоў, г. Іванава Брэсцкай вобл.)*

## «МАРЫСЬКА ЧАРНАБРОВА, ГАЛУБКА МАЯ...»

Недзе поруч ляжалі дарогі,
Кліч кахання ляцеў ад ніў,
Але ён не кахаў нікога,
Бо занадта радзіму любіў.
Варты лепшага ў свеце кахання,
Рана скончыўшы мужны палёт,
Русы хлопец золкім світаннем
На высокі ўзышоў эшафот.

Паводле гэтага верша У. Караткевіча «Нявесце Каліноўскага» можна заключыць, што жыццё выдатнага лідэра беларускага нацыянальна-вызваленчага руху XIX стагоддзя цалкам было прысвечана барацьбе за волю, а месца для кахання ў сэрцы юнака, на жаль, не знайшлося. Але гэта не так. У жыцці Каліноўскага было вялікае сапраўднае каханне. Імя гэтай цудоўнай дзяўчыны, якой належала сэрца палымянага змагара і якую таксама напаткаў трагічны лёс, — Марыя Ямант. Я лічу, што яна заслугоўвае таго, каб расказаць пра яе больш падрабязна.

Нарадзілася Марыя ў шляхецкай сям'і ў 1843 годзе ў Вільні. Атрымала добрае хатняе выхаванне, закончыла прыватны пансіён, валодала некалькімі замежнымі мовамі, мела глыбокія веды ў галіне гісторыі і літаратуры.

Калі адбылося знаёмства Марыі з Кастусём, дакладна невядома, аднак з упэўненасцю можна сказаць, што яны сустрэліся дзякуючы роднаму брату Марыі Юзафу Яманту. Ён быў старэйшы за яе ўсяго на два гады. Разам з Каліноўскім Юзаф належаў да кіраўнічае групы студэнцкага зямляцтва «Агул», якое аб'ядноўвала універсітэцкую моладзь з Літвы, Беларусі, Украіны і Польшчы.

За гады навучання ў Пецярбургу Юзаф моцна пасябраваў з Кастусём. Ён і пазнаёміў яго са сваімі сёстрамі.

Кватэра Ямантаў у Вільні была, па сутнасці, першай рэзідэнцыяй Беларуска-Літоўскага «чырвонага» ўрада, на чале якога стаяў К. Каліноўскі і які з лета 1863 года распачаў працу па адраджэнні беларускай дзяржаўнасці. У цеснай сувязі з гэтым урадам дзеялі сёстры Ямант — Марыя і Алена. Яны заўсёды

старанна выконвалі даручэнні, якія даваліся ім адразу пасля нарадаў, і дастаўлялі ўсю неабходную інфармацыю ў самыя розныя раёны Вільні. Яны былі пасвечаны ва ўсе таямніцы паўстання і, захоўваючы іх у гадзіны самых цяжкіх выпрабаванняў, панеслі з сабой у магілу. Менавіта ў гэтым доме на Вялікай вуліцы Кастусь Каліноўскі перажыў, мабыць, лепшыя хвіліны свайго жыцця, звязаныя з марамі не толькі аб народным, але і аб асабістым шчасці. У гэты час нарадзілася паміж Кастусём і Марыяй вялікае каханне, якое асвятляла ўсё іх астатняе жыццё. Закаханых аб'ядноўвалі ідэалы нацыянальна-вызваленчай барацьбы, мары пра народнае шчасце, дзеля здзяйснення якіх яны гатовыя былі ахвяраваць жыццём.

Вялікім і апошнім выпрабаваннем гэтага незвычайнага кахання Марыі і Кастуся стаў арышт нарачоных на пачатку 1863 года. Уся сям'я Ямантаў адначасова з Каліноўскім была арыштавана. Марыя і Кастусь апынуліся ў розных месцах зняволення, пад якія ўлады прыстасавалі будынкі былога каталіцкага манастыра. Трагізм сітуацыі ўзмацняўся тым, што праз закрачаныя і пакрытыя вапнай вокны кожны з іх мог бачыць месца зняволення другога, але пераадолець гэтую нязначную адлегласць было ўжо немагчыма.

У надзвычай цяжкіх турэмных умовах, калі за кожным крокам Каліноўскага пільна сачылі, Макрыцкай, цётцы Марыі, удалося наладзіць паміж Марыяй і Кастусём патаемную перапіску. Гэтыя лісты вельмі падтрымлівалі Кастуся і Марыю ў той цяжкай сітуацыі.

Нейкім цудам, дзякуючы Ядвізе Макрыцкай, да нас дайшоў адзіны вершаваны ліст Кастуся да Марыі, у якім ён балюча перажывае аб страчаным каханні, шчасці сваёй нарачонай.

Марыська чарнаброва, галубка мая,
Дзе ж ся падзела шчасце і ясна доля твая?
Усё прайшло, — прайшло, як бы не бывала,
Адна страшэнна горыч у грудзях застала.

Не наракай, Марыя, на сваю бяздолю,
Но прыймі цяжкую кару, Прадвечнага волю,
А калі мяне ўспомніш, шчыра памаліся,
То я з таго свету табе адазвуся.

Летам 1864 года ўся сям'я Ямантаў была саслана ў Сібір. Усе дзесяць гадоў ссылкі Марыя зберагала памяць пра Кастуся. І толькі тады, калі на жыццёвым небасхіле акрэслілася самотная старасць,

Марыя дала згоду на шлюб з былым ссыльным, удзельнікам паўстання 1863 года — Войцахам Дмахоўскім.

Памерла Марыя Ямант у Варшаве і пахавана на Павянзхоўскім цвінтары.

Так склаўся нялёгкі лёс гэтай выдатнай жанчыны, якая аддала лепшыя гады свайго жыцця нацыянальна-вызваленчай барацьбе, а сэрца — палымянаму рэвалюцыянеру.

## ЗОСЬКІН ВІР

Было гэта даўным-даўно. Старыя людзі расказваюць, што на Палессі тады шмат хутароў было. Дык вось на адным з іх жыла дзяўчынка. Зоська. Прыгожая яна была вельмі, бы тая каліна ў лесе красавалася. А на суседнім хутары падрастаў Захар, хлопец статны, прыгожы, да любой работы здатны. З самага дзяцінства сябравалі Захар з Зоськай: разам гусей пасвілі, потым, калі падраслі, кароў на луг ганялі. Так і раслі разам, падрасталі, мужнелі, прыгажэлі, набіраліся моцы і мудрасці. І прыйшло да іх каханне, вялікае, сапраўднае. Яны нават і самі не заўважылі, калі гэтыя пачуцці напоўнілі іх сэрцы, але ўжо ведалі, што жыць не могуць адно без аднаго, што гэтыя пачуцці мацнейшыя за іх, мацнейшыя за ўсе сілы на свеце. Яны ўжо не пасвілі разам ні гусей, ні кароў, але заўсёды знаходзілі магчымасць, каб хоць крыху пабыць разам.

Ці то Зоська ў лес па ягады ці па грыбы пойдзе, Захар сустрэне яе па дарозе, кошык падняе да самай хаты. Ці то ў поле жыта жаць пойдзе, і там яе Захар знойдзе, каб хоць хвілінку з любай правесці. Ды і Зоська прыбяжыць часам на луг, дзе Захар, бывае, сена косіць. Так яны і жылі, красаваліся, радаваліся жыццю і свайму каханню. Ужо і пажаніцца вырашылі, і бацькі згоду далі. Нават дзень вяселля прызначылі — пасля Пакроваў, калі ўсё з палёў прыбрана. Але...

Праязджаў аднойчы ля хутара, дзе жыла Зоська, адзін вельмі багаты пан. Удавец ён быў, у гадах ужо. Спыніўся вады напіцца і каня напаіць. І трэба ж было Зосьцы ў той момант з хаты выйсці. Убачыў яе пан і з першага позірку закахаўся. Вялікія грошы паабяцаў Зоськіным бацькам, калі яны дачку за яго аддадуць замуж. Падумалі бацькі ды і згадзіліся. Як ні плакала Зоська, як ні прасіла не аддаваць яе замуж за пана, яны і слухаць не хацелі.

— Дурная ты, —казала ёй маці. — У аксамітах хадзіць будзеш, на золаце есці. Ды і мы з бацькам пажывем у багацці хоць на

старасці. Ты хаця пра нас падумай. А што твой Захар? Што ён табе дасць? Ён такі галадранец, як і мы.

І насталі для Зоські з Захарам чорныя дні. Бегала дзяўчына да свайго любага парады пытаць, што ёй рабіць. А ён і сам не ведаў, як вырätаваць сваю каханую. Не радавала іх ужо ні сонейка, ні птушкі, што спявалі-заліваліся на ўзлеску, дзе заўсёды сустракаліся Зоська з Захарам, дзе раіліся-бедавалі яны. А дзень вяселля Зоські з панам няўмольна набліжаўся.

Вось ужо і Пакроў прайшоў, і наступіў дзень вяселля.

Апранулі Зоську ў прыгожую белую сукенку, што купіў ёй пан, вэлюм надзелі. І стала яна падобная на каліну ў вясновай квецені. Толькі вочы чорныя, бы спелыя вішні, былі поўныя слёз, слёз адчаю і горычы. Вось пан ужо пад'ехаў на карэце ў двор. Замітусілася Зоська па пакоі, забегала, кінулася да акна, выскачыла праз яго і пабегла ў бок лесу, да невялічкага азярца, што блакітным вокам блішчала сярод ужо рыжай пабляклай асенняй травы. Дабегла да берага і кінулася ў чорны вір. Вада расступілася і прыняла яе ў свае халодныя абдымкі. І кругом стала ціха-ціха. Нібы ўсё жывое, што было сведкам гэтай трагедыі, затаіла дыханне, замерла.

Даведаўся аб гэтым Захар, прыйшоў да возера і таксама кінуўся ў халодную ваду, каб хоць пасля смерці быць разам са сваёй любай.

Выцягнулі людзі іх з вады і пахавалі разам, у адной магіле. А праз некаторы час людзі ўбачылі на беразе возера ля самай вады малады дубок і прыгожую каліну, якія раслі, пераплятаючы свае ствалы і галіны. Гэта, напэўна, душы Захара і Зоські перасяліліся ў іх, — гаварылі людзі, усяляк аберагаючы гэтыя дрэвы. А вір, у якім яны загінулі, да гэтага часу завуць Зоськіным.

## ТАДЭВУШУ КАСЦЮШКУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

* * *

Герой Польшчы, Злучаных Штатаў,
Цябе наша зямля нарадзіла.
І першыя словы, і першыя крокі —
Усяму цябе яна навучыла.

Бунтарскі характар ты меў з нараджэння
І месца для службы не меў на Радзіме.

Ў замежжа, у Штаты, цябе, афіцэра,
На цэлых сем год туды лёс закінуў.

І там ты змагаешся за акіянам
І талент вайсковы свой праяўляеш.
Сябруеш і з Джэферсанам, і з Вашынгтонам,
Рэспубліканцам дапамагаеш.

Ды радзіма паклікала сына —
Усю маёмасць другім астаўляеш.
На беразе Буга ты межы дзяржавы
Ад ворага злога абараняеш..

Войска разбіта, цябе паланілі,
Што будзе далей? А хто яго знае?!
Ў Піцеры ў крэпасць цябе затачылі,
Адтуль Павел I цябе вызваляе.

Ізноў на чужыне, ізноў за мяжою.
І там, у Швейцарыі, ты паміраеш.
І там, за мяжой, ганарацца табою.
А хто ты і чый ты? Ты так і не знаеш.

Бо там, на чужыне, цябе памятаюць,
А тут, на Радзіме, ты не ўшанаваны.
Дык хто ж ты? Хіба не Літвін, не зямляк наш,
Што лётаў па свеце, бы ліст адарваны?

## ПАЛАНЕЗ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ

Легендарны палкаводзец Тадэвуш Касцюшка і яго паплечнікі былі людзьмі неардынарнымі, таленавітымі, рознабакова адукаванымі. Іх ядналі не толькі грамадскія ідэі і ўчынкі, але і творчыя захапленні, сярод якіх было адно, звязанае з мастацтвам самым вытанчаным, эмацыянальна ўзнёслым і, здавалася б, апалітычным — музыкай.

33-гадовы палкоўнік Якуб Ясінскі пісаў па-беларуску вершаваныя пракламацыі.

ПЕСНЯ БЕЛАРУСКІХ ЖАЎНЕРАЎ

Помнім добра, што рабілі
Як нас дзёрлі, як нас білі.
Дакуль будзем так маўчаці?
Годзе нам сядзець у хаце!
Пашто землю ў нас забралі?
Пашто ў путы закавалі?
Дочкі, жонкі нам гвалцілі.
Трэ, каб мы ім заплацілі!
Здрада ёсць ужо ў Сенаце,
А мы будзем гніць у хаце?
Возьмем косы ды янчаркі,
Будзем гордыя гнуць каркі!
Коней нам пазаязджалі,
Што хацелі, то і бралі.
Пойдзем жыва да Касцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі.

«Развітанне з Радзімай». Такую назву мае славуты паланез Агінскага. Таго самага Міхала Агінскага, які прыняў самы актыўны ўдзел у паўстанні Касцюшкі.

Мастацтвам гукаў захапляўся і сам Касцюшка. Вядома, што ён, як і большасць шляхецкіх дзяцей, атрымаў добрую музычную адукацыю і выдатна іграў на фартэпіяна. Менавіта ён напісаў у канцы XVIII стагоддзя вельмі папулярны ў свой час паланез для голасу і фартэпіяна. Гэты твор паводле яго тэксту («Падарожжа нам тваё няміла, лепшае сяброўства было дома...») быў задуманы як своеасаблівае музычнае «бывай» родным і блізкім перад развітаннем, калі ён у чарговы раз пакідаў Радзіму.

КАСЦЮШКА ВЯРНУЎСЯ НА РАДЗІМУ

Яго па праву называюць грамадзянінам Сусвету. Тадэвуш Касцюшка — нацыянальны герой Беларусі, Польшчы і Злучаных Штатаў, ганаровы грамадзянін Францыі. За баявыя заслугі ў ліку трох іншаземцаў ён быў узнагароджаны самым высокім баявым ордэнам ЗША — ордэнам Цынцыната. Імя нашага славутага земляка носіць найвышэйшая кропка цэлага кантынента — Аўстраліі, а таксама востраў у Ціхім акіяне ля ўзбярэжжа Аляскі і маленькая планета, якая вандруе ў сусвеце... Але з усіх прыжыццёвых і пасмяротных вандровак Касцюшкі, бадай, самым

доўгім і цяжкім было яго вяртанне на радзіму. Пра вёску Малыя Сяхновічы, што ў нас на Берасцейшчыне, і да гэтага часу мала хто ведае. А менавіта на гэтай зямлі радавое гняздо Касцюшкаў-Сяхновіцкіх. Дакладна вядома, што ён правёў тут дзесяць гадоў у дзяцінстве, сюды вярнуўся пасля падарожжаў па Амерыцы. У Малых Сяхновічах быў сядзібны дом, які не захаваўся, гэтаксама, як і каталіцкая капліца з радавым склепам, дзе знайшлі апошняе прыстанішча шмат хто з Касцюшкаў-Сяхновіцкіх.

Малыя Сяхновічы і Мерачоўшчына здавён «спрачаюцца» за гонар звацца радзімай Касцюшкі, бо дакладных звестак пра месца яго нараджэння да гэтага часу не выяўлена. На сённяшні дзень лічыцца агульнапрынятым, што Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка-Сяхновіцкі, апошняе дзіця ў сям'і Людвіка і Тэклі Касцюшкаў, з'явіўся на свет 4 лютага 1746 года ў фальварку Мерачоўшчына пад Косавам. Але няма сумневу ў тым, што з цягам часу абодва гэтыя мястэчкі на Берасцейшчыне зоймуць дастойнае месца ў нашай гісторыі і стануць цэнтрамі прыцягнення не толькі суайчыннікаў, але і замежных турыстаў.

У 1988 годзе ў Малых Сяхновічах нарэшце быў устаноўлены і помнік Тадэвушу Касцюшку. Гісторыя гэтага помніка цікавая сама па сабе. Памяць пра Касцюшку ўвекавечана ў шмат якіх краінах Еўропы, у Амерыцы і нават у Аўстраліі, дзе яму пастаўлены помнікі. Адзін з найбольш вядомых знаходзіцца ў Вашынгтоне перад Белым домам. Але... «няма прарока ў сваёй Айчыне». На радзіме доўгі час імя кіраўніка вызвольнага паўстання 1794 года было пакрыта забыццём. Да гэтага часу сціплы помнік у Малых Сяхновічах — адзіны на тэрыторыі Беларусі. Яго аўтар — мастачка Альбіна Відацкая — стварыла помнік у 30-я гады мінулага стагоддзя. Спачатку ён быў устаноўлены ў Кобрыне ля помніка расійскай зброі. А потым, з 1939 года, доўгі час знаходзіўся ў запасніках Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея. Пакуль яго лёсам не зацікавіўся малады гісторык з Жабінкі Анатоль Бензярук, даследчык старажытнага роду Касцюшкаў-Сяхновіцкіх. Высветлілася, што з Кобрына бюст Касцюшкі трапіў у Брэсцкую крэпасць. А адтуль ужо ў 1988 годзе ён быў дастаўлены ў Малыя Сяхновічы.

З лютага мінулага года ў Малых Сяхновічах быў адкрыты музей. Праўда, музеем яго пакуль можна назваць з некаторай нацяжкай: пакуль што гэта толькі мемарыяльны пакой, прысвечаны

Касцюшку. Вельмі хочацца верыць, што з цягам часу ў Малых Сяхновічах будзе паўнацэнны музей, экспазіцыі якога ўсебакова раскрыюць такую неардынарную і велічную асобу, якой быў слаўны сын Берасцейскай зямлі Тадэвуш Касцюшка.

KAMUNIKAT.org

**АЛЯКСАНДР МЕГЕЛЬ**
*(12 гадоў, в. Быцень
Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.)*

## ПАМЯЦІ КАЛІНОЎЦАЎ

*Прысвячаецца светлай памяці герояў паўстання Кастуся Каліноўскага, якія 140 гадоў таму аддалі свае жыцці за свабоду і незалежнасць нашай Бацькаўшчыны.*

Беларусь мая, сонца,
Дарагая і родная маці!
На якіх раздарожжах
Згубіла ты шчасце сваё?
Ці ўдасца хоць дзецям
Шчаслівага дня дачакаці
Пасля мужнасці гэткай,
Пасля стольхіх крывавых баёў?

*У. Караткевіч*

Наша Івацэвіцкая зямля памятае падзеі паўстання Кастуся Каліноўскага 1863–1864 гадоў. Паўстанцы прымалі бой пад Косавам, ішлі пераходамі праз вёскі Сярадава, Любішчыцы, Чамялы.

Калі ехаць з Івацэвіч у Косава, то за горадам, справа, знаходзіцца гара. На першы погляд нічым не прыкметная, гара як гара, пясок ды трава, але назва яе незвычайная, бо Шыбельная яна.

Гара шыбеніц. У тым далёкім 1864 годзе на ёй шумелі сосны. Менавіта на іх царскія карнікі павесілі дваццаць герояў-паўстанцаў. Тут жа, пад соснамі, яны былі і пахаваны…

Я часта думаю, аб чым яны гаварылі, аб чым марылі ў сваю апошнюю хвіліну жыцця? Не, не аб сабе яны думалі. Яны думалі пра Бацькаўшчыну, пра яе будучыню, яны былі перакананы, што ўсё гэта не дарма. Яны верылі, што і праз стагоддзі прага беларуса да волі, свабоды будзе жыць. І мне хочацца выгукнуць ім туды, у

вечнасць: «Не, браткі мае беларусы, не забыліся мы на вас! Не забылі мы Яську-гаспадара з-пад Вільні і яго касінераў!»

Вось што нам распавёў наш сябар, стары настаўнік з вёскі Даманава Вікенцій Іванавіч Мароз: «Было гэта ў 1948 годзе. Я жыў у Цімафея Раманавіча Патрубача ў Скуратах.

Аднойчы мы з ім ездзілі ў нядзелю ў Івацэвічы. Калі мы ехалі назад, то Цімафей Раманавіч прытрымаў каня ля Шыбельнай гары і сказаў мне:

— Схадзіце ў гэты лес і паглядзіце: на соснах, у кары, умацаваны іконкі, на тых дрэвах, на якіх вешалі паўстанцаў Кастуся Каліноўскага.

Я пайшоў. Іконкі пазарасталі карой, былі залітыя смалою, але іх яшчэ можна было разгледзець. Колькі было соснаў з іконкамі, я не лічыў, але іх было шмат.

Дрэвы былі старыя, не вельмі тоўстыя і не вельмі высокія, галлё на іх пачыналася нейк нізка над зямлёй. Можа, таму, што людзі не ламалі іх, не секлі, бо дрэвы былі помнікамі — помнікамі з абразамі.

Так нашы землякі выказалі сваю пашану, так увекавечылі змагароў за лепшую долю. Лес на гары мог бы жыць і зараз. Сасна — дрэва даўгавечнае. Шкада, што памяць у нас кароткая. Недзе ў пачатку 90-х сосны па загаду ўладаў высеклі і спалілі з мэтай вынішчыць народную памяць аб паўстанні і жорсткай расправе карнікаў над паўстанцамі.

І ўсё ж народная памяць пра тыя трагічныя падзеі жыве сярод людзей. Будзем спадзявацца, што некалі на Шыбельнай гары будзе ўзведзены помнік у гонар светлай памяці касінераў Каліноўскага. Ён і будзе напамінкам аб барацьбітах мінулага. Мінулага, без якога не бывае будучага!»

Калі Вікенцій Іванавіч скончыў гаворку, мы некаторы час сядзелі моўчкі, але кожны з нас, дзяцей і наш выхавацель Аляксандр Мікалаевіч, ужо добра ўсвядомілі, што трэба рабіць.

Мы распрацавалі праект помніка першай і другой чаргі. Праект першай чаргі мусіць быць выкананы ў гэтым годзе: гэта будуць маладыя сасонкі, пасаджаныя па контуру крыжа, у цэнтры якога будзе ўсталяваны драўляны крыж. Сасонак будзе дваццаць (па колькасці ахвяраў). Праект другой чаргі прадугледжвае замену драўлянага крыжа мармуровым ці сталёвым. Тэрмін выканання

гэтага праекта — 2014 год (да 150-й гадавіны дня памяці герояў Кастуся Каліноўскага).

Праект помніка



Вікенцій Іванавіч падказаў нам, да каго трэба звярнуцца ў райвыканкаме, каб далі дазвол на гэтую акцыю. Лясніцтва нам паабяцала даць саджанцы. Аляксандр Мікалаевіч знайшоў майстра, які зробіць крыж. Да ўсяго гэтага, трэба будзе запрасіць святара, каб адслужыў паніхіду.

Мы цвёрда ўсвядомілі, што мала памятаць герояў сваёй зямлі, трэба яшчэ рабіць і пэўныя захады, каб гэтая памяць жыла. Для гэтага не трэба мець вялікія грошы, трэба проста мець вялікае жаданне.

На самай справе: хто будзе шанаваць нашых герояў, хто будзе шанаваць іх светлую памяць, хто зробіць помнік на Шыбельнай гары?

Хто, калі не мы?

Свой аповед мне хочацца завяршыць словамі Кастуся Каліноўскага:

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе

І часам спамяні пра Яську свайго,
Што згінуў за праўду для дабра твайго.

А калі слова пяройдзе ў дзела,
Тагды за праўду станавіся смела…

Устанем жа за праўду, сябры!

KAMUNIKAT.org

**МАРЫЯ ВОЛКАВА**
*(13 гадоў, п/а Паўлавічы
Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)*

# ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ

«Доўгім быў шлях нашых продкаў да той вяхі, калі летапісцы занеслі ў аналы дзеі Рагвалода і яго дачкі Рагнеды. З якога стагоддзя пачаўся адлік гэтага шляху? Багатая на падзеі, гераічная і слаўная гісторыя была ў нас і да часоў Рагвалодавых. Ды шкада, што вельмі мала дайшло звестак пра жыццё крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў да іх перасялення на землі сучаснай Беларусі, а таксама пра жыццё легендарных неўраў і волатаў. Няшмат ведаем і пра гісторыю нашых далёкіх продкаў пазнейшых часоў» [1, с. 7].

«Іншы раз, калі гартаеш кнігі па гісторыі Беларусі, так хочацца за фактамі і датамі гістарычных падзей убачыць людзей, пра якіх у летапісах, або дакументах, або манаграфіях напісана толькі некалькі радкоў, даведацца пра тое, як яны жылі, чаму радаваліся і аб чым сумавалі, прачытаць хоць адно моўленае імі слоўца, паглядзець на іх партрэты, каб наблізіць да сябе той далёкі час і стаць сведкам усяму, што некалі адбывалася» [1, с. 3].

Працуючы над нарысам пра гістарычнага дзеяча мінулага Беларусі Давыда Гарадзенскага, я ставіла перад сабой галоўную мэту — праз гістарычныя падзеі паказаць жыццё, дзейнасць, асобныя рысы характару, малавядомыя факты з жыцця гэтага мужнага і славутага чалавека.

«Давыд Гарадзенскі (?–1326), ваенны і дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, галоўны ваявода вялікага князя Гедыміна. У нямецкіх хроніках называецца кашталянам або старастам гарадзенскага замка і зяцем Гедыміна, у Пскоўскім летапісе — князем. На думку В. М. Тацішчава, быў сынам пскоўскага князя Даўмонта. Упершыню ўпамінаецца ў хроніцы П. Дузбурга ў 1314 годзе, калі пасяхова ўзначальваў абарону Навагародка супраць крыжакоў Тэўтонскага ордэна» [2, с. 565].

«Вялікі князь літоўскі Віцень прымаў Давыда, сына былога нальшчанскага і пскоўскага князя Даўмонта. У яго дзёрскім поглядзе адчуваў Віцень смеласць і ганарыстасць. Што прывяло Давыда на Літву? Віцень хацеў верыць, што малады князь, выконваючы наказ свайго бацькі, вярнуўся ў яго Айчыну, каб

служыць ёй. Хацеў верыць і сумняваўся. А што калі ён задумаў вярнуць вотчыну? Абжывецца, агледзецца, а пасля пакліча пскавічоў і разам з імі пачне адваёўваць Нальшчаны. Не ўдасца — уцячэ да крыжакоў» [2, с. 163]. Аднак пры ўсёй асцярожнасці Віцень вырашыў не адмаўляць Давыду, а ўзяць яго на службу. Праз Давыда можна нарэшце памірыцца з Псковам, знайсці саюзніка ў барацьбе з крыжакамі, гандляваць з пскавічамі. У паходах не шукаў сабе Давыд бяспечнага месца, мужна пераносіў усе нястачы і цяжкасці, у бітвах не хаваўся за чужыя спіны. Малады князь спадабаўся Віценю, таму і даверыў ён Давыду абарону Гародні. Назначэнне Давыда адбылося якраз напярэдадні вайсковых дзеяў паміж Тэўтонскім ордэнам і Вялікім княствам Літоўскім. «Пётр Дузбург называе Давыда гарадзенскім кашталянам у 1314 годзе. Трэба думаць, назначэнне Давыда кашталянам адбылося раней, а менавіта ў 1306 годзе. Тады крыжакі ў 400 рыцараў на чале з Альбертам фон Хагенам напалі на Гародню. Яны выбралі зручны момант, бо горад быў амаль безабаронны — гарадзенская дружына ўдзельнічала ў паходзе Віценя на Польшчу. Скарыстаўшыся гэтым, крыжакі спалілі прадмесце, а яго жыхароў перабілі. Відаць, пасля гэтага нападу Віцень і назначыў Давыда кашталянам гарадзенскага замка. Гэтая выснова вынікае з паведамлення Дузбурга: «Але кароль Літвы, пачуўшы аб разбурэнні прадмесця гэтага замка, паслаў лепшых мужоў і многіх, выпрабаваных у бітвах, дзеля абароны». Такім лепшым і выпрабаваным у бітвах і быў Давыд. То як яму не даверыць абарону важнейшага на Літве замка.

Непрыступным быў гарадзенскі замак. На крутой трыццацімятровай гары ўзвышаліся па-над Нёманам яго сцены. Аб высокую каменную вежу — данжон («столп камен») не раз разбіваліся штурмавыя хвалі варожых рацей. Але не толькі на непрыступнасць сценаў і вежаў спадзяваўся Давыд. Ён дзейсна ўзяўся за стварэнне баявой дружыны, з якой можна і бараніць замак, і хадзіць у далёкія паходы. І такую дружыну Давыд стварыў» [2, с. 166–167]. Некалькі разоў крыжакі рабілі спробу захапіць замак, але, несучы страты, адступілі ў Прусію.

«Ордэн вырашыў нанесці ўдар у самае сэрца Вялікага Княства, па яго сталіцы Наваградку. Войска рухалася двума шляхамі: конніца па дарозе ўздоўж Нёмана, а астатнія воі плылі на караблях па рацэ. Захапіўшы гарадскія прадмесці, яны спрабавалі штурмаваць замак. Сустрэўшы адчайнае супраціўленне

наваградцаў, крыжакі адступілі. Яны ўзялі замак у аблогу і разбілі каля яго баявы стан.

А з Гародні на дапамогу са сваёй дружынай выступіў Давыд. Дзейнічаў ён не сілаю, а хітрасцю і смеласцю. Гарадзенцы напалі на крыжацкія склады з правіянтам, перабілі варту і забралі ўсе прыпасы. Пасля Давыд нечакана з'явіўся каля стаянкі ордэнскага флоту на Нёмане, захапіў і спаліў караблі. Патаемнымі сцежкамі дружына зайшла крыжакам у тыл, потым імклівай атакай уварвалася ў крыжацкі стан, перабіла 30 чалавек аховы, авалодала даспехамі, абозам, павяла з сабою 1500 коней. Гэты напад Давыда на крыжацкі лагер быў настолькі дзёрзкім і нечаканым, што напужаныя тэўтонцы, чакаючы новага ўдару літвінаў, спынілі штурм і ў баявым парадку адступілі ад Навагрудка. Амаль усё крыжацкае войска загінула ад голаду, знясілення і ад зброі пагрозлівых мсціўцаў з Гародні. Толькі адзінкі праз шэсць тыдняў вярнуліся дадому. Бясслаўная гібель крыжацкага войска аслабіла моц ордэна. З шаленствам, схаваўшыся за непрыступныя сцены Мальбарга, рыцары пазіралі, як літвінскія дружыны спусташалі Прусію. Арганізаваць ім адпор не хапала сілаў. Чатыры гады не асмельваліся тэўтоны нападаць на Вялікае Княства» [2, с. 167–168].

У 1315 годзе загінуў Віцень. На вялікакняжацкі пасад сеў Віценеў брат Гедымін. Ён высока цаніў Давыда Гарадзенскага, даражыў яго дружбай. Гедымін аддаў за Давыда сваю дачку. І недарэмна davяраў ён свайму зяцю: любую адказную вайсковую акцыю Давыд выконваў бліскуча, з той падманлівай лёгкасцю і ўдачлівасцю, за якой хаваюцца штодзённая цяжкая праца з дружынай, вайсковы талент і доблесць, пагарда да небяспекі і смерці. У адной з жорсткіх бітваў Давыд страціў 55 воінаў і палон, але ўсё ж вырваўся з акружэння і ўплаў пераправіўся цераз раку. Небяспечныя і цяжкія былі паходы Давыда.

Слава аб адважным ваяводзе з Гародні дасягнула і Пскова. Згадалі пскавічы сына свайго ўлюбёнца — князя Даўмонта і запрасілі ў 1322 годзе Давыда да сябе на княжанне. Пскавічы адправілі пасла ў Гародню да Давыда, і ён паспяшаўся на іхні кліч. Далучыўшы да гарадзенскай дружыны пскоўскіх вояў з мэтай помсты крыжакам за іх набегі, Давыд пайшоў у Рэвельскую зямлю.

«Попел пакідалі пасля сябе Давыдавы воі. Быў узяты штурмам Рэвель. У многіх вояў з гарадзенскай і пскоўскай дружын загінулі

ад крыжацкіх мячоў сваякі і блізкія, і вoi забыліся аб літасці. А многія, як звычайна, імкнуліся абагаціцца ў паходзе.

З вялікім войскам лівонскія рыцары пагналіся ўслед за Давыдам і 13 красавіка падышлі да Пскова. Трое сутак прабылі яны каля Даўмонтава града. Увесь гэты час Давыд знаходзіўся на крапасных сценах. Напад крыжакоў быў адбіты, і яны без славы пайшлі прэч. А Давыда пад вітальныя крыкі пскавічы праводзілі дадому.

З тужлівым сэрцам пакідаў ён Пскоў. Многа роднага і памятнага засталося ў гэтым горадзе. Калі яшчэ прыедзе сюды? Аднак лёс зноў прывёў Давыда ў горад юнацтва ўжо праз месяц» [2, с. 168–169].

У маі на ладдзях і конях лівонцы ў чарговы раз рушылі да горада. Васемнаццаць дзён працягвалася аблога. Крыжакі абстрэльвалі горад з каменямётаў, разбуралі сцены сценабітнымі машынамі. У баі загінуў пскоўскі правадыр — Сяліла Алексініч. Пскавічы звярнуліся за дапамогай да Ноўгарада, але князь Юрый Данілавіч на дапамогу не прыйшоў. А ў гэты час на дапамогу Пскову дзень і ноч, не шкадуючы ні сябе, ні коней, імчаліся гарадзенцы. Кароткі адпачынак — і зноў у дарогу. Давыд паспеў у самы разгар бітвы і адкінуў тэўтонцаў за раку Вялікую. Усе асадныя машыны і каменямёты дасталіся пераможцам. Крыжакі ўцяклі ў Лівонію.

Сяброўства з Давыдам Гарадзенскім шукае і Рыга. У пасланні рады горада Гедыміну ад 1323 года чытаем: «Пасля даведаліся мы, быццам пан Давыд стаў цяпер князем пскоўскім. А паколькі вы з ім вельмі блізкія сябры, дык мы настойліва просім вашу міласць не адмовіць зрабіць так, каб з вашага ўплывовага пасрэдніцтва ён стаў сябрам нашага горада і заступнікам нашых суайчыннікаў, таму што яны не аднойчы праязджаюць праз яго землі» [2, с. 171].

У верасні Давыд павёў сваіх воінаў на Добжынскую зямлю. Гэта было спусташальнае нашэсце. Усё княства гарэла ў агні пажараў. Знаёмы нам лівонскі храніст Пётр Дузбург з жалем адзначае, «што з-за разгрому гэтага княства язычнікам адкрыўся болей лёгкі шлях у межы хрысціянскія, бліжэйшыя і суседнія».

«Не здолеўшы перамагчы літвінскага ваяводу ў адкрытым баі, ордэн вырашыў расправіцца з ім хітрасцю. У раннюю вясну 1324 года атрад з 600 крыжакоў патаемна прабраўся ў гарадзенскія ваколіцы і напаў на памесці Давыда. Усіх, хто там жыў, напаткала смерць. Пад мячамі крыжакоў, відаць, загінула і жонка Давыда.

Сам ён у гэты час знаходзіўся ў Гародні, а калі з дружынай паспяшаў дадому, крыжакі паспелі ўцячы за мяжу. Толькі попел убачыў Давыд на месцы свайго дома.

Паходы Давыда на Мазовію і Добжынскую зямлю нанеслі па Польшчы сакрушальны ўдар. Польскі кароль Уладзіслаў Лакетак адправіў да Гедыміна пасольства з прапановай заключыць саюз супраць крыжакоў. Вялікі князь прыняў гэтую прапанову і, каб умацаваць саюз, выдаў сваю дачку Альдону (у хрышчэнні — Ганну) за сына Уладзіслава-Казіміра і вярнуў з палону 20 тысяч палякаў. Мірны саюз з Вялікім княствам заключыла і Мазовія. І гэтую дамову Гедымін змацаваў шлюбам сваёй дачкі Марыі з мазавецкім князем Тройдзенем.

Упершыню супраць ордэна выступілі Вялікае княства Літоўскае і Польшча. Давыд Гарадзенскі з 1200 літвінскімі ваярамі і польскім атрадам уварваўся ў Брандэрбургскую мархію. Саюзнае войска дайшло да Франкфурта-на-Одэры, захапіўшы 6 тысяч палонных.

Падчас гэтага паходу адбыўся незвычайны выпадак. Адзін літвін угледзеў прыгожую манашку Бенядыкту і ўзяў яе ў палон. Не жадаючы губляць святасці манаскай цнатлівасці, Бенядыкта выбрала смерць. Яна сказала літвіну, што яго ніколі не параняць і не заб’юць на вайне, калі будзе насіць пры сабе частку яе косткі з чала. Абрадаваны дзікун паверыў, выхапіў меч і адсек манашцы галаву. Давыд, угневаны такой жорсткасцю свайго воіна, выклікаў яго на паядынак і праццяў наскрозь дзідай — пакараў за бяздумнае кровапраліцце. Гэты ўчынак паказвае, што Давыд быў не жорсткім і крывавым ваякам, якім яго малюе Пётр Дузбург, а рыцарам — з ворагам мужны і з безабароннымі высакародны. Ён мог паўтарыць услед за бацькам: «Гонару майго не аддам нікому». Не заваёўшчыкам ён быў, а абаронцам. Абараняў Радзіму. Ён быў увасабленнем гневу і помсты сцякаючай крывёю ад крыжацкіх ран Радзімы.

На зваротным шляху падкуплены крыжакамі мазавецкі рыцар Анджэй Гост, скарыстаўшы даверлівасць Давыда, прыйшоў да яго ў шацёр і па-здрадніцку забіў ваяводу. Па даўняй славянскай традыцыі літвінскія ваяры на шчытах прынеслі цела свайго правадыра ў Гародню. Пахавалі Давыда на беразе Нёмана, каля Каложскай царквы. І назаўсёды застаўся Давыд на зямлі сваіх продкаў» [2, с. 172].

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Чаропка В. Імя ў летапісе. Мн., 2003. 2-е выд., дап.
2. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. 1997. Т. 5.

KAMUNIKAT.org

**АЛІНА ШМІДАВА**
*(13 гадоў, в. Паўлавічы
Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)*

# ПАЎСТАННЕ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ

Радзіма!.. Што можа быць даражэй і бліжэй чалавеку! Але калі запытацца ў кожнага з нас, мы не адразу знойдзем адпаведныя словы і азначэнні, хаця розумам і сэрцам уяўляем сабе, што такое Радзіма. К. Чорны пісаў: «Дзе прайшло дзяцінства, там і пачынаецца Радзіма». Гэта родныя мясціны, якія заўсёды ў памяці: дом, наша вёска, дарогі з бярозамі і ліпамі, палі і лясы, рэкі і азёры...

У сучасны момант узрасла неабходнасць кожнаму чалавеку ведаць свой край, яго гісторыю, культуру, прыроду. Я лічу, што адраджэнне беларусаў як нацыі павінна распачацца з набыцця ведаў пра родны кут, месца, дзе мы жывём, дзе спрадвеку жылі нашы продкі, гэта і памяць аб былых часінах краіны.

У гэтым годзе спаўняецца 210 год з часу паўстання Тадэвуша Касцюшкі. Гэту тэму мы будзем вывучаць на ўроках гісторыі Беларусі і таму, працуючы над гэтым матэрыялам, я ставіла перад сабой мэту — даведацца больш поўна аб гэтай гістарычнай асобе і падзеях мінуўшчыны, аб барацьбе беларусаў за волю і незалежнасць Бацькаўшчыны, беларусаў, якія зведалі страты і прыніжэнні, якіх кідалі ў вязніцы, многія з якіх жылі выгнаннікамі ўдалечыні ад Айчыны. Яны былі сынамі свайго часу. Памяць пра іх — гэта памяць і пра нас, нашчадкаў мінулай славы і дзеяў: забудземся на іх — не ўспомняць і нас тыя, хто ідуць следам.

Пачнем збіраць зярно к зярняці,
Былое ў думках ўваскрашаць,
Каб быт на новы лад пачаці
І сеўбу новую пачаць.

*Янка Купала*

Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка (1746—1817) належаў да старажытнага шляхецкага беларускага роду Касцюшкаў, які вядомы з 1458 года. Але да канца XVIII стагоддзя род збяднеў і валодаў невялікім маёнткам Сяхновічы Кобрынскага павета (цяпер Жабінкаўскі раён Брэсцкай вобласці). Нарадзіўся будучы

нацыянальны герой Польшчы і Злучаных Штатаў Амерыкі на хутары Мерачоўшчына паблізу Косава (сённяшні Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці). Здольны юнак, атрымаўшы першапачатковую адукацыю ў школе манаскага ордэна піяраў у мястэчку Любешава Пінскага павета, працягваў яе ў Варшаўскім кадэцкім корпусе. Пасля яго заканчэння на працягу трох гадоў вучыўся ў Парыжы. Прыхільнік рэвалюцыйных дэмакратычных ідэй не знаходзіў сабе службы ў Рэчы Паспалітай. У 1776 годзе малады афіцэр ад’язджае ў Амерыку, каб ваяваць на баку рэспубліканцаў супраць англійскага каланіяльнага ўладарніцтва. Сем гадоў Касцюшка — за акіянам. Дзякуючы яго вайсковаму таленту, амерыканскія злучэнні атрымалі шэраг перамог, у тым ліку пад Саратогай (1777). Ён даслужваецца да звання генерала, збліжаецца з Джорджам Вашынгтонам, сябруе з Томасам Джэферсанам. Амерыканцы ўшаноўваюць заслугі Касцюшкі пажыццёвай пенсіяй і зямельным надзелам. Але патрыёта клікала Радзіма.

Але дома генерала ніхто не чакаў. На працягу 5 гадоў Касцюшка жыў у Сяхновічах. Толькі на пачатку 90-х ён атрымаў пасаду камандзіра брыгады. Касцюшка падтрымліваў Канстытуцыю 3 мая. Абараняў на берагах Буга межы сваёй дзяржавы ў 1792 годзе. Потым падрыхтоўка паўстання, само паўстанне і затачэнне ў Петрапаўлаўскую крэпасць у Пецярбургу. У канцы 1796 года адтуль Касцюшку вызваляе расійскі імператар Павел І. З таго часу бунтарскі генерал жыве за мяжой. Памёр Тадэвуш Касцюшка ў Швейцарыі ў 1817 годзе. У наступны год яго астанкі былі перавезены ў Кракаў і змешчаны ў каралеўскім замку Вавель.

Яму пастаўлены помнікі ў Кракаве, Вашынгтоне, Чыкага, Кліўлендзе, Мілуоках, яго імем названа 1-я дывізія Войска Польскага, горад у штаце Місісіпі, горны пік у Аўстраліі, адна з акруг штата Індыяна, астравы на Алясцы (ЗША). Музей Касцюшкі існуе ў Салюры (Швейцарыя). Імем Касцюшкі названы вуліцы ў Гродне, Брэсце, Косаве. У Гродне і Косаве ўстаноўлены мемарыяльныя знакі. Касцюшка — нацыянальны герой Беларусі, Польшчы, ЗША, ганаровы грамадзянін Францыі. І хоць змагаўся ён за шчасце і незалежнасць народаў усяго свету, лічыў сябе найперш ліцвінам. У лісце 1790 года да генерала Несялоўскага Тадэвуш Касцюшка даводзіў: «Кім жа я з’яўляюся? Хіба я не ліцвін, Ваш зямляк?»

24 сакавіка 1794 года паўстанне пачалося ў Кракаве. Паўстанне мела нацыянальна-вызваленчы характар і было накіравана як супраць Прусіі і царскай Расіі, якія здзейснілі ў 1793 годзе другі падзел Рэчы Паспалітай, так і супраць рэакцыйных мясцовых магнатаў, якія захапілі ўладу. Асноўнымі мэтамі паўстанцаў было ўзнаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 года і далейшае развіццё дзяржавы на аснове Канстытуцыі 3 мая 1791 года. Паўстанне насіла шырокі характар, ахапіла не толькі тэрыторыю Польшчы, але распаўсюдзілася і на Літву і Беларусь. Вялікае Княства Літоўскае далучылася да паўстання ў другой палове красавіка. У ноч з 22 на 23 красавіка быў атакаваны расійскі гарнізон у Вільні. Горад перайшоў у рукі паўстанцаў. У Вялікім Княстве на чале іх стаяў палкоўнік, паэт, рэспубліканец па поглядах трыццацігадовы Якуб Ясінскі. Быў утвораны асобны ад Польшчы вышэйшы орган кіраўніцтва паўстаннем, які атрымаў назву Найвышэйшая Літоўская рада. Ад Вільні полымя паўстання шуганула па ўсяму Вялікаму Княству. Бок Касцюшкі прынялі тут шматлікая шляхта, частка духавенства, сялянства, гараджанаў. Да касцюшкаўцаў іх вялі патрыятычныя пачуцці і мэты, якія акрэслівалі кіраўнікі паўстання. Першыя дакументы рады мелі радыкальны характар. Віленскі «Акт паўстання народа Літоўскага» заклікаў да «вольнасці і роўнасці грамадзянскай». Ён абяцаў сялянам скасаванне прыгону.

І ў атрады паўстанцаў пацягнуліся касінеры — сяляне, узброеныя косамі. У хуткім часе ў руках паўстанцаў былі Гародня, Берасце, Слонім, Ваўкавыск, Наваградак, Ліда, Ашмяны, Кобрын, Браслаў. Але не так проста было супрацьстаяць шматтысячнаму, добра ўзброенаму і абучанаму царскаму войску.

Хаця напачатку, пакуль непрыяцель не апамятаўся ад нечаканасці, у паўстанцаў былі поспехі. 4 красавіка пад Рацлавіцамі, што ў Польшчы, Касцюшка атрымаў перамогу. 18 красавіка паўстанцы авалодалі Варшавай. На працягу красавіка — чэрвеня царскае войска, не маючы каардынацыі і плана дзеянняў, акружанае з усіх бакоў паўстанцамі, адступала.

Актыўнасць касцюшкаўцаў увяла ў стан разгубленасці расійскіх военачальнікаў і кіраўнікоў адміністрацыі. Паўстанцы ўжывалі партызанска-дыверсійныя формы барацьбы. 1 чэрвеня Якуб Ясінскі аддае загад аб стварэнні атрадаў, якія павінны былі распачаць партызанскія дзеянні ў тыле царскага войска. Найбольш буйнымі

рэйдамі у глыб тэрыторыі Беларусі былі паходы Міхала Клеафаса Агінскага праз Браслаўшчыну на Дынабург (Даўгаўпілс) і Стафана Грабоўскага на Міншчыну. Апошні быў няўдалы, бо 4 верасня пад Любанню атрад Грабоўскага быў разбіты, а сам кіраўнік трапіў у палон.

«Развітанне з Радзімай» — такую назву мае славуты паланез Агінскага. Таго самага Міхала Клеафаса Агінскага — аднаго з нашчадкаў старажытнага беларускага роду, які прыняў самы актыўны ўдзел у паўстанні Касцюшкі. М.-К. Агінскі сфарміраваў на ўласныя сродкі батальён конных егераў, якімі асабіста кіраваў у некалькіх бітвах падчас паўстання. Пасля задушэння паўстання быў у эміграцыі. У 1802 годзе вярнуўся на радзіму і жыў у сваім маёнтку Залессе каля Смаргоні. У 1815 года пераехаў у Фларэнцыю. Агінскі напісаў «Марш паўстанцаў 1794 года», шэраг іншых твораў. Назва паланеза сімвалічная і шматзначная. Многія развіталіся з Радзімай, кладучы за яе жыццё, многія выпраўляліся ў далёкую эміграцыю. А тыя, што заставаліся, таксама гублялі былую радзіму. Рэч Паспалітая дажывала апошнія месяцы.

Атрады Касцюшкі не вытрымлівалі ўдараў царскіх войск Ферзена і Суворава. У жніўні капітулюе Вільня. У верасні каля вёскі Крупчыцы пад Кобрынам церпяць паражэнне атрады К. Серакоўскага. У гэтай бітве супраць адборных расійскіх войск Суворава змагаліся больш чым 2 тысячы беларускіх сялян-касінераў. Амаль усе яны палеглі. Невялічкая частка хацела знайсці паратунак за сценамі крупчыцкага манастыра. Але казацкая шабля секла і ў святым месцы. Потым быў разгром пад Берасцем, адыход ад Гародні. Паўстанне пакінула Беларусь.

10 кастрычніка адбылася рашаючая бітва войск Касцюшкі з царскімі злучэннямі пад Мацяёвіцамі. Паўстанцы былі разбіты, а іх кіраўнік быў цяжка паранены і трапіў у палон. Урэшце 4 лістапада Сувораў авалодаў Прагай — прадмесцем Варшавы. Пры яе абароне загінуў Якуб Ясінскі. Жорсткае крывапраліцце пры штурме Прагі прывяло да капітуляцыі 6 лістапада Варшавы. Так царызм задушыў нацыянальна-вызваленчы рух народаў Рэчы Паспалітай. Ці была ў Касцюшкі магчымасць перамагчы? Наўрад ці. Але паўстанне сталася пачаткам шляху народаў Польшчы, Беларусі, Літвы да здабыцця волі.

На справе радыкальна-рэвалюцыйны запал кіраўнікоў паўстання хутка выдыхнуўся. Касцюшка не здолеў падняцца вышэй

абмежаванай праграмы і абаперціся на народ. Абвешчаныя адмена прыгоннага права і надзяленне сялян зямлёй адразу не ажыццяўляліся, што адштурхнула сялянства ад удзелу ў паўстанні.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. 1999. Т. 8. С. 164–165.

2. Голубеў В. Ф., Крук У. П., Лойка П. А. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? Мн., 1994. С. 71–72.

3. Лойка П. А. Гісторыя Беларусі XVI–XVIII стст. Мн., 1998.

4. Чаропка В. Імя ў летапісе. Мн., 2003. 2-е выд., дап. С. 4.

KAMUNIKAT.org

**ІРЫНА КІСЯЛЁВА**
*(13 гадоў, в. Паўлавічы
Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)*

# РАТНУЮ СЛАВУ НАБЫЎ КАНСТАНЦІН АСТРОЖСКІ

Слава Воршы ўжо ня горша.
Слаўся, пан Астроскі!

*(З народнай песні)*

Вывучэнне роднага краю з'яўляецца адным з важных сродкаў сувязі навучання з жыццём. Вельмі важна зараз азірнуцца назад, пазнаць блізкую і далёкую даўніну, багацце свайго краю, каб упэўнена ісці наперад, самаадданa служыць інтарэсам родных месцаў.

На роднай зямлі, якая на першы погляд добра знаёмая, заўжды знойдзецца многа цікавага: будуюцца новыя дамы, узнаўляюцца помнікі рэлігійнага культу і грамадзянскай архітэктуры, адкрываюцца невядомыя раней старонкі гісторыі.

Краязнаўству заўсёды надавалі вялікую ўвагу, калі справа ішла аб адраджэнні нацыі, яе гісторыі і культуры.

Народ, які не ведае сваёй гісторыі і не шануе яе, не памятае сваё мінулае, не мае ўпэўненасці і не здольны да стваральнай працы. Мы павінны ведаць сваю гісторыю, свой родны кут і зямлю, на якой спрадвеку жылі нашы продкі. Гэта нашы карані, якія сілкуюць жыццё людзей.

У гэтым годзе спаўняецца 490 гадоў з часоў бітвы пад Оршай. У падручніку гісторыі аб гэтай падзеі матэрыяла недастаткова, і я паставіла перад сабой мэту: як мага больш даведацца аб гэтай бітве і яе ўдзельніках, паказаць важную ролю гетмана Астрожскага ў перамозе войска Вялікага Княства Літоўскага над рацямі Вялікага княства Маскоўскага.

Біяграфічная даведка:

«Астрожскі Канстанцін Іванавіч (1460?–1530), военачальнік, дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Гетман найвышэйшы ВКЛ (з 1497). З роду Астрожскіх. Кіраваў паходамі на крымскіх татараў, перамог больш як у 60 бітвах. У Аршанскай бітве 1514 перамог маскоўскія войскі».

Ноч выдалася: лепшай чакай — не дачакаешся. Да таго цёмная, хоць вочы выкалі. Цемра насунулася неяк раптоўна, вялікай чорнай пачварай захапіла ў магутныя абдымкі наваколле. Спалохаўшыся, схаваўся ў свінцовых хмарах месяц, і толькі зрэдку, калі налятаў вецер і разганяў іх, кідаў цікаўны позірк на зямлю. Скупыя промні святла пры гэтым выхоплівалі тысячы людзей і коней, якія спешыліся на беразе Дняпра.

Людзі мітусіліся. Адны валаклі да вады цяжкія бярвенні, змацоўвалі ланцугамі і асцярожна, каб не аднесла плынь, спускалі на хвалі. Іншыя — завіхаліся ля пустых, папярэдне заканапачаных бочак. Іх таксама звязвалі, выкарыстоўваючы пры гэтым тыя ж ланцугі ці тоўстыя вяроўкі. Зверху клалі аполкі, прыбівалі як след.

У гэтым людскім мурашніку, які мітусіўся, бегаў, спяшаўся, непакоіўся, здавалася, няма ніякага парадку. Але так здавалася толькі на першы погляд. Каб хто захацеў прыгледзецца ўважлівей, адразу заўважыў бы, што хоць усе і спяшаліся, аднак кожны дзейнічаў абдумана, рабіў справу, даручаную менавіта яму, а не каму-небудзь іншаму. Пры гэтым ніякіх камандаў не чулася, ды і былі б яны ў дадзены момант проста недарэчнымі. Маглі б перашкодзіць, унесці ў зладжанасць непатрэбную нервознасць, хваляванне.

Нарэшце два пантонныя масты былі гатовы. Самы час перапраўляць гарматы. Радасць ад таго, што першая, ці не самая важная, частка справы завершана, не прамінула даць знаць аб сабе.

— Гатова, гатова! — чулася ля берага.

Прамовілі не так і гучна, але гэтае слова пачало перадавацца ад аднаго воіна да другога... Праз якую хвіліну «Гатова!» пачулі і ўверсе, на пагорку, дзе стаялі князі, баяры. І людскі мурашнік вымушаны быў зноў заварушыцца, але на гэты раз ён рассоўваўся ў бакі, вызваляючы пасярэдзіне дарогу. Па ёй да ракі накіраваўся на кані вершнік з булавой у руцэ.

Воіны, убачыўшы яго, хутка згрупаваліся, выстраіліся абапал у роўныя шарэнгі. Пастраенне было да таго нечаканае, што тыя, хто знаходзіўся ззаду, не маглі даўмецца, навошта ноччу прытрымлівацца вайсковага парадку. Але ціхае: «Гетман, гетман!», прамоўленае ў першым радзе, дайшло да іх і прымусіла сцішыцца, чакаючы, калі будзе аддадзены загад.

Безумоўна, усе, хто спешыўся пад вечар 7 верасня 1514 года тут, на беразе Дняпра, непадалёку ад Оршы, ведаў — наперадзе

кожнага чакае бітва з маскоўцамі. Як і ведалі воіны, што бой давядзецца прыняць праз некалькі гадзін. Тым не менш з нецярпеннем і нявыказанай трывогай чакалі якраз апошняга загаду, пасля якога і пачнецца пераправа.

Сам гетман таксама даўно жыў гэтым хваляваннем, але стараўся яго нічым не выдаваць. Ды і паспрабуй у цемры разабрацца, што ў чалавека на душы. Конь, які даўно навучыўся ўлоўліваць рух гаспадара, спыніўся ля самай вады, ледзь не ўздыбіўшыся. Астрожскі азірнуўся па баках, чакаючы, калі да яго пад'едуць ад сваіх харугваў князь Ю. Радзівіл, ваяводы.

На ўсходзе пачала вымалёўвацца светлая палоска. Асаблівай небяспекі, што маскоўцы могуць напасці нечакана, акурат цяпер, калі войскі пачнуць пераадольваць водную перашкоду, не было. Некалькі тысяч сваіх вершнікаў Астрожскі пераправіў праз Дняпро яшчэ днём, так што падтрымка забяспечана. Але і марудзіць ніяк не выпадала.

Гетман аддаваў апошнія распараджэнні. Сцішыліся воіны, маўчалі. Здагадваліся ўжо, што адлік часу пачаўся на хвіліны. І на самай справе ўсе прыйшлі ў рух.Частка пяхоты дапамагала перапраўляць гарматы, іншыя ж воіны кінуліся подбегам услед за вершнікамі, каб далей па цячэнні, крыху воддаль ад вёскі Пашына, паспрабаваць перабрацца ўброд.

Раніцою, недзе каля дзевяці гадзін, пераправа паспяхова закончылася. Гэтаксама хутка войскі занялі месца ў баявым парадку. Астрожскі загадзя абмеркаваў план са сваімі паплечнікамі. У першых шарэнгах знаходзіўся сам, узяўшы камандаванне палком конніцы. За гэтым палком размясцілася пяхота, затым ішоў яшчэ адзін полк кавалерыі, які ўзначаліў ваявода В. Сампалінскі.

Наступная частка конніцы заняла месца па флангах. На правым знаходзіўся полк Ю. Радзівіла, што складаўся з беларускіх і літоўскіх воінаў. Польскімі коннікамі на левым флангу камандаваў Я. Свярчоўскі. Паміж імі размясціліся пехацінцы з ручніцамі.

Як сведчыць аўтар «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», Астрожскі «нашел войско московское за Оршею городом, за Днепром, на рацэ Крапивници». Настрой у гетмана перад боем, думаецца, быў цудоўны. Безумоўна, Астрожскі разумеў, што гэтая бітва яму будзе дорага каштаваць, але, здавалася, усё абяцала

перамогу. Пачатак як быццам неблагі: амаль ніхто пры пераправе не патануў, з коннікаў загінуў толькі адзін чалавек.

А там, дзе ўпэўненасць, там і рашучасць. Войска Астрожскага першым кінулася ў бой. Віхрам панесліся на праціўніка коні. Вершнікам упэўненасці надавалі поклічныя гукі сурмы ды ўдары барабана. Праўда, і маскоўцы разумелі адказнасць моманту.

Да паўдня працягвалася сеча, слабелі сілы воінаў, але Астрожскі не збіраўся ўводзіць у бой асноўныя сілы. Па-ранейшаму разлічваў толькі на конніцу. Не вагаючыся і сам кідаўся туды, дзе найбольш небяспечней. Сек направа і налева, тым самым паказваючы прыклад, як трэба змагацца з ворагам. Усе дзейнічалі рашуча, смела, памятаючы словы, сказаныя гетманам перад пачаткам бітвы: «Сорам утекати, бо маете ли гинуты по лесам и дорогам, то лепше на пляцу лечи з несмертельною славою!»

Нялёгка даводзілася Астрожскаму, яшчэ як нялёгка! Сілы ж маскоўцаў былі ўдвая большыя, чым у аб'яднанага войска Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Кульмінацыйны момант настаў тады, калі маскоўскія ваяводы вырашылі зайсці ў тыл Астрожскаму, паслаўшы туды свежы полк. Разам з тым яны не пакідалі намеру ўдарыць па флангах.

Заставалася адно выйсце: узяць пад асабістае камандаванне ўсю конніцу і магутным «кулаком» паспрабаваць нанесці рашаючы ўдар. Астрожскі так і зрабіў. У чарговы раз гетман рашуча кінуўся ў гушчыню сечы. З дружнымі крыкамі кінуліся за ім воіны. Ляцелі галовы маскоўцаў, дзіка ржалі коні. Уцалелыя маскоўскія коннікі спалохана кідаліся ўбок, калі на іх несліся вершнікі Астрожскага з доўгімі дзідамі ў правай руцэ. Здавалася, пачнецца масавае адступленне.

Але што гэта? У шэрагах маскоўцаў пачуліся дружныя крыкі: «Ура! Ура! Ура! Літва адступае!» — неслася з першых шарэнгаў.

І на самой справе адбылося нешта неверагоднае. Атака Астрожскага нечакана спынілася, коннікі павярнулі назад. З усімі адступаў і... гетман. Маскоўцы, узрадаваўшыся, пачалі праследаваць іх. У пераможным для сябе зыходзе сечы яны ўжо не сумняваліся.

Вось тут і адбылося тое, што і мусіла адбыцца згодна хітрай задуме Астрожскага. Падмануў ён праціўніка! Перад самым лесам яго коннікі раптоўна расступіліся, і маскоўцы аказаліся перад ствaламі гармат, схаваных у кустах.

Ударылі дружныя залпы... Адзін, другі, трэці... Дзесяткі разоў выкідвалі жэралы вялізныя ядры, бязлітасна секла карцеч. Падалі коні, енчылі параненыя. Тыя, хто ўцалеў, кінуліся наўцёкі. Ды дзе там, адысці ад узлеску далёка не ўдалося. Воіны Астрожскага насцігалі маскоўцаў і літасці не ведалі. Паніка перадалася і палкам, што знаходзіліся бліжэй да Дняпра і рэчкі Крапіўны. Яны і не думалі спяшацца на дапамогу таварышам.

Ды і пра якую дапамогу магла ісці гаворка, калі конніца Астрожскага неслася магутным валам, знішчаючы ўсё на шляху. Кінулася ў бой і пяхота. Палі пакрываліся трупамі людзей і коней. Дзіды, мячы насцігалі і тых, хто кінуўся пераправіўляцца праз раку.

Сяму-таму, праўда, удалося знайсці ўратаванне ў лесе. Да ўсяго пачало змяркацца, таму Астрожскі, адчуўшы, што бітва выйграна, аддаў загад спыніць праследаванне.

Запылалі кастры, стомленыя за дзень воіны збіраліся адпачыць. Ля лагера выставілі дазоры, ахову палонных, якіх і без падліку, было відаць, набралася не адна сотня, узмацнілі часавымі. Раніцою, калі сон зняў стомленасць, Астрожскі сабраў ваяводаў. Ведаў, што сярод палонных ёсць і асобы знакамітыя. Падлічылі, аказалася 48 военачальнікаў, сярод якіх былі і ваяводы І. Чаляднін, М. Булгакаў-Коліц, а таксама 1500 дваран.

Жыццё Канстанцін Астрожскі пражыў доўгае і сумленнае. Па адных звестках, памёр у 1530 годзе падчас эпідэміі ў Вільні, па другіх — 8 жніўня 1530 года ў Тураве. Пахавалі Астрожскага ў Кіева-Пячэрскай лаўры. На каменнай пліце напісалі (тэкст прыводзіць Г. Сагановіч у кнізе «Айчыну сваю баронячы»): «Маскву з татарамі паклаўшы, выпісаў 63 над імі перамогі, дадай афарбаваныя крывёю Рось, Дняпро, Альшанку, дадай шмат замкаў, шмат манастыроў, шмат цэркваў, якія вымураваў у княстве Астрожскім і ў стольным месце Вільня... для калек ён пакінуў шпіталі, для дзетак — школы, для людзей рыцарскіх — палашы з дзідамі ў Нарсавай Акадэміі, і міла напішы: Сцыпіёну Рускаму Канстанціну Іванавічу Астрожскаму, Гетману — Вялікае княства Літоўскае. Гэта ўсё. Надмагілле».

А вось прызнанне заслуг Астрожскага прадстаўніком дзяржавы, з якой ён пастаянна змагаўся. М. Карамзін так ацаніў жыццё гетмана: «В самом деле никто не служил Литве и Польше усерднее Острожского, брата Россиян в Церкви, но страшного врага их в поле. Смелый, бодрый, славолюбивый, сей Вождь одушевил полки

Литовские: знатнейшие паны и рядовые воины охотно шли с ним в битву».

Не забыўся пра свайго палкаводца і народ. В. Ластоўскі ў «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» прыводзіць «пахвалу князю Астрожскаму», якая ёсць у «Кароткім кіеўскім летапісцу». Думаецца, да месца прывесці завяршэнне гэтага гімна мужнасці і воінскай доблесці:

«Гетману его хоробромy князю Константину Ивановичу Острозскому дай, Боже, здоровье и шчасте вперед лепшее: как нынье побьедил силу великую московскую абы так побивал сильную рать татарскую, проливаючы кровь ихь бусурманскую».

Аршанская бітва 1514 года — адна з буйнейшых бітваў на тэрыторыі Еўропы ў пачатку XVI стагоддзя. Перамога ў ёй дала магчымасць вярнуць Дуброўну, Мсціслаў і Крычаў. Смаленск узяць не ўдалося, аднак пасля бітвы да 1518 года не адбывалася ўварванняў маскоўскіх войскаў на Беларусь. Пра бітву была складзена беларуская песня, якая праслаўляла князя Астрожскага, на тэму Аршанскай бітвы ў 1520–1530-я гады была напісана батальная карціна (аўтар невядомы, зберагаецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве) — першая ва Усходняй Еўропе [с. 537–538].

У першым жа выданні «Зямлі пад белымі крыламі» У. Караткевіча (1977) можна ўбачыць старажытную гравюру, узятую з «Хронікі Польшчы», якую ў 1597 годзе выдаў М. Бельскі. Яна таксама напамінае аб гэтай падзеі. Нарэшце, летапісная руская мініяцюра аднаго з эпізодаў бітвы пад Оршай увайшла ў манаграфію М. Ткачова «Замкі Беларусі».

«Гісторыя — гэта не толькі даты падзей і ясныя, на падставе сведчанняў сучаснікаў факты (хаця іх, безумоўна, трэба ведаць, каб хтосьці не спекуляваў на гістарычнай неадукаванасці народа), але і духоўны скарб, які стагоддзямі збіраўся народам і жывіць ягоную памяць, абуджае нацыянальную свядомасць. Гэта таксама маральныя ўрокі, што засцерагаюць нас ад паўтарэння памылак. Гэта і запавет любіць і шанаваць сваю Бацькаўшчыну, запавет, перададзены нам бацькамі і дзядамі» [5, с. 3].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. 1999. Т. 1–2. С. 56, 537–538.

2. Голубеў В. Ф., Крук У. П., Лойка П. А. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? Мн., 1994. С. 35–36.

3. Марціновіч А. А. Хто мы, адкуль мы...: У 2 кн. Мн., 1996. Кн. 1. С. 20–36.
4. Сагановіч Г. М. Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі. Мн., 1992.
5. Чаропка В. Імя ў летапісе. Мн., 2003. 2-е выд., дап. С. 3.

KAMUNIKAT.org

**ІВАН ГЛЫБОЎСКІ**
*(13 гадоў, г. Рэчыца Гомельскай вобл.)*

НАШЧАДКІ ЗМАГАРНАЙ СЛАВЫ

Тадэвуш Касцюшка — самы ўслаўлены ў свеце беларус. Праз усё жыццё — да апошняй яе хвіліны ён верыў у лепшы лёс свайго шматпакутнага народа. Яго заслугі перад светам і людзьмі прызнаюць і шануюць палякі, амерыканцы, французы, іншыя народы на зямлі.

Час незалежнасці нашай Беларусі, на жаль, адыходзіць. Трэба, каб была вернута беларусам памяць пра Касцюшку. Вернута, каб застацца для нас прыкладам любові да Радзімы.

Паўстанне ў сакавіку 1794 года — гэта адметная гістарычная падзея. Кіраўніком яго быў Тадэвуш Касцюшка. Паўстанцы паслядоўна перамаглі ў Гародні, Брэсце, Слоніме, Ваўкавыску, Пінску, Наваградку, Кобрыне, Ашмянах, Лідзе, Браславе. На чале паўстанцкіх атрадаў сталі генералы гвардыі Стэфан Грабоўскі, князь Сапега, кампазітар Агінскі.

Польскай шляхце не падабалася рэвалюцыйная рашучасць віленскіх якабінцаў на чале з Ясінскім. Не падзяляў яго поглядаў і сам Касцюшка. Ён абвінаваціў Найвышэйшую Літоўскую раду ў тым, што яна выступае супраць уніі палякаў, літоўцаў і беларусаў. Не спадабаліся Касцюшку і захады Ясінскага па ўзбраенні беларускіх і літоўскіх сялян.

Вынікам гэтых непаразуменняў стала тое, што Касцюшка распусціў Найвышэйшую Літоўскую раду і стварыў замест яе Цэнтральную дэпутацыю Вялікага княства. У яе ўвайшлі больш памяркоўныя дзеячы з абмежаванай шляхецкай праграмай. Яны не захацелі абапірацца на просты люд, выступілі супраць сапраўднага скасавання прыгоннага права.

І самае галоўнае, што ў рэшце рэшт раскалола паўстанцкія сілы і аслабіла яго запал: Цэнтральная дэпутацыя катэгарычна адмаўляла роўнасць Беларусі і Літвы з Польшчай, іх самастойнасць. Гэта адштурхнула ад актыўнага ўдзелу ў паўстанні прагрэсіўную частку беларускай і літоўскай шляхты, што марыла аб адраджэнні Вялікага Княства, і сялянскія масы, што спадзяваліся на зямлю і волю.

Не прымусілі сябе чакаць і паражэнні. Супраць паўстанцаў, што дзейнічалі на Беларусі і Літве, шлі рэгулярныя войскі на чале з таленавітымі генераламі і афіцэрамі, сярод якіх былі Сувораў і інш. Ужо ў жніўні царскія войскі ўзялі Вільню, і трохмесячнае рэспубліканскае праўленне на Беларусі і ў Літве скончылася. Рэшткі паўстанцаў пачалі адступаць у Польшчу. Чым абярнулася падаўленне паўстання для Беларусі? Польскі дзяржаўна-нацыянальны ўціск, якому падвяргаліся сяляне, змяніўся не менш цяжкім. Замест польскай шляхты панаваць над імі стала расійскае дваранства.

Усё ж такі Рэч Паспалітая была дзяржавай не толькі палякаў, але і літоўцаў, украінцаў, беларусаў. Пры ўсіх складанасцях адносін паміж гэтымі народамі яны многія стагоддзі жылі супольна, разам баранілі свае землі ад ваяўнічых суседзяў, сумесна паўставалі супраць самадзяржаўнага прыгнёту.

Так было і падчас паўстання 1794 года. Падзеі 210-гадовай даўнасці адбываліся на нашай зямлі, іх удзельнікамі былі нашы продкі, якія змагаліся найперш за зямлю і волю. Гэта наша паўстанне. Рэха віленскіх званоў і сёння будзіць нашу гістарычную самасвядомасць.

На жаль, дзень нараджэння Тадэвуша дакладна не вядомы. Лічаць, што ён нарадзіўся ў дзень святкавання каталіцкага святога Андрэя — 4 лютага. Род іхны паходзіў ад старажытнай берасцейскай шляхецкай радзіны, вядомай з часоў Вітаўта Вялікага. У гаспадарстве яны займалі даволі сціплыя пасады, аднак шляхецкі свой гонар заўсёды неслі высока. Бацькі паклапаціліся, каб даць сынам добрую адукацыю. Раптоўная смерць бацькі пераклала ўсе клопаты аб сям'і на плечы маці. Мужная жанчына знайшла ў сабе сілы не скарыцца перад цяжкімі абставінамі.

У 1765 годзе Тадэвуш быў залічаны ў Варшаўскі кадэцкі корпус. Поспехі яскрава ілюструе той факт, што праз год ён ужо прымяраў нашыўкі харунжага і выконваў абавязкі падбрыгадзіра корпуса. У 1769 годзе ён працягвае адукацыю на французскай зямлі. У 1774 годзе ў званні артылерыйскага капітана ён вяртаецца дамоў. Працуе хатнім настаўнікам. Улетку 1776 года ён ступае на палубу карабля, што ідзе ў Паўночную Амерыку. Там разгараецца паўстанне амерыканскіх каланістаў за сваю незалежнасць. Восем гадоў ён верна служыў Рэспубліцы. Амерыканскі ўрад даў Тадэвушу званне брыгаднага генерала. Неўзабаве сціхае і гэтая

вайна. Баявы генерал вярнуўся на радзіму ў 1784 годзе. 17 чэрвеня 1793 года апошні сейм Рэчы Паспалітай зацвердзіў другі падзел Рэчы Паспалітай. Набліжалася катастрофа. Дзяржава страчвала сваю незалежнасць. Вясной 1794 года пачалося паўстанне, і яго ўзначаліў Тадэвуш Касцюшка. Ужо праз месяц пад яго началам было паўтары сотні тысяч ваяроў. 4 красавіка генерал даў першы ўдалы бой расійскай арміі. Першыя перамогі ўскалыхнулі край. 22 красавіка ўзнялося Вялікае Княства Літоўскае. Тут хутка шырылася партызанская барацьба. 28 красавіка паўстанне перамагло ў Гародні. Але заклікі Тадэвуша Касцюшкі да сялян не даходзілі, і ён прадчуваў трагічны лёс паўстання.

Апошні бой адбыўся 10 кастрычніка недалёка ад Варшавы. Войска касцюшкаўцаў было амаль цалкам разбіта, а сам ён цяжка паранены.

Два гады ён быў увязнены ў Санкт-Пецярбургу. Толькі раптоўная смерць Кацярыны ІІ адчыніла перад ім вароты вязніцы. Сам новы імператар Павел І наведваў Тадэвуша Касцюшку, прапанаваў яму застацца ў межах Расійскай імперыі, абзавесціся гаспадаркаю. Але Касцюшка вырашыў вярнуцца ў Злучаныя Штаты, жыццё зноў напаўняецца вандраваннямі, Злучаныя Штаты вітаюць яго як героя. Яго прыхільнасці шукалі расійскі імператар Аляксандр І і імператар французаў Напалеон Банапарт. Напярэдадні 1812 года ён адмовіўся ўдзельнічаць у французскай авантуры, а да Аляксандра напісаў ліст, у якім ставіў умовы свайго вяртання да краю: даць волю сялянам, паклапаціцца пра іх выхаванне, палепшыць стан жыхароў імперыі. На гэты зварот імператар прамаўчаў.

Памёр Касцюшка далёка ад родных мясцін 15 кастрычніка 1817 года ў Швейцарыі.

**НАТАЛЛЯ ГАПЕЕВА**
*(13 гадоў, в. Недведзь*
*Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)*

# ГРУНВАЛЬДСКАЯ БІТВА 1410 ГОДА

Вывучаючы гісторыю сваёй краіны, хочацца як мага болей даведацца аб мінулых падзеях і гістарычных асобах Бацькаўшчыны.

Беларусы. Адкуль мы? Хто мы? Чым слаўны ў свеце? На вялікі жаль, ад большасці беларусаў сёння не пачуеш пэўных адказаў на гэтыя пытанні. На працягу стагоддзяў ішла ды яшчэ працягваецца барацьба за душу беларуса. Хацелі і хочуць зрабіць яго то палякам, то рускім, то, на благі канец, «тутэйшым». А калі жадаюць забіць народ, ад яго ў першую чаргу адбіраюць гістарычную памяць.

З намі тое амаль што здарылася. На шчасце, літасцівая гісторыя адарыла беларусаў шанцам адрадзіцца. А калі народ абуджаецца, то становіцца неабходным яму грунт, на які можа ён абаперціся і расправіць плечы. Тым грунтам з'яўляецца тысячагадовы гістарычны шлях беларусаў, які адзначаны і найвышэйшымі ўзлётамі, і найбалючымі падзеннямі [1, с. 3].

Працуючы над гэтым нарысам, аўтар ставіў перад сабою асноўную мэту: асвятліць ход і падзеі Грунвальдскай бітвы, яе ўдзельнікаў і гістарычнае значэнне гэтай бітвы, барацьбу, у якой гартавалася беларуская дзяржаўнасць.

Энцыклапедычная даведка:

«Грунвальдская бітва 1410, вырашальная бітва Вялікай вайны 1409–1411 гг. паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам, з другога. Адбылася 15.07.1410 г. каля населеных пунктаў Грунвальд і Таненберг (цяпер Альштынскае ваяводства, Польшча). З'явілася галоўным этапам вайны, план якой быў распрацаваны польскім каралём Ягайлам і вялікім князем ВКЛ Вітаўтам на Берасцейскай сустрэчы 1409 г.» [2, с. 463].

Аднавіць ход Грунвальдскай бітвы вельмі цяжка, хоць аб ёй захавалася даволі многа звестак. Непасрэдныя ўдзельнікі апісвалі асобныя эпізоды, з якіх немагчыма скласці агульны малюнак. Многія дэталі вельмі цікаўныя і маляўнічыя. «Напрыклад, вядома аб моцнай буры ў ноч перад бітвай. Крыніцы паведамляюць, што

на месяцы быў ясна відны рыцар, пранізаны мячом, а ў хохмайстра Ульрыха фон Юнгінгена з'явіліся слёзы ад прадчування блізкай смерці» [3, с. 37].

Асноўныя падзеі разгарнуліся на няроўнай мясцовасці. Пакатыя пагоркі вышынёй каля 200 м падзяляліся даволі шырокімі далінамі. З трох бакоў месца бітвы было акружана лясамі.

«Няшмат мінула часу — і абодва варожых войскі ўжо стаялі адно супраць аднаго. Польска-літвінскае войска налічвала 90 харугваў: 50 польскіх, 40 — з Вялікага Княства. Ордэнскае войска было падзелена на 51 харугву.

Колькі ж вояў удзельнічала ў бітве? Польскі гісторык І. Кучынскі, аналізуючы мабілізацыйныя магчымасці абодвух бакоў, прыйшоў да высновы, што польска-літвінскае войска налічвала 31,5 тысячы вояў, з якіх 29 тысяч скадалі вершнікі; ордэнскае войска — 32 тысячы, з якіх 21 тысячу складала конніца і 11 тысяч — пяхота» [4, с. 414].

Спрэчкі аб тым, хто камандаваў саюзнай арміяй пад Грунвальдам, цягнуцца доўга. Мы схіляемся да думкі аб сумесным кіраўніцтве вялікага князя і караля. Вітаўт з самых маладых гадоў прывучаўся бацькам да вайны з крыжакамі. У Грунвальдскай бітве ролі былі падзеленыя. Вітаўт знаходзіўся на пярэднім краі, кіраваў войскамі непасрэдна ў баі, самой сваёй прысутнасцю натхняў і падбадзёрваў вояў. Ён арганізаваў выдатны манеўр з уяўным адступленнем. Ягайла ж знаходзіўся ззаду войскаў, мог скласці агульнае ўяўленне аб справе і ўплываць на яе, уводзячы ў бой рэзервы.

Хоць бітва яшчэ не пачалася, Ульрых фон Юнгінген ужо меў пэўныя выйгрышы. Яго армія здолела заступіць ворагу шлях на сталіцу, правільна разлічыць месца сустрэчы і падрыхтаваць пазіцыю. Цяпер патрэбна было зрабіць так, каб саюзнікі пачалі атаку першымі і натрапілі на перашкоды і абстрэл. Аднак, хоць сонца ўжо стаяла высока, з боку саюзнікаў не назіралася ніякага руху.

«І вось загучалі трубы. Пакуль палякі спявалі «Багародзіцу», Вітаўт павёў сваё войска ў бой. Удар наносіла конніца. Шматтысячная хваля вершнікаў неслася на крыжацкія шэрагі. Ад тупату капытоў дрыжэла зямля. У паветры гучаў баявы кліч вояў Вялікага Княства: «Вільня!» Пачаў крапаць дождж. Неба прасяклі вогненныя стрэлы маланак. Крыжакі сустрэлі Вітаўтаву конніцу залпам з бамбардаў. Ядры разрываліся ў гушчы вершнікаў. Многія

з іх паляцелі забітымі на зямлю. Яшчэ раз стрэлілі смяротным агнём гарматы, выбіўшы з сёдлаў нямала вояў. Але наступ конніцы не спыніўся. Імгненне — і вершнікі запрацавалі мячамі і шаблямі па галовах гарматчыкаў. Ордэнцы кінуліся наўцёкі. Цяпер лічаныя метры аддзялялі літвінаў ад рыцараў. Арбалетчыкі і лучнікі асыпалі літвінскую конніцу градам стрэлаў. У той жа момант кранулася закутая ў браню сцяна рыцарскай конніцы. Рыцары рынуліся насустрач непрыяцелю. Схіл пагорка аблягчаў бег іх коней, павялічваў сілу ўдару. Пайшлі ў бой і перадавыя польскія харугвы. Ворагі сышліся ў сечы. І завярцеўся крывавы клубок: цяжка было разлічыць, дзе чужыя, дзе свае, дзе баязлівец, дзе герой. Стаяў неймаверны гул ад баявых клічаў, крыкаў, ржання коней, бразгату зброі. Як саломінкі, ламаліся дзіды, трашчалі пад ударамі сякер і мячоў шчыты. Гудзелі стрэлы і кулі. Падалі забітыя, курчыліся на зямлі параненыя.

Вітаўт, забыўшыся пра небяспеку і стому, без аховы, з некалькімі воямі з’яўляўся то ў адным, то ў іншым месцы сечы, аднаўляў расстроеныя шэрагі свайго войска, заклікаў і вёў у бой. А то скакаў да Ягайлы і патрабаваў болей дзейсна падтрымаць яго. Кароль не рызыкаваў і не ўводзіў галоўныя сілы ў бітву. Але баявы дух абуяў і яго. Некалькі разоў, не вытрымаўшы, ён даваў шпоры каню, жадаючы прарвацца ў гушчу сечы, каб амачыць меч у варожай крыві. Каралеўская варта ледзь стрымлівала Ягайлу, засланіўшы яго конямі і людзьмі. Раззлаваны, ён раз нават канцом сваёй дзіды ўдарыў чэха Залову, які схапіў ягонага каня пад вузду. Пад канец бітвы Ягайла ад крыку сарваў голас.

Гадзіну біліся абодва войскі без усялякага поспеху. Магістр кідаў свежыя харугвы на левы край, дзе змагаліся Вітаўтавы воі. У гэтым месцы крыжакі мелі колькасную перавагу. Крок за крокам цяснілі яны войска Вялікага Княства. Ды і нельга было здзейсніць немагчымае — вытрымаць ціск закутых у браню рыцараў, якія па колькасці пераўзыходзілі літвінаў. І тады Вітаўт адважыўся на смелае рашэнне. Ён даў загад адступаць праваму краю свайго войска. Разлік быў у тым, каб адступленнем адцягнуць на сябе ўвагу значнай часткі крыжакоў, зблытаць іх шэрагі, а ў гэты час палякі павінны нанесці па варожаму войску ўдар галоўнымі сіламі.

Адступленнем літвіны навялі крыжакоў на гарматы, і тыя трапілі пад агонь. Шэрагі крыжакоў парадзелі ад смяротнага граду ядраў. Вітаўт тым часам на чале наваградскай і валынскай харугваў стрымліваў варожы націск.

Моцны ўдар нанеслі крыжакі па цэнтру польска-літвінскага войска, дзе стаялі воі трох смаленскіх палкоў. Змагаліся яны адчайна, стрымліваючы ворага, які ў некалькі разоў пераўзыходзіў іх па колькасці. Адзін полк поўнасцю загінуў, і яго сцягі крыжакі ўтапталі ў зямлю. Але два іншых «змагаліся з найвялікшай храбрасцю, як належыць мужам і рыцарам», і спынілі наступ праціўніка. Вітаўт пасылаў да Ягайлы вестуноў, каб ён пераходзіў да рашучых дзеяў. Кароль марудзіў, чагосьці чакаў [4, с. 418].

«Крыжакі наступалі па ўсім фронце. Адбіваліся з апошніх сіл воі Вялікага княства. Смаленскія воі не адступалі ні на крок. Ужо над полем загучаў урачысты ордэнскі гімн: «Хрыстос уваскрэс! Будзем радавацца, браты, Госпаду, што Ён зламаў паганцам рогі! Хрыстос уваскрэс!» Але радасць крыжакоў была дарэмная. Ягайла загадаў выступаць запасным харугвам. З лесу па крыжаках ударылі найміты: чэхі, маравы, сілезцы, а таксама апалчэнцы. У гэты момант пачулася: «Літва вяртаецца!» Тыя літвінскія харугвы, якія адступілі, цяпер вярнуліся на поле сечы і напалі на крыжакоў збоку. Крыжакі апынуліся ў цісках польска-літвінскага войска. Як толькі перамога стала хіліцца на бок непрыяцеля, сотні прусаў, мабілізаваных у крыжацкае апалчэнне, пакідалі сцягі і зброю і пачалі здавацца ў палон. За імі падымалі рукі і рыцары. Кульмскія рыцары, якія знаходзіліся ў апазіцыі да кіраўніцтва ордэна, пабеглі з сечы. Магістру раілі пакінуць бітву. Ён усклікнуў: «Не дай Бог, каб я ўехаў з поля, на якім загінула столькі храбрых!» Меч помсты знайшоў ганарлівага правадыра. Нехта з літвінаў забіў Ульрыха фон Юнгінгена. Пасля ягонай смерці крыжакі ўжо не думалі пра якую-небудзь абарону — пабеглі з поля сечы. Загінуў і вялікі маршал Фрыдрых Валенрод. З 700 ордэнскіх братоў загінула 203 рыцара. Частка крыжакоў схавалася ва ўмацаваным лагеры Вагенбурзе. Польскія і літвінскія воі ўварваліся туды і расправіліся з ворагам. У руках пераможцаў апынуўся ўвесь крыжацкі абоз. Ордэн паклапаціўся не толькі пра зброю ды харч, але і пра кайданы, ланцугі для палонных, пра віно, каб пасля бітвы адсвяткаваць сваю перамогу. Кайданы і ланцугі згадзіліся — у іх закулі палонных крыжакоў. А вось віно? Убачыўшы яго, пераможцы забыліся на бітву, збегліся да дзежак хто спатоліць смагу, а хто выпіць за перамогу. Чэрпалі пляшкамі, пальчаткамі, а хто нават скідваў боты і піў з іх. Ягайла, баючыся, што войска перап'ецца і не здолее даць адпор непрыяцелю, загадаў разбіць дзежкі. Віно палілося на зямлю, змешваючыся з крывёю.

Разрабаваўшы абоз, воі кінуліся ў пагоню за ворагам. Далёка наперадзе зіхацелі ў вечаровых промнях даспехі ўцякаючых рыцараў. Некалькі міль, пакуль не села сонца, гналі крыжакоў палякі і літвіны, секлі, бралі ў палон. Мноства ордэнскіх вояў патанула ў сажалцы, што ляжала ў дзвюх мілях ад поля сечы. Ганарлівы тухальскі камандор Генрых, які даў абет насіць перад сабою два мячы, пакуль не амочыць іх у польскай крыві, не шкадаваў свайго каня, але быў дагнаны і забіты.

Як указваў у сваёй буле папа рымскі, «загінула каля 18 тысяч крыжакоў». Па іншых разліках — каля 50 тысяч і 40 тысяч трапіла ў палон» [5, с. 421].

Апошнія сонечныя промні падалі на зямлю. Жахлівае відовішча ўяўляла Грунвальдскае поле. Тысячы забітых людзей і коней у самых неверагодных позах валяліся на ім. Чуліся стогны параненых і паміраючых. Чырванелі крывавыя ручаіны. Там-сям паміж забітых хадзілі пераможцы. Хто шукаў сваіх таварышаў, а хто здымаў з забітых даспехі і зброю. Вярталіся з пагоні воі, вялі палонных. Ягайла пазіраў на поле. Здзейснілася! Слава і магутнасць ордэна зніклі вось на гэтым полі, самы небяспечны вораг славян разбіты. Ці не пра гэта марыў яго бацька Альгерд? А яшчэ раней Гедымін і Віцень, Тройдзень і Міндоўг. Яму было наканавана выканаць мару продкаў [4, с. 422].

Грунвальдская перамога мела значныя наступствы. Яна разбурыла падмурак будынка Тэўтонскага ордэна і паклала пачатак яго заняпаду. Пасля пераможнай бітвы землі ўсходніх славян на працягу пяці стагоддзяў не ведалі нямецкай агрэсіі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Голубеў В. Ф., Крук У. П., Лойка П. А. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? Мн., 1994.

2. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. 1999. Т. 5.

3. Краўцэвіч А. Тэўтонскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда. Мн., 1993. С. 37.

4. Чаропка В. Імя ў летапісе. Мн., 2003. С. 414.

**АЛЕНА БОРЫС**
*(13 гадоў, г. Мінск)*

## ГЕРОЙ БІТВЫ НАРОДАЎ
*Балада*

Ты шмат зрабіў для летувісаў і літвінаў,
Ты аднавіў маёй дзяржавы годнасць.
Хоць для яе зараз не лепшыя часіны,
Ды я ўсё роўна ўспамінаю тваю постаць.

Твае імклівыя і велічныя рухі
І позірк уладарны над зямлёю,
Калі ты вёў на ворага харугвы
За ўласную і нас, нашчадкаў, волю.

Я нарадзілася ў дзень вялікай бітвы,
У дзень тваёй Грунвальдскай перамогі.
Магчыма, гэта знак твой старажытны,
Каб бараніць мне Радзіму ад ліхога.

Любіць, як ты, і гэтаксама верыць
І ў вернасці сваёй не пахіснуцца!
О дай мне Божа, дай мне калі-небудзь
Да тваёй мужнасці душою дакрануцца…

…У той дзень было бязвоблачна ад рання —
Для ліпеньскай сярэдзіны не дзіва.
Вакол — спякотнае, трывожнае маўчанне,
Сярод яго ў княжым стане ладзяць дзіды.

Ля княскага шатра стаяць чародкай
Разведчыкі адтуль, з-пад Таненберга.
Іх коні з ночваў п’юць ваду таропка,
Заляпаныя цінай, тванню шэрай.

Спяшаліся. Сігалі па балотах,
Не шкадавалі ні сябе, ні коней
Да гэтае заветнае дубравы,
Да князя, што для іх быў роўны Богу.

Так, роўны Богу! Так, наўрад ці ніжай,
Бо верылі ў яго ў бітвах болей
І верылі яму — крывёю лішняй
Ніколі не купляў князь перамогу.

Бо ён таксама верыў у сваё войска,
Святое пад яго святой Пагоняй,
Непераможнае. Няхай палкоў жамойцкіх
Там не было — Прымор'е пад тэўтонам.

Зямлі хрышчонай крыжам ставяць раны,
Зямлі літвінаў і зямлі княгіні-маці.
Таго іх сын, зямлёй каранаваны,
Нямецкім рыцарам, вядома, не прабачыць.

Вялікі Вітаўт! Славуты і мужны,
Бясстрашны ў бітве і міласцівы ў міры,
Усім карэннем уросшы ў край пакутны
Сваіх дзядоў, апошнія гадзіны

Прад бітвай князь заўсёды быў спакойны,
Але ў вачах, імклівых і рашучых,
Адбіткам добра стоенага болю
На ворага гарэла прага рушыць.

***

Князь выйшаў са свайго шатра, бы птушкай
Узляцеў у сядло і побач пад штандарам
Убачыў хлопца — а штандарыст ён дужы —
І гетману кіўнуў:
— Мы выступаем!

Маўклівa войска князя прапусціла.
Пачціва за аброць вядучы коней,
А ў хлопцавых руках вятроў прасіла,
Трапечучы ля дрэўка, сцяг — Пагоня.

«І будзе бітва!» — дзіды ёй казалі,
«І будзе вецер!» — дрэвы шапацелі.
«Я — абаронца», — Пагоня адказала,
І гэты голас воі зразумелі.

Наперадзе ж далёка млелі немцы
Пад сонцам ліпеньскім, пад панцыраў аховай,
Упэўненасць такая ж у іх сэрцах,
І так жа ў Бога просяць перамогі.

Чакаючы на бітву ад світання
І топчучы зямлі літвінаў кветкі,
Але захопнікам зямля не прабачае,
Яна ўмее помсціць за ўсе здзекі!

У гэта верацЬ вОі і сяляне,
Таемна гэта разумеюць немцы.
І Вітаўт, на каго падзеі ўсклалі,
Прышпорвае каня ў сваёй стаенцы.

Віхурай узлятае на пагорак
Перад дубровай, дзе чакае яго войска,
На шчыльны строй варожы князь сурова
Глядзіць: так, будзе бітва жорсткай!

А вецер ціха шапаціць у травах,
Варушыць пер'е на шаломе князя:
«Вітаўт! Цяжкая твая справа!
За гэту перамогу ты ў адказе!»

Ён разумеў. Ён ведае дакладна,
Што ён не мае права несці паражэнне,
Але нянавісці нервуючую хвалю
Князь задушыў — нянавісць несла спусташэнне.

А ён павінен аднавіць дзяржаву,
Мацнейшую за шмат дзяржаў у свеце,
Каб чорная крыжацкая навала
Не здолела так лёгка яе сцерці.

І зараз кроў павінна быць халоднай,
Каб розуму кірунку пільнавацца.
Ды звон з-пад Полацкай Сафіі б'е у скроні —
Яго крыві, магчыма, у целе не ўтрымацца.

Але ўсё роўна прадстае перад вачыма
Віленскі замак і Наваградак Міндоўга,
І баявы штандар — Пагоня Гедыміна,
Які быў з Вітаўтам у бітве там, пад Коўна.

І зараз хлопае на ветры за спіною
І нескаронасцю сваёй бы нагадае:
«Ты сам — Пагоня! Тваё войска за табою,
Цябе зямля твая багаслаўляе!..»

Ён адчуваў. Ён разумеў, ён ведаў!
І звыклым рухам дастаючы з ножнаў
Свой цяжкі меч, сказаў, каб пушчы-нетры
Пачулі ды скалануўся кожны.

Нямецкі рыцар — ад страху блізкай смерці,
Што гэта слова ім няўлоўна абяцала.

Літвінскі вершнік — бо закранула сэрца,
І у вачах тады заказытала.

— Літва! — меч князя паказаў на немцаў.
— Літва!!! — І на дыбы ўзняліся коні,
Бо ведалі ўсе — смеласць не без сэнсу,
Сціскаючы свае мячы да болю.

Сышліся дзве ашчэраныя хвалі
Пад Грунвальдам у роснай лугавіне.
Свайго героя воі доўга не чакалі —
Князь шпоры даў каню і знік у лавіне.

Праз сечу ўсю ён быў у цэнтры поля,
Звычайным вершнікам абараняў свабоду.
Ён верыў — нам у спадчыну дасць волю.
Нам засталося да яе зусім нямнога…

**КАЦЯРЫНА СЦЯПАНАВА**
*(13 гадоў, г. Віцебск)*

## ЯНКА

Я ніколі не думаў, што паміраць давядзецца тут, каля незнаёмай маленькай рэчкі. Тутэйшыя людзі завуць яе Крапіўна або Крапівенка. Цяпер яны доўга не змогуць браць з яе ваду, бо яна стала чырвонай ад крыві. І ад маёй крыві таксама...

Змагаліся ж мы за любую нашую старонку. І хоць лілася наша кроў без ўпыну і заставаліся кроплі яе на далонях нашай зямлі, мы ведалі, што і кроў, і ўвесь бруд, якім запэцкалі рукі і твар нашай Прыгажуні-Радзімы маскавіты, усё гэта адмыюць нашыя патомкі вадой з Дняпра, Дзвіны і Нарачы.

Тут, пад Оршай, я развучыўся адчуваць і боль, і страх, бо засталася ў мяне толькі адзіная мэта — воля ды шчасце роднага краю! Усе мы разам ішлі супраць ворагаў, нібыта адзін магутны волат. І калі зайгралі трубы маскоўскія, абвяшчаючы пачатак вялікае бітвы, кожны з нас прашаптаў, сцяўшы зубы: «Ну, трымайцеся!» Шэпт гэты быў гучнейшы за трубы, ці мы проста перасталі іх чуць, бо кожны задумаўся пра сваё — пра сваіх дзетак, жонак, бацькоў, і ў душах нашых было адно пачуццё, пра якое ніхто не гаварыў, але і так усё было зразумела...

А потым кожны з нас пакутваў ад болю. Спачатку ад ганьбы, якую мы цярпелі ад Масквы, а пасля — ад болю нашых ранаў і нашых сэрцаў. Божухна! Як жа гэта страшна — бачыць, як маскавіты забіваюць твайго суседа, з якім разам у дзяцінстве бегалі да рэчкі ды пасвілі коней! Як балюча глядзець, калі памірае чалавек — такі самы, як ты, але дапамагчы яму ўжо нічым не можаш! І як ты вінаваты перад ім за тое, што смерць гэтым разам абышла менавіта цябе, а забірае яго! Хоць я й мужык просты, але плакаў, як дзіцё малое, стрымацца не мог, калі...ох, жах! — Арсеньку, сябрука свайго лепшага мёртвым убачыў! Кроў ягоная цякла на зямлю, а позірк быў такі халодны, што стала вусцішна.

Цяпер і я ляжу ў адной зямлі з Арсенькам. Не ведаю, хто яшчэ з нашых загінуў, а хто застаўся жывы. Але колькі слёз праліла па мне мая Улінка, адчувае нават маё мёртвае сэрца! І то, што мы, беларусы, перамаглі, — я ведаю!

Даўно не сочыцца кроў скрозь траву, сціхлі грукат капытоў ды стогны параненых. Толькі раз на год, у верасні, збіраецца тут шмат людзей, і лунаюць тады над Крапівенскім полем бел-чырвона-белыя сцягі. Я не дужа разумею, што азначаюць на іхняй мове словы «бардаўскі фэст», але, стаўшы ўжо адным цэлым з гэтай зямлёй і з гэтым полем, адчуваю: гэта — сваё. Над маёй галавой гучаць раз на год іхныя спевы, і я ведаю, што менавіта гэтыя хлопцы ды дзяўчаты — мой працяг!

Астатнім часам тут спакойна і ціха. Узімку нада мною кладзецца бялюткі-бялюткі снег, вясной ды летам спяваюць птушкі, а ўвосень — схіляюцца цяжкія каласы...

> На месцы Аршанскае бітвы — ралля...
>
> *(З песні Андрэя Мельнікава)*

## ІГНАТ

Калі б я быў пэўны, што загіну не дарма, то гэта было б самае вялікае шчасце. Я часам зайздрошчу маім продкам-пераможцам, бо нават калі здарыцца цуд і я застануся жывы, шчаслівым ужо не буду! Мне зусім не шкада майго жыцця для Радзімы — каб толькі яна зноў сталася вольнай. Але, відаць, маё жыццё таго не каштуе... Цяпер я сяджу ў халодным скляпенні ды чакаю расстрэлу. Вераснёўская ноч не доўгая і не кароткая — якраз хопіць, каб згадаць самае галоўнае ў жыцці. І не пашкадаваць!

А што было ў жыцці галоўным? Навучанне ў кадэцкім корпусе? Служба ў Маскоўскім гвардзейскім палку? Або гэтыя апошнія месяцы 1863 года, калі я ўцёк з расійскага войска, уцёк, як уцякаюць ад ганьбы і сораму! Мяне абвясцілі здраднікам. Але я не здрадзіў, я проста любіў! «Каго любіш?» — «Люблю Беларусь!» Што з таго, што я нарадзіўся на Валыні, а Кастусь Каліноўскі пад Гародняй, калі мы рабілі агульную справу! І маёй другой радзімай стала Аршаншчына, дзе я адчуў сябе іншым чалавекам — сумленным паміж сумленных і роўным паміж роўных. Мой аршанскі атрад! Шкада, што так нядоўга мы трымалі ў страху мясцовых царскіх служакаў. Тады, пад Пагосцішчам, калі нас атакавалі казакі, былі забітыя 6 чалавек, яшчэ 20 трапілі ў палон. Я стаў 21-м. Стары ваяка, які скончыў Акадэмію Генеральнага штабу, я не толькі дазволіў схапіць сябе, але й не вырятаваў іншых!

Але нават не гэта самае жахлівае. Самае балючае і крыўднае — гэта наша параза!

Інсургенты маглі б перамагчы, бо нас яднала непазбежнасць: нашае паўстанне было адзіным шляхам да шчасця і вольнага жыцця беларускага народа. І мы дзейнічалі сумленна. А царскія ўлады падманулі простых людзей, бо сказалі, што мы вернем прыгон ды запануем над імі.

Бедны мой, цёмны народзе! Твае шчасце і воля былі ўжо так блізка! Але ж вы, гаротныя, падманутыя мужыкі лавілі і здавалі інсургентаў расійскім уладам. Вас падманваў хітры і вопытны чалавек — «вешальнік» Мураўёў, які нездарма атрымаў такую мянушку за свае крывавыя «подзвігі»! Ён дзейнічаў подкупам і шантажом: за кожнага злоўленага паўстанца вам давалі грошы. І гэтыя рублі былі палітыя крывёю, чыстай крывёю самых сумленных людзей, адданых вам усім сэрцам! Можа, за пакамечаныя паперкі нехта прадаў і нас? Цяпер я дарую вам гэта, бо, зрэшты, і сам я не здолеў вас выратаваць...

Толькі свядомым «вешальнікам» не дарую ніколі! Сваёй хітрасцю расійскія ўлады задушылі наша паўстанне, пазбавіўшы беларусаў шчасця на многія гады наперад!

Колькі там яшчэ часу засталося да мае апошняе раніцы? Чаму навокал так цёмна і так беспрасветна? Калі ж нарэшце разгарыцца світанне?!

Век дзевятнаццаты, распяты,
Уся Беларусь на тым крыжы!
Збуцвелыя чарнеюць хаты,
Гарацьпаўсюдна мецяжы...

Жыцця агеньчык свеціць цьмяны,
Атрад разбіты войскам ушчэнт.
У соннай Воршы расстраляны
Гнат Будзіловіч, інсургент.

*(З верша краязнаўцы Уладзіміра Бандарэнкі)*

## МІКОЛА

Ох, як жа плакала гэтая скрыпка!

Гаротніца, спачатку яна выпявала, як лясны ручаёк, чый звон азмрочаны ўсяго толькі лёгкай смугою смутку, а потым залівалася горкім плачам, адчайна, без усялякае надзеі... І ўсё навокал

замірала: птушкі замаўкалі, людскія сэрцы спыняліся, і нават кветкі пераставалі расці, пакуль плакала-спявала скрыпка ў маіх руках!

...Гэты сон па маладосці сніўся мне вельмі часта, пакуль душа канчаткова не змірылася з усведамленнем таго, што я ўжо ніколі не стану музыкам. Цяпер скрыпка сніцца ўсё радзей, бо, як мне хочацца думаць, са сталасцю прыйшла іншая жыццёвая мудрасць. Але ж які я яшчэ бываю шчаслівы, калі ўсю ноч навылёт іграю, і скрыпка смяецца або плача, або адно і другое разам, як часцей за ўсё і бывае ў жыцці... Праўда, бывае, што я прачынаюся, так і не паспеўшы даслухаць самы апошні, самы высокі і шчымлівы гук, які нясецца да нябёсаў: так нясцерпна пачынае балець рука, параненая ў 45-м! Тая рука, якая цяпер трымае скрыпку толькі ў сне.

Які яшчэ ўспамін рве сэрца на часткі? Як плакалі-галасілі жанчыны над маёй труною! Галасілі непадробна, шчыра, хоць і была тая труна пустая. Праўда, мала хто з аднавяскоўцаў ведаў тады, што хаваюць яны пустую драўляную скрыню. Толькі самыя блізкія сваякі, кінуўшы позірк на свежы пяшчаны пагорак, не казалі звычайнага: «Няхай зямля яму будзе пухам». Бо ведалі, што я жывы. Але спакою ў іхных душах усё адно не было: яны зналі, што я сышоў у аршанскія лясы да партызанаў. І гэта была калі не верная смерць, то ўсё адно небяспека. І доўгае, пакутлівае чаканне...

Усё, што вы маглі зрабіць тады дзеля мяне, мае дарагія аднавяскоўцы, вы зрабілі: пахавалі мяне маладым, каб я здолеў выжыць!

Хто сказаў, што на вайне пачуцці трацяць вастрыню, а думкі — узнёслацсць? Толькі не я! На мяне ў тыя чорныя дні сышло азарэнне!

Па начах ад выбухаў на чыгунцы гудзела зямля, і для ўсіх нас, партызан-заслонаўцаў, гэта былі выбухі помсты. За нашую скалечаную маладосць, за ранняю сівізну нашых матуль, за пахаванкі, якія прыходзілі ці не ў кожную хату. За безыменныя магілкі на месцы кожнага вялікага бою, за Хатынь ды іншыя вёсачкі, спаленыя ўшчэнт, за палітыя крывёю палі, на якіх потым колькі год запар не радзіла жыта... Попел ад выбухаў чорнай смугою вісеў у паветры, асядаючы нам на рукі і твары. І на белыя старонкі кнігі Гегеля, якая стала тады маім паратункам.

Калі я адкрываў яе ў хвіліны зацішку, думкі мае луналі высока-высока, адкуль было відаць, што гэтая недарэчная разбуральная

вайна неўзабаве мусіць скончыцца, бо свет створаны паводле зусім іншай логікі — паводле стваральнай логікі прыгажосці! А вянцом гэтае прыгажосці нязменна будуць чалавечы розум, ягоная прага да творчасці і адданасць Радзіме.

«Хочацца спадзявацца, што беларуская эстэтыка і ўся нацыянальная філасофія, як найістотнейшая частка духоўнай культуры народа, у якой выяўляюцца яго свядомасць і светаразуменне, звернецца да беларускай ідэі, якая ёсць выразам нацыянальнай самасвядомасці народа, яго годнага самаадчування і суверэннасці яго духоўных каштоўнасцей і ідэалаў».

*М. І. Крукоўскі,*
*удзельнік Вялікай Айчыннай вайны,*
*прафесар, доктар філасофскіх навук,*
*пачынальнік беларускай эстэтычнай*
*школы («З гарчычнага зярнятка...»)*

KAMUNIKAT.org

**ЛЮДМІЛА ДАЎГАЛЁВА**
*(13 гадоў, г. КлічаўМагілёўскай вобл.)*

# УЗГАДКІ МАІХ РОДНЫХ

Аднойчы летам я з бабуляй пайшла ў лес па ягады. Было вельмі спякотна. І мы селі адпачыць пад высокае цяністае дрэва. Было дваццаць другога чэрвеня 2003 года. Раптам я ўбачыла, як сцякла слязінка па бабулінай шчацэ.

«Бабуля, чаго ты плачаш?» — спыталася я. «У гэты дзень, раніцай, 22 чэрвеня 1941 года, над нашай вёскай Такары Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці пачалі падаць першыя бомбы.

Я, шасцігадовая дзяўчынка, пачала плакаць і зваць маці. І адразу ж пачало гаварыць радыё: «Увага, увага! Фашысцкая Германія вераломна напала на нашу Айчыну».

Назаўтра ж нашаму тату прынеслі павестку ў ваенкамат. Мама пачала голасна плакаць і збіраць тату на вайну. Праз некалькі гадзін павозка з мужчынамі знікла з нашых вачэй. Жанчыны плакалі і праклінаталі сваю долю. Мы, дзеці, пачалі таксама голасна плакаць, мабыць, толькі ў гэтую хвіліну я добра зразумела, што такое вайна: гора, забойства, слёзы, катаванні ні ў чым не вінаватых людзей.

Калі ў вёску ўвайшлі немцы, мы, дзеці, ад страху забіліся на печ і носа не паказвалі. Праз некалькі хвілін некалькі немцаў увайшлі ў хату і запатрабавалі: «Матка, яйкі». Маці дала ім некалькі яек, але ім гэтага было мала, і яны пачалі шукаць яшчэ якой-небудзь спажывы. Калі яны пайшлі, зайшлі іншыя, і пачалося тое ж самае. К вечару ў нашай хаце не засталося ні кавалачка хлеба. Але ў падпеччы было трохі бульбы. Маці зварыла, і мы павячэралі. У вёсцы не спыняліся грабяжы, забойствы, крывапраліцце.

Аднойчы ноччу ў акенца ціхенька пастукаліся. Маці, хуценька адзеўшыся, пайшла адчыняць дзверы. Гэта былі партызаны. Яны спыталі маці, ці згодна яна дапамагаць ім. Матуля згадзілася. Яна сцірала. Мы елі марожаную бульбу і жылі ў халоднай зямлянцы. Вельмі часта галадалі. Маці нас карміла з апошняга…

Тут мы пачулі, што едзе нехта на кані. Гэта быў дзядуля. Ён злез з каня і прысеў каля нас. «Стаміўся я, Надзя, — сказаў ён. — Так

спякотна». «Дзядуля, а ці цяжка было ў ваеннае ліхалецце?» — спыталася я.

— Вельмі цяжка, — адказаў ён. — Я нарадзіўся ў 1939 годзе, калі пачалася вайна, мне было 2 гады. Мая маці з першых дзён вайны была сапраўдная патрыётка. Яна хавала і лячыла раненых, пякла хлеб, мыла бінты, бялізну. І ўсё было б добра, каб не наш сусед Павел Аўсянік. Ён служыў у паліцыі і выдаў немцам маю маці. Якраз у гэты час у яе хаваўся ранены. Калі пачалі акружаць хату, маці пачула і павяла байца ў жыта, якое расло праз хату. Спадніца ў яе была вельмі шырокая. Байца з-за яе не было відаць. Калі дайшлі да мяжы, баец ліха папоўз у жыта, а немцы схапілі маю маці. Яе катавалі, цкавалі сабакамі, якія парвалі ёй сухажылле. Але нічога не дазнаўшыся, адпусцілі дахаты. Маці мая дапамагала партызанам да апошніх дзён вайны…

— А які лёс быў у Паўла Аўсяніка? — спыталася я.

— Яго як здрадніка Радзімы пасадзілі ў турму. Адседзеўшы тэрмін, ён прыйшоў і пасяліўся са сваёй жонкай Вольгай у вёсцы Пабеда. Недалёка ад Заполля. Толькі перад самай пенсіяй ён з жонкай і дзецьмі, двума сынамі, перасяліўся ў Заполле, недалёка ад нашай хаты. Калі мая маці ішла ў краму, то праходзіла праз хату Паўла. Ён заўсёды бялеў і ўцякаў у хату, калі яна паказвалася…

— Ну, хопіць ужо, паехалі дахаты, — сказаў дзядуля.

Потым яны яшчэ шмат чаго мне расказвалі, але гэтыя невялічкія ўзгадкі пра ваеннае ліхалецце дарагіх мне людзей запомніліся мне надоўга.

**МАРЫНА СЫЧ**
*(13 гадоў, г. Жабінка Брэсцкай вобл.)*

# СКОПЦЫ

На радзіме маіх продкаў, што на Жабінкаўшчыне, ёсць урочышча пад назваю Скопцы. Па паданню, тут пахаваны паўстанцы Каліноўскага…

Андрэй нарадзіўся ў сям'і пана Стэфана. Хлопчык быў разумны. Першыя веды дала яму маці, потым прыватны настаўнік, а пазней ён паступіў ва універсітэт у Кракаве.

Ён вельмі добра вучыўся. У яго з'явіўся сябар, якога звалі Даніэль. Новы сябар быў вялікі патрыёт сваёй Радзімы, што перадалося і Андрэю.

Калі Андрэй вярнуўся дамоў, яго бацькі ўжо не было. Ён загінуў, ратуючы жанчыну і яе дачку Юльку. З Юлькай Андрэй хутка пасябраваў, а потым яны закахаліся адно ў аднаго.

Але ж Андрэю трэба было вяртацца ў Кракаў, дзе яго ўжо чакаў Даніэль:

— Андрэй, прыйшоў час барацьбы. Мы пачынаем змаганне за свабоду нашай шматпакутнай зямлі!

— Я з вамі! — сказаў не раздумваючы Андрэй, таму што быў да гэтага гатовы.

У першыя месяцы паўстання справы ішлі добра. Паўстанцы займалі гарады і мястэчка. Атрадам кіраваў таленавіты Даніэль. Перамогі, дзякуючы яму, адбываліся часта і нечакана для ворага.

Потым атрад пацярпеў адну паразу, затым яшчэ адну непадалёку ад Камянца і пачаў адыходзіць на захад.

Атрад адыходзіў. Рускія ішлі па следу. Адну ноч ім прыйшлося хавацца ў лесе непадалёку ад Андрэевага маёнтка, і Андрэй запрасіў усіх да сябе, каб адпачнуць трохі і падлячыцца.

З радасцю іх сустрэлі пані Марыя (маці Андрэя) і Юлька.

— Рускія непадалёк, — пачаў Андрэй. — Вось-вось дагоняць. Пакуль нашы хлопцы тут, рускім будзе цяжка нас знайсці, для гэтага прыйдзецца прайсці вялікае балота: калі не ведаеш — не пройдзеш.

Андрэйка яшчэ многа расказваў пра змаганні, многа распытваў, але ж трэба было ісці. Юлька доўга плакала яму ўслед. Потым легла спаць, але спала нядоўга. Раніцай яе разбудзіў бацька і

сказаў, каб яна хутка адзявалася. Бацька быў задуменны, неспакойны. Пасадзіў яе на воз і павёз у лес.

— Што здарылася? — дапытвалася Юлька, але бацька толькі ўздыхнуў. Ён вывез яе на паляну, якая была ў крыві загінуўшых. Юлька ўсё зразумела, але не магла знайсці Андрэйку, і гэта давала ёй надзею. Але яна знайшла Андрэйку. Ён быў прыколаты штыком да дрэва…

…Да самай смерці памятала аб ім Юлька. Ад ранняй вясны да позняй восені прыносіла кветкі на магілкі каханага і яго сяброў. І зараз помнікам над магілкамі тым паўстанцам ціха шумяць магутныя хвоі.

KAMUNIKAT.org

**ЯЎГЕН ГРЫНЕВІЧ**
*(14 гадоў, г. Мінск)*

# ЗА НАШУ І ВАШУ СВАБОДУ!
*Ацалелыя старонкі з дзённіка невядомага паўстанца*

> А будзе ў нас вольнасць, якой не было нашым дзядам і бацькам!..
>
> *(«Мужыцкая праўда». № 7)*

## УСТУП

Гэтым годам, узімку, мне давялося пабываць у спрадвечным беларускім горадзе — Вільні. (Зараз, на жаль, літоўцы лічаць яе сваёй.)

Неяк гуляючы тут, у самым канцы праспекта Гедыміна я ўбачыў памятны знак, усталяваны ўгонар двух мужных кіраўнікоў паўстання 1863 года — Зыгмунта Серакоўскага і Кастуся Каліноўскага. Менавіта ў Вільні, на плошчы Лукішкі, 22 сакавіка 1864 года яны былі пакараныя смерцю праз павешанне.

Я шмат прыходзіў пасля да гэтага месца, разважаў аб тым, што натхняла, надавала сілы гэтым людзям на паўстанне, чаму яны паступалі менавіта так.

Я зразумеў: любоў да роднага краю, жаданне бачыць у ім вольных, працавітых людзей. Яны проста хацелі накіраваць жыццё ў лепшы бок і не бачылі іншага выйсця, акрамя паўстання.

Каліноўскі ўзяў за мэту аднаўленне незалежнасці ўласнабеларускай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, а не федэрацыі Рэчы Паспалітай, усвядоміў нацыянальную ідэю, і ягоныя думкі знайшлі водгук у такіх жа, як ён сам, і людзі ўзняліся на барацьбу за вызваленне роднага краю.

Але царскім уладам нічога не каштавала, дзякуючы ілжывай прапагандзе, схіліць большасць насельніцтва на свой бок. Паўстанне пацярпела паразу, але яно было толькі першай ластаўкай. Ужо ў той час пачала фарміравацца беларуская нацыя.

У сваім сачыненні я хачу паказаць, як, на мой погляд, думалі паўстанцы, якія мелі жаданні, імкненні да вольнай бацькаўшчыны, а думкі нельга перадаць яскравей, чым праз дзённік.

Я веру, што любоў да гераічных, узнёслых асоб Кастуся Каліноўскага і ягоных паплечнікаў не згасне ніколі і памяць пра іх будзе годна ўшанавана, калі Беларусь сапраўды стане незалежнай і беларускай.

## ДЗЁННІК

*Варшава, 18 студзеня 1863 г.*

Зноўку трошкі палепшылася надвор'е.

Упершыню за гэты месяц паказалася сонца, але пад вечар зноў пахаладала.

Увогуле, я ўжо добра сябе адчуваю, але лекар пакуль забараняе выходзіць на двор. Я сяджу, гляджу ў акно…

Пайшоў снег, мякка кладучыся на зямлю, абсыпаючы кожны прадмет, а асабліва два маладыя дубкі ў двары. Прыгожа. Хочацца выбегчы, стаць пад снег, лавіць яго рукамі, кідацца ў такія, прыемныя на погляд, сугробы. Сёння мне снілася, як я маленькі бегаю па полі, поўным жытнёвых каласоў, па мяккай зямлі, вяртаюся назад і зноў бягу, бягу...

*Варшава, 22 студзеня 1863 г.*

Раніцай зноў прыходзіў наш лекар. Дзіўна, але сёння ён ужо дазволіў мне выходзіць. Добры ён чалавек, але вельмі перасцярожлівы. Сёння да нас спецыяльна прыехаў Каліноўскі, удзень жа перад намі і выступіў. Ён сказаў, што паўстанне цалкам падрыхтавана, але ўсё ж такі нам трэба абаперціся ў асноўным на сялянства, на просты люд. Сёння мы павінны былі «выбухнуць» у Варшаве, а ва ўсходніх і цэнтральных губернях паўстанне пайшло б пад арганізацыяй сялян і гараджан. Шмат чаго сёння Кастусь сказаў. Чалавек ён, увогуле, незвычайны, хоць я з ім мала знаёмы.

Цікава, ці ведаюць пра ўсё ўлады? Наўрад ці. Спадзяёмся, што ў нашых шэрагах няма здраднікаў!..

Прайшоўся сёння па такой доўгачаканай падчас хваробы Варшаве. Горад незвычайна ціхі. Прыемна ісці яго вузенькімі вулачкамі, заглядваць у вокны дамоў, быць неспадзяваным сузіральнікам асветленай старымі ліхтарамі ночы. Нешта нечаканае, трывожнае, узрушанае вітала сёння ў паветры.

Нашы пачалі збірацца на пляцы. Недзе апоўначы, калі людзям канца не было відаць, Каліноўскі, узлезшы на драўляныя памосткі,

загаварыў. Потым узяў слова Урублеўскі. Многа слоў было сказана пра выратаванне Бацькаўшчыны.

Сёння ж Каліноўскі загадаў мне ісці з аддзелам Звяждоўскага на Магілёў.

О горад майго дзяцінства! Ці не цябе жадаў я заўсёды бачыць вольным беларускім горадам?!.

Зусім няма часу пісаць. Эх, зіма. Сёння зноў снежыла, ісці было амаль немагчыма. Таму запаволена і рухаемся. Людвік [Звяждоўскі] добры камандзір. Каб не ён, страцілі б мы свой дух. А тут ужо такія з'явіліся. Адзін з іх некуды знік увечары.

*11 лютага. Пад Горы-Горкамі*

Кажуць, што [Літоўскі правінцыйны] камітэт афіцыйна аб'явіў пра паўстанне, выдаў маніфест.

Дайшлі да Горы-Горак — ідуць баі. Мясцовы камандуючы ўжо гатовы здацца. Сёння мяне ранілі ў руку. Дзякуй Богу, што левую. З намі той самы лекар, які лячыў мяне ў Варшаве. Ён сам сёння ледзьве не загінуў, пакуль перавязваў мне рану.

Ужо забілі майго лепшага сябра. Вучыліся з ім разам, разам жа і змагаліся, а тут — адзін стрэл, і яго няма! Божа, даруй яму ўсё, што ён зрабіў не так. Пакарай ягонага забойцу!..

*12 лютага. Горы-Горкі*

Да ночы мы занялі горад. З поўначы прыйшла падмога.

Наша камандаванне размясцілася ў будынку земляробчага інстытута. Да палудня трымалі ваенную нараду.

Горад мне не спадабаўся — ён занадта пагрозлівы, насцярожлівы, непрыгожы.

[…]

*4 сакавіка 1863 г.*

Ідзем на Свіслач. Звяждоўскі кажа, што выгадней зараз напасці на Ружаны, а потым рухацца далей.

Прыйшоў ліст з Вільні — Віскоўскага назначылі начальнікам [Горы-Горак].

*13 сакавіка, мястэчка Свіслач*

Царскія хлусліўцы пусцілі чуткі, што паўстанцы выступаюць за вяртанне прыгону.

Ой, Божачкі! Сёння ж купка такіх сялян пачала выступаць. А тут яшчэ і гэтыя «белыя» на нашу галаву. Нічога ім не трэба — толькі б Рэч Паспалітую аднавіць! Яны здраднікі [неразборліва].

*[Дата не разабрана]*

…Усё адступаем ад Слоніма. Ад нашага войска ўжо мала што засталося. Няўжо мы не правыя, што Бог нам не дапамагае? Што ні кажы, а не хоча ён нас бачыць. Чым мы гэта заслужылі?

Нервовае напружанне дасягнула сёння апошніх межаў. Лёгкая дрымота апанавала мяне. Я раптам зразумеў, што ўсё маё жыццё ішло кудысьці не туды. У ім былі мэты. І шмат. Я імкнуўся быць моцным фізічна, стараўся быць добрым, хоць не заўсёды атрымлівалася, разумным, але гэтага і да старасці нікому не дабіцца. А тут я зразумеў, што не гэта галоўнае: ні моц, ні дабрыня, ні талент. Трэба быць проста падрыхтаваным да ўсіх выпрабаванняў.

Значнасць чалавека вызначаецца яго духоўнымі сіламі. Менавіта такія людзі могуць рабіць іншым дабро. Гэта і патрэбна ў сабе развіваць…

…Зараз мы ў Мілавідах. Царская армія ціснe нас з усіх бакоў. Тут ужо размешчаны атрады Лянкевіча і Уладака. Ноччу нас пабудзіў шум, падняты дазорным: «Хутчэй, бо рускія ідуць!»

Яны — гэтая незлічоная чорная грамада нейкіх гадаў — былі недзе ў вярсце ад нас і наступалі. Усе мітусліва рыхтуюцца да бою. Можа, для нас гэтая бітва стане апошняй, а можа, і не…

Пакарай Божа, пакарай іх!

Хай вып'юць у іх столькі крыві, колькі яны ў нас выпілі!..

## ВЕРШЫ, ЗНОЙДЗЕНЫЯ Ў ЗАПІСАХ ПАЎСТАНЦА

### Люблю Беларусь!

Каго любіш? — Люблю Беларусь! —
То ўзаемна!
Словы ўсіх жаданняў беларуса патаемных.
Бо стамілася Радзіма пад чужынскай пяткай,
Пад чужынскай плёткай нечага чакаці,
Трэба нам Радзіму вызваляці.
Больш нам не стрымацца —
Трэба сабірацца,

Паўставаць усім разам,
Не цярпець абразы!..

*1863*

## Перад паўстаннем

О Беларусь! Ты будзеш вольнай
Хаця б і коштам нашае крыві!
Не быць краінаю бяздольнай
У руках сатрапаў табе, ты лепш жыві.
Больш немагчыма боль той утрымаць,
Бо трэба лепшае жыццё нам здабываць!
І тваё сэрца мы павінны бараніць.
Мы — беларусы, нам такога не забыць!
І галаву мы схілім толькі перад Богам.
Шмат па якім жыцця прайшлі дарогам,
Але для Бацькаўшчыны славы
І не баючыся ніякае патравы,
Клянёмся мы ўсё лепшае аддаць,
Хоць за гэта нас і будуць катаваць!..

*1863*

## Жыла, жыве і будзе жыць!

Жыла, жыве і будзе жыць
Радзіма неўміручая,
Бо вельмі вольная ў яе,
Вельмі кроў кіпучая
І выцвілыя вочы,
Але ўсё так жа радасна
Яны мне ззяюць уночы.

Жыла, жыве і будзе жыць
Радзіма пасівелая.
Вольналюбівая яна,
Хоць вельмі пасталелая.
І яе голас, дзе б ні быў я,
Заўсёды мяне кліча.

Жыла, жыве і будзе жыць
Радзіма ацалелая,

Бо вельмі мужныя сыны
Не церпяць набалелае.
І калі штосьці тут не так,
Гатовыя крывёю яе абараняць!

KAMUNIKAT.org

**АЛЕНА КАЛЕСНІКАВА**
*(14 гадоў, в. Паўлавічы
Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)*

## ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг.
## НА БЕЛАРУСІ І ЛІТВЕ

Актывізацыя ў апошнія гады працэсу абуджэння і зацікаўленасці да сваёй гістарычнай і нацыянальнай спадчыны спрыяе адраджэнне багатых традыцый краязнаўчага вывучэння роднай зямлі. Не трэба лічыць, што гісторыя жыве толькі ў сталічных гарадах. Калі ўважліва азірнешся навокал, адчуеш яе крокі ў маленькай вёсачцы, ціхмянай рачулцы, закінутых старажытных могілках. Яна жыве ў чалавечых лёсах, подзвігах і злачынствах мінулых жыццяў. Веды аб мінулым сваёй зямлі — важкі сродак патрыятычнага, духоўнага і грамадскага выхавання чалавека, бо як казаў у свой час Аркадзь Смоліч: «Зрабіць усё, каб Беларусь перастала быць краем, невядомым для саміх беларусаў» [4, с. 4–5]

У асобе К. Каліноўскага я бачу мужнага рэвалюцыянера, барацьбіта, кіраўніка паўстання 1863 года на Беларусі, таленавітага публіцыста.

У сваёй працы я ставіла перад сабой мэту: паказаць жыццё і дзейнасць К. Каліноўскага, яго подзвіг у імя народа і любоў да Радзімы.

Кастусь Каліноўскі —
Нязмерная мужнасць Радзімы.
Кастусь Каліноўскі —
Адвагі прачыстая мова.

*К. Кірэенка*

Вікенцій Канстанцін (Кастусь) Каліноўскі — першы беларускі рэвалюцыйны дэмакрат, мысліцель, паэт, публіцыст, кіраўнік паўстання 1863–1864 гадоў на Беларусі і Літве. Нарадзіўся 21 студзеня (2 лютага) 1838 года ў в. Мастаўляны Гродзенскага павета (цяпер Рэспубліка Польшча, Беластоцкае ваяводства) у сям'і беззямельнага шляхціца, уладальніка невялікай ткацкай фабрыкі Сямёна Стэфанавіча Каліноўскага. Маці — Вераніка Каліноўская з Рыбінскіх памерла, калі хлопчыку ішоў шосты год. Дзіцячыя і

юнацкія гады будучага рэвалюцыянера прайшлі ў невялікім маёнтку Якушоўка, што каля мястэчка Свіслач Ваўкавыскага павета. У 1847 годзе ён паступіў у Свіслацкую гімназію. Нямала яе выпускнікоў было і сярод кіраўнікоў і ўдзельнікаў паўстання 1863 года. У 1851 годзе Свіслацкая гімназія была пераведзена ў павятовы горад Шаўлі, што на Ковеншчыне, а ў Свіслач замест яе адтуль — пяцікласнае дваранскае вучылішча, якое Каліноўскі скончыў у 1852 годзе. Пасля дадатковай самападрыхтоўкі юнак накіраваўся ў Маскву з мэтай стаць студэнтам універсітэта, дзе ўжо вучыўся яго старэйшы брат Віктар. У 1856 годзе браты пераехалі ў Пецярбург. У кастрычніку гэтага ж года Канстанцін вытрымаў уступныя экзамены і быў залічаны студэнтам камеральнага аддзялення юрыдычнага факультэта сталічнага універсітэта. У гады вучобы ён пазнаёміўся з рэвалюцыйнай публіцыстыкай «Колокола» і «Современника», актыўна ўдзельнічаў у студэнцкім руху, быў членам рэвалюцыйнага гуртка З. Серакоўскага. Канстанцін Каліноўскі скончыў універсітэт у 1861 годзе, атрымаўшы дыплом кандыдата права. Дыплом быў уручаны яму 17 лютага 1861 года, а 19 лютага Аляксандр II падпісаў закон аб адмене прыгоннага права. Грабежніцкі характар рэформы 1861 годзе выклікаў хвалю сялянскіх выступленняў. У такіх умовах К. Каліноўскі вяртаецца на радзіму, дзе ўключаецца ў падрыхтоўку паўстання [2, с. 92]. З мэтай рэвалюцыйнай агітацыі і прапаганды ў 1862 годзе ён разам са сваімі сябрамі па барацьбе, сярод якіх быў і Валерый Урублеўскі (пазней — генерал Парыжскай камуны), выдае нелегальную газету «Мужыцкая праўда».

Гэта была першая беларуская газета. Невялічкага фармату, яна друкавалася як лістоўка-адозва. Выйшла сем нумароў. Артыкулы, якія змяшчаліся ў «Мужыцкай праўдзе», — яскравы ўзор рэвалюцыйнай публіцыстыкі. У даходлівай форме газета выкрывала царызм, паказвала антынародную сутнасць яго палітыкі, грабежніцкі характар рэформы 1861 г. «...Глум, здзерства і несправядлівасць, — пісала газета ў чацвёртым нумары, — выходзіць ад самога цара — ён-то з нас выбірае войска, ён-то з нас выдзірае грошы нібы на патрэбу народу, а ўзяўшыся з усімі гыцлямі за рукі, адно нас... трымае ў няволі».

Газета патрабавала знішчэння самаўладства, памешчыцкага землеўладання, перадачы ўлады ў рукі народа, а зямлі тым, хто яе апрацоўвае. Адзіны спосаб дабіцца гэтага — самім сялянам

узняцца на барацьбу: «...Няма чаго ждаці ад нікога, бо той толька жне, хто пасее. Так сейце ж, дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнаю рукою — не шкадуйце працы, — каб і мужык быў чалавекам вольным...»

І яшчэ: «Возьмемся, дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам!.. Мужык, пакуль здужае трымаці касу і сякеру, бараніць свайго патрапіць і ў нікога ласкі прасіць не будзе!», «Ад паноў няма чаго спадзявацца...»

Заклік да рэвалюцыйнай барацьбы, да актыўнага змагання супраць прыгнятальнікаў народа, за яго сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне складае асноўны пафас усіх выступленняў Яські, гаспадара з-пад Вільні (так падпісваў свае звароты да народа К. Каліноўскі).

Напярэдадні і ў час паўстання ў Польшчы, на Беларусі і Літве існавалі дзве плыні — буржуазна-памешчыцкая і дэмакратычная. Прыхільнікі першай атрымалі назву «белых». Яны складаліся ў Польшчы з буйной і сярэдняй шляхты, гандлёва-фінансавай буржуазіі, на Беларусі і Літве — пераважна з памешчыкаў. Былі супраць узброенага паўстання, дамагаліся ўступак з боку царскага ўрада і аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 года і ў сваёй дзейнасці арыентаваліся на Захад. Прыхільнікі дэмакратычнай плыні ў руху выступалі за ўзброенае паўстанне. Яны атрымалі назву «чырвоных». Склад «чырвоных» быў вельмі неаднародны. Сюды ўваходзілі малазямельная і беззямельная шляхта, афіцэры, студэнты, рамеснікі, дробныя чыноўнікі, ніжэйшае духавенства, разначынная інтэлігенцыя. Па сваіх палітычных поглядах «чырвоныя» падзяляліся на два крылы — правае (памяркоўныя «чырвоныя») і левае (рэвалюцыянеры-дэмакраты). Левыя выступалі за ліквідацыю памешчыцкага землеўладання, за права народаў на самавызначэнне і за саюз народаў у барацьбе з агульным ворагам — царызмам. Правыя выступілі з палавінчатай сацыяльнай і нацыянальнай праграмай. Яны не патрабавалі радыкальнага вырашэння аграрнага пытання і выказваліся за кампенсацыю памешчыкам за зямлю, калі тая пяройдзе да сялян, а таксама хісталіся паміж прызнаннем правоў беларускага, украінскага і літоўскага народаў на самастойнае развіццё.

Падрыхтоўку і кіраўніцтва ўзброеным паўстаннем на Беларусі і Літве ўзначаліў Літоўскі Правінцыяльны камітэт. Ён быў створаны летам 1862 года ў Вільні. Актыўны ўдзел у яго арганізацыі прынялі

Л. М. Звяждоўскі (старшыня камітэта да кастрычніка 1862 г.), К. Каліноўскі (старшыня з кастрычніка 1862 г.), А. Банольдзі, Э. І. Вярыга, Б. Ф. Длускі, А. І. Залескі, З. Чаховіч, І. І. Козел. З пачаткам паўстання ў Польшчы (пачалося ў ноч з 22 на 23 студзеня 1863 г.) Літоўскі правінцыяльны камітэт 1 лютага 1863 года абвясціў сябе «Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі» і звярнуўся да насельніцтва з адозвай падтрымаць паўстанне ў Польшчы. З першых дзён Часовы ўрад, у якім кіруючая роля належала К. Каліноўскаму, узяў курс на аграрную рэвалюцыю. Гэты курс выклікаў адкрытае процідзеянне «белых», якія ў хуткім часе захапілі кіраўніцтва паўстаннем у свае рукі. Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі 27 лютага (11 сакавіка) 1863 года быў распушчаны, а замест яго ўтвораны Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы на чале з буйным ковенскім памешчыкам Якубам Гейштарам [2, с. 95].

Няўдачы паўстанцаў, жорсткія ўрадавыя рэпрэсіі, адсутнасць дапамогі з Захаду, на якую разлічвалі кіраўнікі руху, поўнасцю дэмаралізавалі іх кіраўніцтва, паказалі іх няздольнасць кіраваць паўстаннем. Адбыўся шэраг арыштаў. 12 жніўня 1863 года быў арыштаваны Я. Гейштар. Галоўным кіраўніком паўстання ў другі раз стаў Кастусь Каліноўскі. Былі зроблены захады ажывіць паўстанне, пераўтварыць яго ва ўсенародны рух з апорай на сялянства. Аднак дасягнуць гэтай мэты К. Каліноўскаму і яго паплечнікам не ўдалося [2, с. 96].

Арганізатарам і кіраўніком задушэння паўстання стаў М. М. Мураўёў, віленскі генерал-губернатар. У барацьбе з паўстаннем ён дзейнічаў бязлітасна. Супраць паўстанцаў было накіравана рэгулярнае войска, якое атрымала загад праследаваць паўстанцаў да поўнага іх знішчэння. Не спыняліся карнікі перад падпалам шляхецкіх сядзіб і нават цэлых вёсак. За сваю нечалавечую лютасць М. М. Мураўёў быў празваны ў народзе «вешальнікам».

Паводле афіцыйных дадзеных, на Беларусі і Літве было пакарана смерцю 128 паўстанцаў, выслана на катаргу 853, адпраўлена ў Сібір на пасяленне 504 чалавекі і 825 чалавек выслана з пазбаўленнем усіх правоў, 320 удзельнікаў паўстання былі адпраўлены радавымі ў армію, 767 — у арыштанцкія роты. Апрача таго, у адміністрацыйным парадку было выслана 7836 чалавек. Усяго падверглася высяленню 12 483 чалавекі [2, с. 98–99].

К. Каліноўскі верыў у сілу народа. Усімі сваімі думкамі ён быў звязаны з народам, змагаўся за такі грамадскі лад, дзе б чалавек быў вольным, жыў са сваёй працы.

Глыбокая адданасць народу, радзіме, вера ў народ яскрава выявіліся і ў апошнім перадсмяротным пасланні К. Каліноўскага «Да беларускага народа», вядомым пад назвай «Пісьмо з-пад шыбеніцы». «Пісьмо...» — гэта хвалюючы запавет рэвалюцыянера, нязломнага змагара, што да апошняга дыхання заставаўся верным свайму абавязку. Трапіўшы ў рукі царскіх жандараў, ведаючы, што яму не ўдасца вырвацца з гэтых рук жывым, К. Каліноўскі са здзіўляючай вытрымкай і сілай духу завяшчае народу не спыняць барацьбу, змагацца да канца і здабыць сабе волю:

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе,
І часам спамяні пра Яська свайго,
Што загінуў за справу для дабра твайго.

Жыццё Каліноўскага абарвалася на шыбеніцы, калі яму было ўсяго дваццаць шэсць гадоў. 10 (22) сакавіка 1864 года, стоячы пад шыбеніцай на Лукішскай плошчы ў Вільні, Кастусь Каліноўскі пры зачытанні смяротнага прыгавору, дзе яго назвалі дваранінам, крыкнуў: «У нас няма дваран, усе роўныя».

У 10 гадзін 30 хвілін раніцы кіраўніка паўстання не стала. Пахавалі Кастуся Каліноўскага тайна ўначы на Замкавай гары, дзе знаходзіцца вежа Гедыміна. Дакладнае месца яго пахавання да гэтага часу невядома. Кіраўнік паўстання 1863 года пражыў кароткае жыццё, але, як адзначыў Уладзімір Караткевіч, «ён паспеў стварыць вольную беларускую прэсу, пасеяць насенне народнага гневу, узрасціць яго і зжаць пасеў» [2, с. 99].

Публіцыстычная дзейнасць Каліноўскага мела глыбокі ўплыў на развіццё беларускай дэмакратычнай літаратуры.

Творы Каліноўскага паглыблялі рэалістычную традыцыю беларускай літаратуры, былі ўзорамі бескампраміснага выкрыцця сацыяльных супярэчнасцяў, крытыкі, сацыяльнай несправядлівасці. Па многіх сваіх адзнаках — гэта творы высокай мастацкай вартасці, палымяныя маналогі, эмацыянальна насычаныя звароты да народа, у якіх вобразна-даходліва раскрываюцца складаныя праблемы сацыяльнага і палітычнага жыцця. Экспрэсіўная, вобразная, па-народнаму выразная мова адозваў Каліноўскага.

«Браты мае, мужыкі родныя... Горка пакінуць зямельку радную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, — но не жаль згінуць за тваю праўду».

Гэта — з перадсмяротнага «Лісты з-пад шыбеніцы».

Колькасна невялікая літаратурная спадчына Кастуся Каліноўскага. Але гэта творы, у якіх скандэнсавалася выбуховая сіла народнага гневу, сіла нянавісці і помсты, што на працягу стагоддзяў збіраліся, каб адліцца ў палымяныя радкі.

Пройдзе час. Ідэі, выказаныя Каліноўскім, не раз адгукнуцца ў творчасці Францішка Багушэвіча, Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Яго жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць стане тэмай многіх твораў сучасных пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў.

Кастусь Каліноўскі, Кастусь Каліноўскі...
Палымяны змагар за Радзіму і волю.
Адыходзяць стагоддзі, зімы і вёсны,
Не забуду цябе я ніколі!

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. 1999. Т. 7. С. 470–471.
2. Голубеў В. Ф., Крук У. П., Лойка П. А. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? Мн., 1994.
3. Шалькевіч В. Ф. Кастусь Калиновский: Страницы биографии. Мн., 1998. Кн. 1.
4. Школьнае краязнаўства на Магілёўшчыне. Магілёў, 1997.

**ПАВЕЛ КОРСАК**
*(14 гадоў, в. Ломашы*
*Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.)*

# ПАЎСТАННЕ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ

Чалавек толькі таму з'яўляецца чалавекам, што мае сваю гісторыю, ведае і памятае сваіх продкаў. Без памяці ён не мае права мець будучае. Хворым з'яўляецца народ, які страціў або быў пазбаўлены сваёй гістарычнай памяці. Адным з выдатных барацьбітоў за свабоду з'яўляецца Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка. Яго называлі то літвінам, то палякам.

Паходзіў Тадэвуш Касцюшка са старажытнага беларускага роду. Зорнай красавіцкай ноччу 1817 года ў маленькім гарадку Салюр Швейцарскай рэспублікі Тадэвуш Касцюшка напісаў наступныя словы: «Глыбока адчуваючы, што прыгонны стан супярэчыць закону прыроды і дабрабыту народаў, я сведчу гэтым, што знішчаю яго цалкам і на вечныя часы ў маім маёнтку Сяхновічы Брэст-Літоўскага ваяводства як ад уласнага імя, так і ад імя наступных яго ўладальнікаў… Я заклікаю жыхароў вёскі, каб яны для сваёй уласнай карысці і для Радзімы паклапаціліся аб наладжванні школы і пашырэнні асветы сваіх дзяцей». Гэты тастамент Касцюшка склаў, калі яму было ўжо за семдзесят гадоў.

Тадэвуш Касцюшка быў генералам амерыканскай рэспубліканскай арміі. Начальнік паўстання 1794 года ў Польшчы, Літве і Беларусі. Дзе б ён ні быў, перад вачыма яго паўставалі родныя краявіды Белавежскай пушчы, берагі Шчары, вулачкі Косава, твары сяхновіцкіх сялян. Прыгадваліся дні шчасця і кахання, дні пакут і расчараванняў, няспоўненыя надзеі і мары, нявыпраўленыя памылкі, ад якіх ніколі не пазбаўляецца памяць.

Вучыўся Тадэвуш у школе манахаў-піяраў. Піяры на той час давалі адукацыю на еўрапейскім узроўні. Адукацыя праходзіла на польскай мове. Вучылі лацінскую мову, рыторыку, матэматыку, фізіку, гісторыю. Шмат увагі ўдзялялася фізічнаму выхаванню, культуры паводзін. Пазней ён вучыўся ў Варшаўскім кадэцкім корпусе. Там яму далі мянушку Швед з-пад Брэста. Пабываў Касцюшка ў Парыжы, дзе ён працягваў ваенную навуку, але таксама наведваў акадэмію жывапісу і мастацтва.

Вярнуўшыся на Радзіму, Тадэвуш не знайшоў свайго шчасця ні ў каханні, ні ў багацці. Лёс яго зноў закінуў у Францыю, але бедных там хапала і без яго. Французскія сябры параілі яму паездку за акіян — найлепшы для яго сродак перамагчы тугу расстання з каханай і засцерагчыся ад галечы. На той час Амерыканскія Штаты ваявалі з Англіяй за незалежнасць. Там патрабаваліся дасведчаныя афіцэры. У 1776 годзе Тадэвуш сышоў на амерыканскую зямлю.

Тут Касцюшка ўбачыў тое, што не магло прысніцца на Радзіме і што няхутка яшчэ з'явілася ў Еўропе, — вольных людзей, якія вырашылі дамагчыся роўнасці грамадзянскіх правоў і ўпершыню ў гісторыі стварыць дзяржаву без саслоўяў, незалежную, самастойную. Сем гадоў Тадэвуш Касцюшка рызыкаваў сваім жыццём, удзельнічаў ва ўсіх галоўных бітвах. Рэспубліка за яго заслугі дала яму чын генерала. Ён стаў ганаровым грамадзянінам Амерыканскіх Штатаў. Але ад'язджаў адтуль такім жа бедным, як і прыехаў. З рэспублікі, дзе перамагла дэмакратыя, Касцюшка трапіў у шляхецкую рэспубліку, з будучага ў даўніну. У даўніну, дзе сялянства лічылася быдлам. Касцюшка глыбока адчуваў ганебнасць ладу такога жыцця. У 1791 годзе ў Варшаве была зацверджана Канстытуцыя. Гэты збор законаў абвяшчаў спадчыннасць праўлення, свабоду веравызнання,ураўноўваў перад законам усе саслоўі. Але гэта было не выгадна тром дзяржавам: Расіі, Прусіі, Аўстрыі. Рэч Паспалітая прайграла вайну і ў выніку была падзелена паміж гэтымі трыма дзяржавамі.

Супраць «найвялікшага злачынства» ў красавіку 1794 года выбухнула паўстанне ў Польшчы, на Беларусі і Літве. Начальнікам паўстання абралі Тадэвуша Касцюшку. Апоўначы 22 красавіка загучалі касцельныя і царкоўныя званы ў Вільні. Гэта быў сігнал «да зброі» падрыхтаваным атрадам і насельніцтву.

7 мая 1794 года Тадэвушам Касцюшкам быў выдадзены маніфест — Паланескі універсал, які надзяляў сялян асабістай воляй пры ўмове, што яны разлічацца з панамі і дзяржавай, прызнаваў за імі права на зямлю, якую яны апрацоўвалі, абмяжоўваў паншчыну. Гэта схіліла сялян да паўстання, якое ахапіла і нашу Глыбоччыну.

Паводле другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1799 годзе Глыбокае адышло да Расіі. Яшчэ ў маі 1792 года рускія войскі перайшлі Дзвіну каля Полацка і Дзісны, занялі Глыбокае і

працягвалі рух да Пастаў. У верасні ў Глыбокім быў раскватараваны полк карабінераў на чале з графам Талстым, які быў падтрыманы Барскай канфедэрацыяй. У красавіку 1799 года ў Глыбокім стаяў Мурамскі гусарскі полк.

У 1794 годзе ў Польшчы, Беларусі і Літве адбылося паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, мэтай якога было аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Адбыліся хваляванні ў Глыбокім, якое неўзабаве было занята расійскім эскадронам кавалерыі і ротай егераў на чале з графам Бенігсенам. Тым часам мяцежнікі ўзялі ўладу ў свае рукі ў шэрагу гарадоў: Брэсце, Мінску, Ваўкавыску, Слоніме, Навагрудку, Ашмянах і Кобрыне. У бліжэйшых да іх мястэчках канцэнтраваліся царскія войскі, якія былі гатовыя ісці на падаўленне паўстання. 9 мая 1794 года з Глыбокага ў напрамку Браслава выступіў маёр Стафанопура, які разбіў паўстанцкія атрады і спаліў частку Браслава. Замест гэтых войск да канца мая ў Глыбокае прыбылі іншыя — тры эскадроны драгунаў Пскоўскага палка.

Пасля некалькіх месяцаў з Кракава выступіў Касцюшка, пра што чуткі дайшлі ажно да Дзісны. 27 красавіка 1796 года маёр граф Бенігсен атрымаў загад аб неадкладнай адпраўцы аднаго эскадрона кавалерыі і 130 егераў, якія павінны паспяшацца ў Глыбокае для ўціхамірвання тутэйшых жыхароў. На наступны дзень Тутамлін рапартуе Рапніну, што войска было напраўлена для назірання за няўстойлівым спакоем… Яшчэ няма яўнага і адкрытага паўстання, але ўсё для яго падрыхтавана. Генерал Лукашэвіч таксама запэўнівае Рапніна, што прысутнасць арміі надасць іншы кірунак намерам жыхароў нованабытых губерняў і папярэдзіць далейшыя намеры паўстанцаў. Пасля такой «апекі» Глыбокае прыціхла.

Неўзабаве становішча паўстанцаў пагоршылася, але Касцюшка не падаў духам і спрабаваў адбівацца на ўсе бакі, хоць рабіць гэта было ўсё цяжэй і цяжэй. 10 кастрычніка каля Мацяёвіцаў быў цяжка паранены сам Касцюшка і трапіў у палон. Непрытомны Касцюшка быў абрабаваны і 11 кастрычніка пад імем шляхціца Шыманскага пры строгай і пільнай ахове быў накіраваны ў Санкт-Пецярбург.

Знаходжанне Касцюшкі ў палоне адмоўна паўплывала на ход паўстання. Войскі пад камандаваннем Суворава жорстка задушылі паўстанне. За што Сувораў атрымаў званне фельдмаршала і быў узнагароджаны 13 000 прыгонных беларускіх сялян.

Хоць паўстанне і пацярпела паражэнне, аднак яго значэнне ў гісторыі Еўропы вялікае. Дэмакратычны рух распаўсюдзіўся амаль на ўсю Еўропу. Паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі не зберагло Рэч Паспалітую двух народаў, не дало волі, незалежнасці і лепшай долі яе жыхарам. Але яго ўдзельнікі паспрабавалі гэтае зрабіць, а гэта куды болей значна. Касцюшка паказаў той шлях, які вядзе да свабоды. Лепшыя сыны народа ведалі, што за волю трэба змагацца і са зброяй у руках, і без зброі. Наш нацыянальны герой Якуб Ясінскі казаў: «Хочаце быць свабоднымі? Дык будзьце імі!» Беларусы заўжды шанавалі памяць пра Тадэвуша Касцюшку. У легендах, паданнях і песнях захоўвалі яны светлы ўспамін пра свайго земляка-заступніка.

KAMUNIKAT.org

**ВАСІЛЬ НАВУМЕНКА**
*(14 гадоў, в. Паўлавічы
Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)*

## РОДНАЕ

Колькі на свеце мясцін ёсць прыгожых.
Імі багата наша зямля.
Толькі мілейшы за ўсіх мой куточак,
Край мой прасторны — Радзіма мая.
Край белых буслоў і азёр сінявокіх.
Край неабдымных палёў і лугоў.
Край звонкіх рэчак і сцежак бясконцых.
Мілая сэрцу старонка бацькоў.

Кожны пагорак і кожнае дрэўца,
Кожны да болю знаёмы лісток.
Радасцю шчырай поўніцца сэрца,
Радасцю шчырай за родны куток.

Чую я шэпат бяроз беластвольных,
Плач івы-маці над ціхай ракой,
Чую напевы я песень павольных,
Песень шчаслівых Радзімы маёй.

## ПАЎСТАННЕ СЯЛЯН
## ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ВАШЧЫЛЫ

Балотнікаў, Разін, Пугачоў... Гэтыя славутыя, легендарныя імёны кіраўнікоў народных выступленняў у Расіі ведаюць усе. У Беларусі легендарным стала імя Васіля Вашчылы, які ўзначаліў буйнейшае ў беларускай гісторыі феадальнай эпохі народнае паўстанне. Але ці ведаюць у нас так пра Вашчылу, як ведаюць пра Разіна і Пугачова? Ці ведаюць пра тыя далёкія падзеі? Станоўчы адказ на пастаўленыя пытанні пачуеш не ад многіх. А між тым легенды павінны быць забяспечаны гістарычнымі ведамі. Тым больш што паўстанне пад кіраўніцтвам В. Вашчылы пачалося ў 1740 года ў тагачасным Крычаўскім старостве, куды адносіліся і многія клімавіцкія вёскі, а сам кіраўнік паўстання ўраджэнец (1690 г.) вёскі Лобжа нашага раёна. Пагэтаму я ставіў перад сабой

мэту — даведацца як мага больш аб гэтым паўстанні і яго ўдзельніках, маіх земляках. Дык давайце ж зазірнем у XVIII стагоддзе і даведаемся пра падзеі 30–40-х гадоў у Крычаўскім старостве, калі сяляне і гараджане, не сцярпеўшы здзекаў, падняліся на барацьбу супраць сваіх прыгнятальнікаў.

Крычаўскае староства знаходзілася на тэрыторыі Усходняй Беларусі ў ранейшым Мсціслаўскім ваяводстве на памежжы Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі беларускія землі, і Рускай дзяржавы. Староствамі ў той час называліся дзяржаўныя ўладанні, што ў сваёй большасці былі ў пажыццёвым трыманні магната ці шляхціца. Той кіраваў староствам і адказваў за яго цэласнасць, маючы пры гэтым поўнае права распараджацца прыбыткамі ад уладання за выключэннем так званай «кварты» — чвэрткі агульнага прыбытку. Апошнюю ўладальнік павінен быў штогод аддаваць у дзяржаўную казну.

У другой палове XVII стагоддзя Крычаўскае староства было падаравана князю Карлу Станіславу Радзівілу, а пасля яго смерці (1692) перададзена ў спадчыннае карыстанне жонцы магната — Ганне Радзівіл. Пазней Крычаўшчына доўгі час знаходзілася ў руках іх сына Іераніма Фларыяна і іншых прадстаўнікоў буйнейшага ў Рэчы Паспалітай роду князёў Радзівілаў. Такім чынам, нягледзячы на тое, што землі староства з'яўляліся ўласнасцю караля, фактычнымі іх уладальнікамі былі Радзівілы.

Галоўным заняткам сялян у Крычаўскім старостве было земляробства. Зямельныя надзелы прыгонных былі тут невялікімі.

Усе шматлікія павіннасці прыгонных перад сваімі гаспадарамі з'яўляліся нарматыўнымі — гэта значыць зафіксаванымі ў інвентарах. Інвентарамі называліся апісанні феадальных уладанняў, у якіх прыводзіліся звесткі аб гаспадарцы феадала, а таксама аб складзе сям'і, зямельных надзелах, маёмасці і павіннасцях сялянства.

Невыносным цяжарам клаліся на сялян Крычаўшчыны ўсякія штрафы. Арандатары трымалі спецыяльных слуг, якія толькі тое і рабілі, што сачылі за прыгоннымі, каб знайсці абы-якую зачэпку дзеля накладання і спагнання штрафаў. Асабліва цяжкае, проста невыноснае для сялян становішча склалася ў 30-я гады XVIII стагоддзя, калі Крычаўскае староства арандавалі браты Гдаль і Шмуйла Іцкавічы. Сваёй жорсткасцю ў адносінах да прыгонных

гэтыя арандатары не ішлі ні ў якое параўнанне са сваімі папярэднікамі.

Па загадах арандатараў сяляне вымушаны былі вазіць на ўласных падводах паташ, пяньку, алей у Пецярбург, Невель, Вялікія Лукі, Свержань, Слуцк. Сялянскі гандаль у старостве забараняўся, а браты-арандатары, карыстаючыся гэтым, па таннай цане скуплялі ўсе мясцовыя тавары. Без усякай прычыны слугі-найміты Іцкавічаў збівалі простых людзей, забараняючы ім у той жа час скардзіцца ўладальніку Крычаўскага старостваРадзівілу на самавольныя расправы.

Па гасцінцах старостваснавалі прыслужнікі арандатараў, якія затрымлівалі тых, хто адважваўся несці скаргі да князёў Радзівілаў. Суплікантаў (сялян, якія дастаўлялі гаспадарам скаргі-суплікі) жорстка каралі: штрафавалі, катавалі, кідалі ў турмы. Адным са шматлікіх суплікантаў, якія бясконца цярпелі ад каварных слуг-наймітаў арандатараў, быў Васіль (Васко) Вашчыла — войт вёскі Селішчы. У кастрычніку 1731 года, вяртаючыся з Міра, куды ён хадзіў са скаргай да Радзівіла, Вашчыла быў затрыманы слугамі Гдаля Іцкавіча, закаваны ў ланцугі, збіты і кінуты ў крычаўскую турму. Некалькі раней той жа Вашчыла быў пакараны 150 ударамі бізуна зноў жа за тое, што асмеліўся хадзіць са скаргай да Радзівіла ў Варшаву.

Вашчыла быў вядомы як ініцыятыўны і прадпрымальны гаспадар. У той жа час ён смела і рашуча выступаў супраць злоўжыванняў арандатараў і адміністрацыі Крычаўскага староства. Так што выбар крычаўскімі сялянамі свайго лідэра быў невыпадковым. У маі 1740 года Васіль Вашчыла ўзначаліў першы ўзброены сялянскі атрад, які пачаў баявыя дзеянні супраць арандатарскіх наймітаў і здабыў першыя поспехі ў барацьбе з упэўненым у сваёй неперaможнасці, пыхлівым шляхецкім злучэннем.

Што ж прымусіла сялян і простых гараджан Крычаўшчыны ўзняцца супраць прыгнятальнікаў? У першую чаргу жорсткі павіннасны ўціск і рабаўніцтва з боку арандатараў.

Магутны выбух народнага гневу вымеў са староства жорсткіх прыгнятальнікаў-арандатараў. Паўстанцы ўзялі ўладу ў свае рукі.

Дык якой бачылася сялянам справядлівасць?

Многія пытанні кіравання Крычаўскім старостваМ Васіль Вашчыла вырашаў са сваімі паплечнікамі. Яны здавалі ў арэнду, як і раней, прамысловыя прадпрыемствы і корчмы. Новых

арандатараў шукалі сярод гараджан, дробнай шляхты, заможных сялян. Захавалася звыш 20 арэндных дагавораў, падпісаных Вашчылам і яго памагатымі. Кіраўнікі паўстання стараліся абмяжоўваць эксплуатацыю сялян арандатарамі. Апошнім прадпісвалася пад пагрозай пакарання (канфіскацыі тавараў, штрафу) не займацца вымаганнем.

Былі прадугледжаны меры і супраць ліхвярства, што раней шырока практыкавалася ва ўладанні. Каб прыгонныя не трапілі ў поўную залежнасць ад арандатараў, сялянам забаранялася пазычаць вялікія сумы грошай і многа збожжа. Пры малых пазыках, якія таксама не заўсёды дазваляліся, быў устаноўлены невялікі працэнт. Пад пагрозай штрафу яго забаранялася перавышаць.

Такім чынам, кіраўнікі сялянскага руху спрабавалі паслабіць павіннасны ўціск, аберагчы падданных ад вымаганняў з боку сквапных арандатараў, абмежаваць ліхвярства, якое давяло да галечы не адну гаспадарку. Аднак гэтыя захады былі відавочна накіраваны не супраць феадалаў-землаўласнікаў, а супраць залежных ад іх арандатараў. Прыгонныя нават уявіць сабе не маглі, каб выступіць супраць уладальніка Крычаўшчыны. Сяляне акуратна па «старыне» працягвалі сплачваць Радзівілам усе падаткі. Грошы ад арэнды таксама перадаваліся гаспадару.

Рамантычна-наіўныя ўяўленні беларускага сялянства аб «добрых» панах і прыстойных служэбніках разбіваліся аб крывадушша рэчаіснасці. Новы арандатар са старажытнай мясцовай шляхты Марцін Літавор Храптовіч аказаўся такім жа прыгнятальнікам працоўнага люду. А Радзівіл, які, здавалася, непасрэдна не эксплуатаваў крычаўскіх падданных і таму ў іх вачах паўставаў нейкім панам-дабрадзеем, заставаўся адным з буйнейшых магнатаў Рэчы Паспалітай — спажыўцом дармовай сялянскай працы. Менавіта ён лічыў сябе гаспадаром у дзяржаве і раздзяляць уладу з кімсьці, а тым больш з «халопамі», не збіраўся.

Гэта стала відавочна, калі сялянскі рух пачаў пашырацца і ў Вашчылавым войску налічвалася ўжо каля 2 тысяч чалавек. Радзівіл адчуў, што страчвае кантроль над сітуацыяй і ўладу ў старостве. Каб задушыць паўстанне, князь Іеранім Фларыян Радзівіл накіраваў на Крычаўшчыну войска са сваёй слуцкай рэзідэнцыі. 15 студзеня 1744 года некалькі сотняў салдат з гарматамі і некалькі сотняў казацкай конніцы ўвайшлі ў Крычаў.

Савет кіраўнікоў сялянскага руху вырашыў даць бой ворагу, пакуль да яго не падышла дапамога.

Узброеныя сяляне на чале з Вашчылам 18 студзеня атакавалі горад. Княжацкія воіны-найміты акрамя самай сучаснай на той час агнястрэльнай зброі мелі добры вопыт вядзення баявых дзеянняў. Дапамаглі ім таксама гарадскія ўмацаванні. Галоўная ж сялянская зброя — нянавісць да прыгнятальнікаў — была вельмі слаба падмацавана зброяй баявой. Таму не дзіўна, што радзівілаўскае войска без відавочных страт адбіла атаку паўстанцаў і адкінула іх ад Крычава за Сож.

Але Вашчыла не лічыў сябе пераможаным. Прыгонныя не склалі зброю і не скарыліся. Яны спыніліся ў вёсцы Царковішча, збіралі сілы і рыхтаваліся да новых бітваў. Прынамсі, на 26 студзеня планаваўся паўторны штурм Крычава.

Пра гэтыя намеры неяк дазнаўся вораг. У гэты ж час у Крычаў прыйшло падмацаванне да радзівілаўскага атрада. Адчуўшы перавагу, княжацкія злучэнні ў ноч на 26-е — на той дзень, калі сяляне планавалі захапіць Крычаў, — рушылі ў напрамку Царковішчаў. Асцярожна, пад покрывам цемры, яны наблізіліся да лагера паўстанцаў. На золку радзівілаўскае войска ўсёй моцай абрушылася на сялян. Тыя нават не здолелі арганізаваць хоць якую абарону. Невялікія групы паўстанцаў з Вашчылам адыходзілі да лесу. Каля 200 чалавек загінулі на полі бою, 176 трапілі ў палон.

Пачалася расправа. Камандуючы карнікамі загадаў 30 паўстанцаў павесіць, яшчэ 30 пасадзіць жывымі на калы і падвесіць за рэбры на круках. Уся маёмасць актывістаў сялянскага руху канфіскоўвалася. Па сутнасці, Крычаўшчына была аддадзена на разрабаванне салдатам.

Такім чынам, у пачатку лютага 1744 года паўстанне сялян Крычаўскага староства было задушана. Ужо 27 студзеня Пястжэцкі дакладваў Радзівілу, што асноўныя сілы прыгоннага войска разбіты і падданныя не змогуць больш збірацца ў грамады.

У першай палове лютага 1744 года ў Крычаў прыбыў Іеранім Фларыян Радзівіл. Яго суправаджаў конны атрад, які налічваў 300 чалавек. На той час у горадзе і па староству было ўжо спакойна. «Пан-дабрадзей» прыехаў у сваё уладанне, каб назіраць і санкцыянаваць расправу над сялянамі-бунтаўшчыкамі, якія так

верылі ў яго справядлівасць. Вось так суровая рэальнасць разбівала ў сялян і гараджан сляпую веру ў так званых добрых паноў.

Да прыбыцця Радзівіла ў староства прыгавор кіраўнікам і найбольш актыўным удзельнікам паўстання не выносіўся. Суд, да якога былі прыцягнуты некалькі дзесяткаў чалавек, адбыўся 22 лютага ў прысутнасці бурмістраў, радцаў, лаўнікаў — выбарных прысяжных засядацеляў у судах — пад старшынствам губернатара Крычаўскага староства Паўла Цялецкага. Падсудныя абвінавачваліся ў тым, што арганізоўвалі бунты на працягу чатырох гадоў, падчас якіх не хацелі прызнаваць загадаў Радзівіла, лічылі іх выдуманымі; не прымалі ў староства губернатараў, камісараў і падстарастаў, некаторых з іх збівалі, забіралі ў іх маёмасць; забівалі арандатараў, купцоў і іншых мяшчан, у якіх канфіскоўвалі багацце; нарэшце, са зброяй у руках двойчы выступілі супраць войска самога Радзівіла. За гэтыя цяжкія, з пункту гледжання пануючага класа, злачынствы бунтаўшчыкі заслугоўвалі самага суровага прысуду.

І ён быў вынесены.

Шаснаццаць кіраўнікоў паўстання прыгаварылі да пакарання смерцю: Івана Карпача, Стэся Бачко, Васіля Ветра, Мікіту з Бароўкі, Івана Труса, Навума Буяна, Васіля Пачаёнка, Васіля Косціна суд прызначыў пасадзіць на калы; Івана Дакуку, Захарку Сямашку, Іванішку з вёскі Бароньki, Мікіту з Тупічына — павесіць; Сямёну Вароне, Ігнату Малунёяку, Івану Крывулю, Івану Галёнку — адсячы галовы.

Жорстка караліся і паплечнікі кіраўнікоў паўстання.

Прысуд быў вынесены 31 кіраўніку і ўдзельніку сялянскага руху. Астатнія паўстанцы, якія былі захоплены ў палон, пасля катаванняў у замкавым астрозе былі адпушчаны.

І вось настаў дзень — 26 лютага 1744 года, калі жудасны прыгавор павінны былі прывесці ў выкананне. Галоўную плошчу Крычава пакрылі шыбеніцы, калы, плахі. Каб паказаць, да чаго прыводзіць удзел у бунтах і канчаткова ўціхамірыць падданых, у цэнтр староства былі сагнаны для назірання за расправай над найбольш актыўнымі паўстанцамі крычаўскія мяшчане і жыхары навакольных вёсак. Самыя зручныя для назірання месцы былі адведзены «галоўным героям» падаўлення сялянскага руху — палкоўніку Пястжэцкаму, губернатару Цялецкаму, іншым

афіцэрскім чынам радзівілаўскага войска. У цэнтры гэтай кампаніі сядзеў Іеранім Фларыян Радзівіл.

Каты стаялі ў чаканні каля сваіх жудасных прылад, потым пачалі тузаць вяроўкі на шыбеніцах, правяраць, каб яны, крый божа, не абарваліся, глядзець, ці дастаткова надзейна ўкапаны калы, якія павінны былі наскрозь прайсці праз жывое чалавечае цела...

І вось да лобнага месца вывелі 16 скатаваных у княжацкіх падзямеллях кіраўнікоў Крычаўскага паўстання.

Над плошчай павісла цішыня.

Цялецкі падняўся і гучным голасам прачытаў прыгавор. Потым пераможным позіркам абвёў плошчу.

Цішыня стала невыноснай.

Радзівіл лянiва ўзмахнуў рукой і вымавіў: «Пачынайце».

Каты прыняліся за сваю справу. Стогны і жаночае галашэнне заглушыў бой барабана.

Васіля Вашчылы паміж загінуўшых не было. Яму ўдалося перайсці мяжу і шукаць паратунку ў Расійскай дзяржаве. Дазнаўшыся аб месцазнаходжанні завадатара крычаўскіх сялян, Радзівіл звярнуўся з просьбай да ўрада Расіі аб перадачы яго як злачынцы. Пакуль вялася папяровая цяганіна паміж Кіевам, Пецярбургам і Старадубам, Васіль Вашчыла, якога трымалі пад аховай у Старадубскай крэпасці, цяжка захварэў. 26 жніўня 1744 года яго не стала.

Гераічная барацьба сялян і гараджан Крычаўскага староства ў канцы XVII – першай палове XVIII стагоддзя супраць сваіх прыгнятальнікаў, якая вылілася ва ўзброенае паўстанне, закончылася паражэннем прыгонных. Іначай і быць не магло, бо сялянскі рух быў стыхійным, пазбаўленым свядомых палітычных мэт. На месца арандатараў падданыя зноў жа ставілі арандатараў; выступаючы супраць ненавіснага дзяржаўцы, яны віталі свайго ўладальніка — Радзівіла.

На развіццё сялянскага руху на Крычаўшчыне ўплывала і тое, што на чале паўстанцаў сталі прадстаўнікі сялянскай вярхушкі, якія займалі адміністрацыйныя пасады ў мясцовых органах улады. У прыватнасці, амаль усе кіраўнікі паўстання былі вясковымі войтамі. У сваіх дзеяннях супраць арандатараў і адміністрацыі яны не заўсёды былі да канца паслядоўнымі, шукалі кампрамісаў і прымірэння з уладальнікам Крычаўскага староства — Радзівілам.

Нягледзячы на паражэнне, Крычаўскае паўстанне мела вялікае значэнне. Па-першае, вынікам мужнай барацьбы прыгонных стала паслабленне феадальнага прыгнёту ў старостве. Уладальнік Крычаўшчыны замяніў цяжкія работы на будах грашовым паборам, зняў шэраг абмежаванняў на сялянскі гандаль, адмовіўся ад здачы староства ў арэнду.

Галоўным жа вынікам Крычаўскага паўстання было тое, што сяляне атрымалі значны вопыт арганізаванасці, пэўнай свядомасці ў барацьбе супраць сваіх прыгнятальнікаў. Упершыню ў гісторыі класавай барацьбы сялянства супраць феадалаў на Беларусі прыгонныя стварылі паўстанцкае войска, якое ваявала з радзівілаўскімі ваеннымі злучэннямі і часам нават перамагала. Класавая барацьба сялянства, кульмінацыйнымі пунктамі якой былі ўзброеныя, накшталт Крычаўскага, паўстанні, расхіствалі феадальна-прыгонніцкую сістэму, стваралі такія ўмовы, у якіх феадалу заставалася месца ўсё менш і менш.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Памяць: Клімавіцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мн., 1995. С. 32.

2. Мялешка В. І., Лойка П. А. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы. Мн., 1988. С. 3–4, 74–75, 94.

3. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. 1999. Т. 4. С. 49.

4. Гісторыя беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 1. С. 410–415.

5. Радзімазнаўства. Магілёў, 1992. С. 2, 57–58.

**КСЕНІЯ АБІБАК**
*(14 гадоў, г. Мінск)*

## БЕЛАРУСАМ

Не, беларус, я не прашу
На мове роднай размаўляць —
Я прыніжацца не хачу…
Але хачу прапанаваць:
Перад табою час няхай
Перанясецца, быццам цень.
Успомні, беларус, давай,
Сягоння успамінаў дзень.
Успомні квеценне сваё
І ВКЛ магутны рух:
Ніхто тады не мог, ніхто
На мову апрануць ланцуг!
Успамінай жа ты далей —
Грунвальд крывавы ўспамінай.
Ты біўся, як нідзе раней,
За мову і за родны край.
Калі ж шляхецтва звон манет
Вышэй за мову прыняло,
Не склаў ты рук тады, о не!
Успамінай жа, што было!
Як ты змагаўся, паўставаў,
Як не хацеў прыняць прыгнёт,
Ты, беларус, патрабаваў,
Каб мову нашу меў народ.
І гінуў ты за гэты скарб,
Але свабодны быў тады,
А зараз, беларус, ты — раб,
Табе прагрэс зажаў кадык!.
Дык вось, матай сабе на вус,
Што разам з мовай гіну я.
Я не сумленне, беларус,
Не! Я — гісторыя твая!

**РАМАН СЫЧКОЎ**
*(14 гадоў, г. Магілёў)*

* * *

Шмат гадоў таму назад
Жыў у Беларусі
Легендарны камандзір
Літвін — Андрэй Касцюшка.

Ён ваяводам добрым быў,
Любіў сваю Радзіму.
І каб яе абараніць,
Гатоў быў у баі загінуць.

Паўстанне хутка падымаў
Ён на сваёй Радзіме,
Каб незалежнасць атрымаць
Сабе і ўсім літвінам.

Ёсць тыя, хто не зразумеў
Любві яго магутнай
Да Беларусі, да сям'і,
Да ўсёй зямлі пакутнай.

У Злучаных Штатах, Францыі
І нават ва ўсім міры
Прыгожыя ёсць помнікі
Касцюшку-камандзіру.

І хоць паўстанне ён падняў
І выручыў літвінаў,
Улада кінула яго,
На ўсё жыццё забыла.

Няма ў нас помніка яму,
Няма ў нас і музея,
Ніхто не помніць пра таго,
Хто ўсім даваў надзею.

**ЯЎГЕН ПЕШЧУР**
*(14 гадоў, г. Мінск)*

# РАГНЕДА

Дзеці былі. Унучкі былі.
Ды праз агонь і беды
Не яго, а яе зямлю берaглі —
Зямлю Рагнеды.

*(В. Іпатава. Рагнеда)*

Спрадвечнае язычніцкае шанаванне маці-прарадзіцельніцы прымусіла кожны народ каранаваць сваёй любоўю жанчыну, што жыла ў далёкім мінулым, каб было ад каго весці свой род.

У палякаў каралева Ванда, якая адмовілася выйсці за ворага свайго народа, каб не трапіць да яго ў палон; у чэхаў — княгіня Лібушэ, якой удалося аб'яднаць Чэхію ў адзіную дзяржаву; у рускіх — княгіня Вольга. У беларуса жа — Рагнеда.

У наш час, мабыць, няма такога чалавека, каму б было невядомае гэта імя. Шмат чаго кожны з нас можа расказаць пра Рагнеду. Але ці будуць гэтыя апавяданні аднолькавымі? Толькі ў агульнасці. Бо ўсе нашы веды пра Рагнеду складаюцца з летапісаў, спісаў чымсьці супярэчлівых паміж сабой. Частка жыцця Рагнеды, якую апісваюць біёграфы, — гэта гіпотэзы, пошукі ў цемры. Да гэтага часу дакладна невядома яе паходжанне, год нараджэння, колькасць дзяцей, абставіны смерці.

Паспрабуем жа разабрацца, якой сапраўды была Рагнеда, абраная намі ў якасці сімвала народа.

Рагнеда была дачкой Рагвалода, першага дакладна вядомага нам полацкага князя. Акрамя Рагнеды Рагвалод меў яшчэ двух сыноў, старэйшых па ўзросту. Але Рагнеда была любіміцай у сям'і. Ёй шмат чаго дазвалялася, і, пэўна, не часта за смелыя свае ўчынкі Рагнеда атрымлівала бацькоўскае пакаранне.

Ні адна са старажытных крыніц не дае дакладнай даты нараджэння Рагнеды. Таму можна толькі здагадвацца, колькі ёй было гадоў, калі палітычныя абставіны прымусілі братоў Святаславічаў, Яраполка і Уладзіміра, прасіць яе рукі. Адны гавораць, што Рагнедзе на той момант было дванаццаць гадоў, але іншыя з гэтым не згодныя. Дакладна вядома, што ў той жа год

Рагнедзе давялося стаць маці. Нават калі дынастычныя праблемы прымушалі заключаць шлюбы з непаўналетнімі дзяўчынамі, мужы цярпліва чакалі палавой сталасці сваёй жонкі. Улічваючы ўсё гэта, можна сцвярджаць, што падчас сватаўства Рагнеда была паўналетняй.

Рагнеда была вельмі прыгожай князёўнай. Наогул, многія крыніцы адзначаюць, што полацкі княжацкі дом заўсёды ганарыўся красою сваіх жанчын. Але не столькі прыгажосць Рагнеды, колькі палітычныя выгоды шлюбу з ёй прыцягнулі ў Полацк сватоў з Кіева і Ноўгарада.

Першымі з’явіліся сваты Яраполка Кіеўскага. Ён быў старэйшым сынам Святаслава Ігаравіча і, як здавалася Рагвалоду, меў больш трывалую ўладу.

Таму, нягледзячы на тое, што малады Яраполк мог узяць Рагнеду толькі другой жонкай, бо першая была грачанка, у Полацку яму адказалі згодай.

Але ў хуткім часе да Рагнеды прыязджае сватацца князь наўгародскі Уладзімір. Усе ведалі яго як вельмі жорсткага чалавека.

Безумоўна, юная Рагнеда не мела ніякага ўяўлення аб дыпламатыі. Таму, адкінуўшы ўсялякія хітрыкі, проста заявіла: «Не хачу разуці рабыніча, а за Яраполка хачу». Гэтым яна вельмі абразіла князя Уладзіміра. Нават спробы з боку родных Рагнеды не выправілі становішча. Уладзімір паабяцаў адплаціць за крыўду. Ён вядзе войска на Полацк і захоплівае яго. Уся княжацкая сям’я гіне. А Рагнеду Уладзімір насільна бярэ за жонку.

Пасля ўсіх гэтых падзей Уладзімір вядзе сваё войска на Кіеў. Ён забівае Яраполка і становіцца кіеўскім князем. Рагнеда, разам з жонкамі і наложніцамі Уладзіміра, таксама трапляе ў Кіеў.

988 год стаў для жанчыны ракавым. Уладзімір вырашыў прыняць хрысціянства і заключыць шлюб з візантыйскай царэўнай Ганнай. Гэта азначала, што з «гарэмам» трэба расстацца. Уладзімір, не адмаўляючыся ад дзяцей, прапанаваў жонкам развод і новае замужжа. Жанчыны не маглі яму запярэчыць. Але не такой была Рагнеда. Яна гаворыць яму: «Княгіняй была, не хачу быць рабыняй».

Каб палюбоўна расстацца з Рагнедай, Уладзімір прыехаў у Прадславіна, дзе на гэты час жыла яна. Уладзімір застаўся на начлег. І тады крыўда, нанесеная Рагнедзе Уладзімірам, уклала ў яе

рукі кінжал. Але Уладзімір прачнуўся раней, перш чым нож паспеў упіцца ў яго грудзі.

Незвычайнае па тым часе здарэнне, калі жонка не толькі запярэчыла мужу, але і ўзняла на яго руку. Уладзімір вырашыў расправіцца з непакорнай. Рагнеда ўжо гатавалася да смерці, але ў апошні момант на вочы ёй трапіўся старэйшы сын Ізяслаў. Гэта і быў шлях да выратавання. Рагнеда дае Ізяславу меч і загадвае стаць на шляху раз'юшанага бацькі.

Невядома, якой была рэакцыя кіеўскага князя на гэты даволі дзіўны эпізод, але ва ўсялякім разе першапачатковае рашэнне пакараць Рагнеду смерцю змянілася іншым. Уладзімір адпраўляе Рагнеду з Ізяславам у маленькі горад — Ізяслаўль, пабудаваны спецыяльна для іх.

У тым жа годзе пад прымусам Уладзіміра Рагнеда пастрыглася ў манахіні. Так жанчына, што па існасці сваёй усё жыццё заставалася язычніцай, увайшла ў летапісы як манашка Анастасія.

Памерла Рагнеда ў 1000-м годзе. І ніхто дакладна не ведае, дзе яна пахавана.

Рагнедзе мы будзем заўсёды ўдзячныя. Хаця б за тое, што яна нарадзіла і выхавала сваіх сыноў не кволымі ды дробнымі князькамі, а асобамі, здольнымі рабіць вялікую гісторыю.

**ТАЦЦЯНА ПАЛІЎКА**
*(14 гадоў, в. Сухое
Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.)*

## 490-ГОДДЗЕ БІТВЫ ПАД ОРШАЙ

Ты — векапомная,
Ты — гераічная,
Ты — драматычная…

«Уладары Вялікага княства…» Гэтак называлі сябе магнаты сярэдневяковай беларускай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага. Багацце і палітычная ўлада дазвалялі ім пачуваць сябе ўладарамі гаспадарства.

Яскравымі асобамі беларускай гісторыі XVI–XVII стагоддзяў былі князь Міхаіл Глінскі, гетман Канстанцін Астрожскі, вялікі палітык Мікалай Радзівіл Чорны, геніяльны палкаводзец Ян Кароль Хадкевіч, вялікі канцлер Леў Сапега.

Але хіба толькі яны… Тыя, хто аддаў сваё сэрца Айчыне, тыя, хто адчуваў крэўную повязь са сваімі дзядамі, тыя, хто ўсведамляў сваю адказнасць перад будучыняй — іх асяніў горды і велічны дух Маці-Айчыны. Вось яны, сапраўдныя ўладары Вялікага княства. Імі былі і простыя людзі, якія сваім мазалём кармілі яснавяльможнае шляхецтва, а на плячах сваіх трымалі дзяржаўны падмурак. Імі былі і тыя, хто жыццём і крывёю бараніў родны край, бо ён належаў і ім, а яны — яму. Імі былі і тыя, каму выпала стаяць на вяршыні ўлады, каб служыць народу і Айчыне.

Пачатак XVI стагоддзя быў асабліва цяжкім для нашай дзяржавы, якая ўжо каля двух дзесяткаў гадоў ваявала з Масковіяй. Да гэтага часу былі страчаны многія землі на Браншчыне і ўсходняй Гомельшчыне, а ў ліпені 1514 года капітуляваў Смаленск. Каб замацаваць поспех, маскоўскі валадар Васілій III паслаў вялізнае войска ў глыб Беларусі — на Мсціслаў, Менск. Але насустрач яму выступілі вялікакняжацкія збройныя сілы і дапаможны польскі корпус. Сам кароль і вялікі князь Жыгімонт Стары быў пры сваім войску. Праўда, валадар Беларусі, Літвы і Польшчы не імкнуўся кіраваць ваеннымі дзеяннямі. Як чалавек разважлівы, ён выправіў наперад трыццаць тысяч ваяроў пад кіраўніцтвам вопытнейшага гетмана Астрожскага, пакінуўшы для аховы сваёй асобы чатыры тысячы ваяроў. 27 жніўня за Бярэзінай

адбылася першая сутычка з передавымі маскоўскімі палкамі. Маскавіты адступілі. На наступны ж дзень авангард Астрожскага разбіў іх на берагах Бабра, а 1 верасня — на Друці. Літвінскае войска знішчыла на сваім шляху варожыя заставы і рушыла на Оршу. У чатырох мілях ад Оршы на рацэ Крапіўне стаяла 80-тысячная раць на чале з ваяводам Іванам Чаляднінам. Літвіны падышлі да Дняпра. Аднак адразу ж пачынаць пераправу, навідавоку, пад лучным боем, не выпадала. Тут не пазбегнуць страт, да таго ж маскоўскія ваяводы зразумелі б, што ваяроў у Астрожскага амаль утрая меней. Каб заблытаць праціўніка, гетман пусціў у брод толькі невялікую частку конніцы, другая фарсіравала раку пад прыкрыццём аршанскага замка. Калі ж сцямнела, асноўныя сілы пайшлі ўверх па Дняпры і ўначы пераправіліся праз раку. На світанку рух літвінаў быў заўважаны, але Чаляднін не распачаў атаку. Ён чакаў, калі праціўнік пераправіцца цалкам, каб адразу знішчыць асноўныя сілы ВКЛ і гэтым пераможна скончыць вайну. У сваёй перамозе ён не сумняваўся. «Пачакаем, пакуль не пераправіцца ўсё войска, бо нашыя сілы настолькі вялікія, што без сумнення і без вялікіх намаганняў мы зможам ці разбіць гэтае войска, ці акружыць яго і гнаць, як жывёлу, да самай Масковіі».

Перад бітвай Астрожскі наведаў царкву і шчыра прасіў Бога аб дараванні перамогі. Пакляўся ён пабудаваць у Вільні дзве царквы: «Калі міласцівы і ўсемагутны Бог дасць нам перамогу над бязбожным ворагам і перадасць у нашы рукі і ягоных людзей, такіх жорсткіх, як і шматлікіх».

Раніца 8 верасня 1514 года застала дзве раці гатовымі да крывавай сечы. Астрожскі вольна рушыў шыхты вершнікаў, правакуючы праціўніка. Гэта падзейнічала на маскоўскае войска, і яно пайшло ўперад. Разгарэлася сеча. Гетман на полі быў у гушчы падзей, вёў за сабой ваяроў, натхняў прыкладам і словам: «Браты мілыя, пакажыце звыклую мужнасць у гэты нялёгкі час! Будзьце мужнымі ў мужным целе! Няхай кожны акрыяе духам супраць непрыяцеля. Сам Бог стаіць на нашым баку! Ёсць нам абарона з неба! За мной смялей наступайце, з намі Бог!» І літвіны стрымалі шалёны націск маскавітаў. Але вось літвінскае войска крок за крокам пачало адступаць, а пасля і зусім кінулася наўцёкі. Маскавіты рушылі ўслед і… наскочылі проста на гарматы. Хітрасць Астрожскага ўдалася — вораг трапіў у пастку. Гарматы ўдарылі па непрыяцелю. Астрожскі перашыхтаваў сваё войска і

павёў яго ў атаку, якую маскавіты не маглі вытрымаць. Усе яны ратаваліся роспачнымі ўцёкамі. А за ўцекачамі, секучы, колючы, рушыла наша конніца. Палова войска Васілія III лягла на аршанскіх палях, патапілася ў Дняпры і Крапіўне. Нашы ж страты налічвалі меней за паўтысячы забітымі. Чаляднін так і не ўцёк, яго дагналі і захапілі ў палон. Яшчэ ніколі рускае войска не ведала такога сакрушальнага паражэння.

Аршанская перамога тым разам не вярнула ВКЛ Смаленска. Але яна стала яскравейшай старонкай ваеннай беларускай гісторыі, заняла адно з першых месцаў у шэрагу бліскучых трыумфаў нашай зброі. Сеча пад Оршай была найслаўнейшай для Астрожскага. У ёй найбольш праявіўся яго палкаводчы геній. Тут поўнасцю было прыменена ўменне адпаведна сілам праціўніка супрацьпаставіць уласныя сілы, нанесці ўдары ў патрэбным кірунку, навязаць ворагу сваю тактыку, ужыць фактар нечаканасці, максімальна выкарыстаць моц агнястрэльнай зброі ў вырашальны момант і, нарэшце, асабістай мужнасцю натхніць ваяроў на гераічны чын.

Вестка пра Аршанскую перамогу разнеслася па ўсёй Еўропе. Еўрапейскія ўладары на справе пераканаліся ў магутнасці ВКЛ. У самім апостальскім Рыме былі адслужаны ўдзячныя малебны.

Высока сягнула слава К. Астрожскага, але ён не стаў фанабэрыстым і пыхлівым, а па-ранейшаму заставаўся такім жа сціплым і простым. Як і абяцаў, ён выпрасіў дазвол і пабудаваў у Вільні за свой кошт дзве царквы: Троіцкую і Нікольскую як помнікі перамогі пад Оршай і як памяць пра тых літвінскіх ваяроў, якія склалі галовы, абараняючы Бацькаўшчыну.

Няспынна бяжыць час, адлічваючы стагоддзі, пасля тае сечы пад Оршай. Даўно не засталося сведкаў тае падзеі, але людская памяць здольна захаваць тое, што дарага чалавечаму сэрцу. Вось і ў гэтым годзе спаўняецца 490 гадоў са дня перамогі пад Оршай. Ва ўсе вякі, незалежна ад улады, наш народ змагаўся за сваю незалежнасць, аддаючы сваё жыццё, абараняючы Бацькаўшчыну.

**МАРЫНА СТАСЕНКА**
*(14 гадоў, в. Ападышча Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.)*

## УСПАМІН ПРА ІХ

Праходзяць хвіліны, гадзіны, дні, гады, стагоддзі. Мы жывем у такой цудоўнай краіне, як Беларусь. І на самой справе Беларусь — гэта адзін з самых прыгожых куточкаў на Зямлі, таму што гэта наша з вамі Радзіма. Гэта месца, у якім мы нарадзіліся і выраслі, і, дзе б мы ні знаходзіліся, Беларусь заўсёды будзе ў нашых сэрцах, таму што нідзе болей няма такой прыгожай прыроды, такога прыгожага сонца, як у Беларусі.

Мы з вамі жывем у свабоднай краіне і, мабыць, ніколі не задумваліся, хто падараваў нам гэтую свабоду, хто крывёю расплаціўся за яе. А між тым былі такія людзі, якія і загінуць не баяліся дзеля сваёй Радзімы, дзеля свайго краю. І менавіта гэтым людзям і іх памяці мы павінны кланяцца нізка да зямлі, бо ім мы абавязаны сваёй незалежнасцю і свабодай.

## ТАДЭВУШУ КАСЦЮШКУ

Прайшлі гады з тых даўніх пор,
Калі трубілі на Беларусі збор
Ісці бароцца за свабоду
Прыгнечанаму беларускаму народу.

Ніхто не помніць той часіны,
Калі, пакінуўшы родныя мясціны,
Агромістай сялянскай грамадою
За шчасце Беларусі змагаліся з касою.
…А наперадзе ўсіх едзе
Са сцягам у руках амерыканскі генерал
Тадэвуш пан Касцюшка,
Які любіў свабоду ўсіх народаў,
Нягледзячы, якіх яны расаў-родаў.
Славуты наш зямляк,
Сябра і дарадчык Вашынгтона,
Змагаўся за свабоду
Амерыканскага і беларускага народа.

Ад тых гадоў засталася памяць
І ўдзячнасць ад людзей —
Часта прыходзяць госці ў Кракаў
Да Тадэвуша ў Вавель.
Помняць родныя Сяхновічы малога Банавентуру,
Помняць юнака Любяшоў і Парыж,
Ведае подзвігі амерыканская Саратога,
Услаўляе яго Паспалітая Рэч.

KAMUNIKAT.org

**ВОЛЬГА ШЫЦІК**
*(14 гадоў, в. Лабачоўка
Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.)*

## ДЗЯДУЛЕВА ПАМЯЦЬ

Я люблю Беларусь за бяскрайнія далі,
За туманы лугоў і срэбра блакітных азёр,
За бары і ўзлескі, дзе сосны шапталі
Пра былыя падзеі і подзвігі нашых дзядоў.

Бо не раз Беларусь пазбаўлялі правоў
І драпежнікі цела яе мардавалі,
Але зорка Радзімы ўзыходзіла зноў,
І з руін гарады паўставалі.

Больш паўвека прайшло з таго часу, як ты
Адрадзілася зноў ад фашысцкай навалы.
Толькі памяць дзядулі гартае старыя лісты
І ў вайну яго сэрца вяртае…

«Помню, гул самалётаў у небе вісіць,
На іх крылах крыжы ды арлы з кіпцюрамі.
Ўся зямля ад тых гукаў трывожна дрыжыць,
І гарыць наша поле з жытамі.

А назаўтра панурым натоўпам ідуць
Дзве калоны байцоў, што ўцалелі ў баях.
Шмат каго з іх пад рукі вядуць,
Бо галовы ці грудзі ў крывавых бінтах.

Іх панурыя позіркі моўчкі лаўлю,
Ды пытанне нямое ў дзіцячых вачах:
«На каго пакідаеце нашу зямлю?»
Хутка змоўклі іх крокі ў сівых палынах.

Чую крыкі фашыстаў на роднай зямлі,
Лай аўчарак і плач палонянак.
Бачу я, як вяскоўцаў на смерць павялі,
Як гарыць кожны дах, кожны ганак.

А затым бачу сосен я дружных сям’ю,
Партызанскі атрад сярод лесу стаіць.

Я фашыстаў без жалю гублю
За зямлю, дзе мне хочацца жыць.

...Прагрымелі баі, а затым — і салюты,
І зацвіў яркай зоркай 45-га май.
І квітнее рамонак бялюткі-бялюткі
На тым полі, дзе кроў пралілася праз край».

Засцілае слязою дзядулевы вочы,
Ды і я не хаваю слязінак сваіх.
Ад сасновага бору паціху мы крочым,
Нават думкі цяпер ў нас адны на дваіх.

Летні поўдзень сыходзіць на ўзлесак сасновы,
Свежы ветрык галінкі гайдае.
Ля дарогі калышыцца колас жытнёвы.
Нібы мора, хвалюецца ніва жывая.

Любім мы Беларусь за блакітнае неба,
За салодкі пах грэчкі на родных палях.
І нам іншага шчасця не трэба —
Толькі ты, Беларусь, не згубі мірны шлях!

KAMUNIKAT.org

**ВОЛЬГА КОТУХ**
*(14 гадоў, г. Мінск)*

# МІНУЎШЧЫНЫ ГЕРОЯМ...

Што значыць нарадзіцца беларусам?
Што значыць мову беларускую нясці?
Што значыць, напатканы лёсам,
Жыццё сваё ў ахвяру прынясці?

Адказ ужо гісторыі вядомы.
І колькі змагароў-сыноў
Памерла ў барацьбе няроўнай
За веру, шчасце, за любоў.

Да сенажацяў, каласоў высокіх,
Да неба, сонца, да людзей,
Да рэк, азёр, лясоў глыбокіх,
Да светам поўных мар-надзей.

Што значыць нарадзіцца сынам,
Сапраўдным сынам з вераю сляпой
У будучыню светлую айчыны,
Ў жыццё і у людскі спакой?

Быў чалавек! Імя яму Тадэвуш!
Так трэба жыць, як ён нам паказаў:
Знішчаць у сэрцах векавую неруш,
Вясці да роўнасці, братэрства з небыцця.

О, колькі вобруку са смерцю
Хлапечае змагалася жыццё
Праз здраду, войнаў ліхалецце
Наперад да скінутых ланцугоў!

Анёлы белымі крыламі
Палаючае сэрца зберaглі:
Зямлю, што ў путы закавалі,
Трэ было да свабоды узнясці.

Паўстанне выбухам узнялося,
Мацнела, шырыла рады.

«Да зброі!» — быў сігнал. Здалося,
Званы хрысцілі шлях цяжкі.

І што — дарэмна ўсё? Ўсё марна?
Лілася родная крывя,
Каб пан расійскі зноў старанна
Скаваў путамі нежыцця?

Не варта так казаць! Не варта!
Не суддзі мы, не нам судзіць
Памылкі тых, хто так упарта
Сабой ахвяраваў для ўсіх.

Касцюшкін подзвіг... Ён спярша нябачны.
Схаваны дзесці ў глыбіні душы
Народа беларусаў, продкаў нашых.
Яго яны нам ў сэрцы даняслі.

Дык жа не страцім гэты скарб каштоўны!
І памяць аб падзеях даўніны
Мы аднавім і помнік гэты просты
Мінуўшчыны героям прысвяцім.

KAMUNIKAT.org

**ДАНУТА ЗАЙКОЎСКАЯ**
*(14 гадоў, г. Мінск)*

## «СПРАВА ЎВАСКРЭСНЕ, ЯК ПРЫСПЕЕ ЧАС...»

Быў халодны зімовы вечар. Уся зямля была пакрыта снегам. Ён і цяпер падаў з вышыні буйнымі камячкамі. Гэта быў люты 1746 года. Зіма прадчувала надыход вясны і не хацела здавацца. Сабраўшы сваіх верных памочнікаў — завіруху, снег і паўночны вецер, яна разышлася на ўсю моц. Снег і вецер, пабраўшыся парай, кружылі па лузе, калыхалі галіны дрэў, гудзелі ля сценаў хат. Цікаўны вецер зазірнуў у акно сціплага драўлянага дома ў маёнтку Мерачоўшчына. Там гарэла святло і плакала толькі што народжанае дзіцятка.

Гэта быў хлопчык, якога бацькі назвалі па спрадвечнаму звычаю Андрэем Тадэвушам. Паходзіў ён са старажытнага беларускага шляхецкага роду Касцюшкаў. Гэты род да часоў яго нараджэння збяднеў і заняпаў. Маленькі Тадэвуш любіў свой родны кут. Тут ён бавіў час са сваімі сябрамі, любіў катацца на лодцы па рацэ Шчары, гледзячы, як блакітныя хвалі ракі пераліваюцца на сонцы. Ён гуляў у вайну і марыў быць падобным на шведскага караля Карла.

Калі Тадэвуш падрос, ён паехаў вучыцца ў кадэцкі корпус у Варшаве. Тут Касцюшка авалодаў асноўнымі прынцыпамі сваёй будучай прафесіі, але прага да ведаў прымусіла юнака паехаць у Парыж. Там ён правучыўся тры гады. Нарэшце Тадэвуш вырашыў вярнуцца на радзіму, але тут яго сустрэлі не гасцінна. Юнак не здолеў знайсці сабе працы і таму быў вымушаны паехаць у 1776 годзе за акіян у Амерыку.

Сталася так, што ў гэты час пачалася вайна Паўночнай Амерыкі з Англіяй. Паўночная Амерыка змагалася за сваю незалежнасць. Убачыўшы, якім нешчаслівым быў народ гэтага кантынента пад прыгнётам брытанскіх уладаў, Тадэвуш Касцюшка вырашыў стаць змагаром за свабоду амерыканцаў. Ён ваяваў шмат гадоў і, дзякуючы яго вайсковаму таленту, амерыканская армія атрымала ў 1777 годзе адну з найважнейшых перамог пад Саратогай. Настаў час, і мара Тадэвуша збылася — Амерыка набыла сваю незалежнасць, утварылася самастойная дзяржава Злучаныя Штаты Амерыкі. Сам Касцюшка атрымаў чын генерала і стаў ганаровым грамадзянінам Злучаных Штатаў Амерыкі.

Але, як і кожны чалавек, ён хацеў вярнуцца дадому. Касцюшка прыехаў на Беларусь у 1784 годзе, жадаючы служыць сваёй Бацькаўшчыне. Але пройдзе некалькі год, і Расія, Аўстрыя і Прусія пачнуць дзяліць краіну, у якой ён нарадзіўся, — Рэч Паспалітую, і ўводзіць на роднай зямлі свае захопніцкія парадкі.

Калі ў 1794 годзе ў Кракаве пачалося паўстанне, то славутага генерала Тадэвуша Касцюшку абвясцілі яго правадыром. Беларускія сяляне таксама змагаліся ў войску свайго славутага земляка. Яны склалі сваю жаўнерскую песню:

Помнім добра, што рабілі,
Як нас дзёрлі, як нас білі.
Докуль будзем так маўчаці?
Годзе нам сядзець у хаце!

Пойдзем жыва да Касцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі!

Паўстанцаў-сялян называлі касінерамі, бо змагаліся яны косамі.

Паўстанне ахапіла ўсю беларускую зямлю, але сілы былі няроўныя. Неўзабаве паўстанцы зразумелі, што перамогі не будзе. Беларускія паўстанцкія атрады пачалі адступаць. Яны ведалі, што, можа быць, назаўсёды пакідаюць радзіму. Непадалёк ад Смаргоні ў маёнтку Залессе адзін з камандзіраў разбітага паўстанцкага атрада Міхал Агінскі выказаў сваю тугу ў музыцы. Ён напісаў паланез, які так і назваў «Развітанне з Радзімай». Ёсць такая легенда, што ноты гэтага паланеза ён напісаў сваёй крывёй на мурах, хаваючыся ад царскага войска. Гэты музычны твор сёння ведаюць ва ўсім свеце. Потым было напісана шмат карцін, вершаў і песень пра мужную барацьбу касцюшкаўцаў за свабоду і волю. Вось што пісаў, напрыклад, сучасны паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш:

Хвацкія малойцы, хлопцы-касінеры,
Харалужны корд ды песня на запас.
Секлі вам галовы за цара, за веру,
Толькі вашы коні ратавалі вас.

І жыла надзея. І лілася песня,
І гучала рэха хлопцам у адказ:
«Калі лёс загінуць — справа ўваскрэсне,
Справа ўваскрэсне, як прыспее час!»

10 кастрычніка 1794 года войска Тадэвуша Касцюшкі было разбіта непадалёк ад Варшавы пад Мацяёвіцамі. Самога Касцюшку, параненага і непрытомнага, захапілі ў палон. Яго прывезлі ў Пецярбург і змясцілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Аднак у 1796 годзе імператар Павел І вызваліў славутага героя амерыканскай вайны, знакамітага палкаводца Тадэвуша Касцюшку. Ён паехаў спачатку ў ЗША, а потым вярнуўся ў Еўропу, каб быць бліжэй да роднай зямлі. Рускі цар Аляксандр І і французскі імператар Напалеон І хацелі выкарыстаць імя Тадэвуша Касцюшкі ў сваіх інтарэсах і запрашалі яго да супрацоўніцтва. Але навучаны жыццёвым вопытам мудры палкаводзец не пагадзіўся на гэта.

На жаль, на радзіму яму ніколі больш не суджана было вярнуцца. У 1817 годзе Тадэвуш Касцюшка памёр у Салюры ў Швейцарыі. Потым прах ягоны быў перавезены ў Кракаў. А родная Беларусь так ніколі і не дачакалася свайго сына.

**МАКСІМ ЖУК**
*(15 гадоў, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.)*

## ЯГО АМЕРЫКА

### I

Сябар Томаса Джэферсана, патрыёт Тадэвуш Касцюшка сядзеў у сваім пакоі ў маёнтку Сяхновічы, ахоплены дрыготкім святлом. Быў 1784 год. Год яго вяртання на Радзіму. Касцюшка ўспамінаў. Спачатку развітанне з сябрамі, знаёмымі, многа прыемных слоў, трохі смутку і прадчування сустрэчы з Радзімай. Потым яго думкі павольна перацяклі на доўгую дарогу праз акіян. І вось ён тут, на Радзіме, якая не змянілася за гэтыя сем гадоў, быццам чакала яго, зачараваная. Бацькаўшчына засталася такой, якой і была. Але ён і не чакаў змен. Людзі не любяць перамен, баяцца іх.

Ці шкадаваў ён аб ад’ездзе? Зразумела, шкадаваў. Чалавек заўсёды шкадуе аб тым, што траціць, нават дзеля нечага лепшага, а ён пакінуў там, за акіянам, павагу, сяброў, спакой…

І ўсё ж такі чалавек — гэта яго воля, яго выбар. Але ж не халодны, пралічаны логікай выбар. Нешта іншае вярнула яго сюды, нешта большае, чым просты выбар.

Любоў да Радзімы.

Касцюшка сядзеў і спрабаваў высветліць для сябе канчаткова: чаму ён зноў апынуўся тут? І чаму калісьці апынуўся там, у Амерыцы? Ён спрабаваў зразумець унутраныя рухавікі свайго лёсу. «Чалавек — гэта яго лёс», — думаў ён.

Склаўшы на стале рукі, сябар Томаса Джэферсана, патрыёт Тадэвуш Касцюшка сядзеў у сваім маёнтку ў Сяхновічах і разважаў.

### II

Дык што ж такое лёс чалавека? Дзе ён існуе? Гэта ж не проста збег абставін, не выпадковае здарэнне. З лёсаў многіх людзей складаецца доля народа, краіны, дзяржавы, у рэшце рэшт доля Сусвету.

Тадэвуш прыслухаўся: за фіранкай цяжка гулі нейкія начныя жукі.

Чалавек, які можа кіраваць сваім лёсам, — вялікі чалавек, але яшчэ больш вялікі ён тады, калі ўмее кіраваць лёсам іншых людзей.

Касцюшка рэзка адштурхнуў крэсла і прайшоўся па пакоі.

«У мяне ёсць адна ноч, каб зразумець, чым жа скончацца мае памкненні і мары», — чамусьці падумаў ён. Наўрад ці ён змог бы вытлумачыць, чаму толькі адна ноч.

«Не, — раптам прыйшло разуменне, — чалавек не можа кантраляваць свой ці чужы лёс, бо нідзе не існуе яго. Існуе толькі збег абставін, а яны ад чалавека не залежаць».

Касцюшка дзьмухнуў на свечку. Некалькі імгненняў ён стаяў у цемры, быццам слухаў, як недзе ў Сусвеце варочае коламі выробленая самім Богам машына — генератар лёсаў, выпадковасцяў і збегаў абставін...

Але на самай справе ён чуў толькі, як за фіранкай гулі нейкія маленькія пачвары.

Усё вырашана. Так...

III

...За акном гулі нейкія начныя жукі.

Сябар Томаса Джэферсана, патрыёт Тадэвуш Касцюшка сядзеў за сталом у сваім маёнтку ў Сяхновічах.

Ён адчуваў смутак у душы. Той прыемны і цёплы смутак, які саграваe душу і лечыць усё, нават цялесныя раны. Касцюшка ўспамінаў Амерыку, з якой вярнуўся год таму. Успамінаў твары сяброў, што пакінуў, рэчы, мясціны, што паспеў палюбіць. Ён сумаваў па ўсім гэтым, але толькі ў глыбіні душы. Думкі неяк павольна-плаўна цяклі ў галаве.

«Калі людзі гавораць: «Такі ягоны лёс...», яны не маюць на ўвазе ўсю бясконцасць момантаў жыцця, яны гавораць аб нейкім галоўным пераломным моманце, можа, самым галоўным моманце ў жыцці. Гэтак і ў мяне, — падумалася раптам. — З іншага боку, лёс — гэта непарыўнае ўздзеянне абставін на жыццё чалавека. І яшчэ гэта ўплыў чалавечай волі на абставіны жыцця». Гэтае апошняе было самым важным тады для яго. Калі чалавек мае дастаткова моцы, ён можа змяніць свой лёс, свой і чужы. На хвіліну ўзнікла думка, што калі-небудзь нашчадкі змогуць фізічна вымераць гэтыя ўздзеянні і пралічыць іх. А зараз яму прыйдзецца дзейнічаць, быццам наўздагад, яшчэ не ведаючы свайго лёсу... А дзейнічаць давядзецца, бо гэта яго краіна, яго Амерыка, яго смутак, яго жукі за акном...

Усё вырашана. Быў 1784 год. Такі лёс.

**НАДЗЕЯ КАРПЕЙЧЫК**
*(15 гадоў, в. Старыя Паддубы
Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.)*

## «СЯБАР ПРЫГНЕЧАНЫХ, ВОРАГ ПРЫГНЯТАЛЬНІКАЎ»

Касцюшка — найшчырэйшы сын свабоды,
пры гэтым той свабоды, якая ўключае ўсіх,
а не толькі тых выбраных або багатых…

*З запісаў Томаса Джэферсана*

Дакладна не вызначана, дзе і калі нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка. Першы яго біёграф Карл Фалькенштэйн назваў месцам яго нараджэння маёнтак Сяхновічы ў Берасцейскім павеце. Гэтую інфармацыю ён атрымаў «з вуснаў самога генерала». Пазней з'явілася версія, што Касцюшка нарадзіўся ў фальварку Мерачоўшчына каля Косава ў тым жа Берасцейскім павеце. Такім жа заблытаным з'яўляецца і пытанне дня нараджэння. Польскі гісторык Тадэвуш Корзун прапанаваў дату 4 лютага 1746 года. Вядома, што 12 лютага 1746 года Тадэвуша ахрысцілі ў Косаўскім касцёле і далі яму ажно тры імені — Андрэй Тадэвуш Банавентура. Ёсць думка, што спачатку маці хрысціла яго пад імем Андрэй у праваслаўнай царкве, а бацька перахрысціў на каталіка.

Затое няма ніякіх спрэчак пра яго нацыянальнасць. Бацька Людвіг, мечнік берасцейскі, паходзіў са шляхецкага роду Касцюшкаў, вядомага на Берасцейшчыне з XVI стагоддзя. А маці Тэкля паходзіць з беларускага праваслаўнага роду Ратамскіх з Аршаншчыны. Сам Тадэвуш ганарыўся сваім літвінскім паходжаннем і нават імператару Аляксандру I з гонарам заяўляў: «Нарадзіўся я літвінам». Любоў да роднай зямлі, да роднай Літвы захавае ён праз усё жыццё. У час паўстання 1794 года ён пранікнёна звяртаўся да літвінаў: «Літва! Землякі і суайчыннікі мае! На вашай нарадзіўся зямлі, і ў запале праведным для маёй Бацькаўшчыны адгукнецца ўва мне найасаблівейшая прывязанасць да тых, спаміж каго распачаў я жыццё». На Літве ён нарадзіўся, вырас, пасталеў, спазнаў радасць і горыч кахання. Дзеля радзімы хацеў ён жыць, ёй служыць…

У дзевяць гадоў Тадэвуша аддалі ў школу манаскага ордэна піяраў у мястэчку Любешаў Пінскага павета. Пяць гадоў правучыўся Касцюшка ў школе, а ў 1760 годзе вярнуўся дадому ў Сяхновічы і пяць гадоў пражыў там. Спакойнае вясковае жыццё не падабалася няўрымсліваму юнаку. І калі ў 1765 годзе ў Варшаве адкрыўся кадэцкі корпус, Касцюшка па пратэкцыі пісара літоўскага Юзафа Сасноўскага паступіў туды вучыцца. Гэты чалавек пазней адыграе ў яго жыцці лёсавызначальную ролю.

Малады літвін вылучаўся сярод кадэтаў сваёй упартасцю, аскетызмам і годнасцю. Касцюшку называлі «шведам» у гонар славутага шведскага караля Карла XII. Было ў іх падабенства. Як і Карл, Тадэвуш падымаўся а чацвёртай гадзіне раніцы. А каб не прасыпаў, яго будзіў вартаўнік, які тузаў вяроўку, прывязаную да нагі і канец якой ляжаў на калідоры. Сон Тадэвуш праганяў, апусціўшы ногі ў балею з халоднай вадой. А пасля сядаў за кнігі… Аднак шведскі кароль не стаў для Касцюшкі прыкладам. Тадэвуш захапляўся жыццём грэчаскага героя Тымалена, які «страчаную народную вольнасць змог вярнуць, не ўзяўшы з яе нічога для сябе». Ужо тады Касцюшка не цярпеў любой несправядлівасці, панскай пыхі і фанабэрыі.

З 1769 года Тадэвуш працягваў вучобу ў Парыжы: слухаў курсы інжынерскіх навук у Школе гвардыі ў Версалі і ў вайсковай вучэльні ў Мэсеры, браў урокі малявання ў Каралеўскай акадэміі мастацтва.

Калі вярнуўся ў 1774 годзе на радзіму, пасады ў войску яму не знайшлося, і ён жыў у Сяхновічах. Зноў сваю «ласку» праявіў Юзаф Сасноўскі — запрасіў Тадэвуша навучаць французскай мове дачок Людвіку і Кацярыну. Гэтая гісторыя закончылася для Касцюшкі сумна, калі не драматычна. Ён закахаўся ў Людвіку, якой на той час споўнілася дзевятнаццаць гадоў. І Людвіка пакахала свайго настаўніка. Закаханыя намерыліся ажаніцца. Але пыхлівы Сасноўскі не аддаў сваю дачку за беднага шляхціца. «Галубкі не для вараб’ёў, а дочкі магнатаў не для шляхціцаў», — гэтак вырашыў ён. Касцюшка ў адчаі выкрадае каханую. Пасланая Сасноўскім пагоня адбіла Людвіку. Самому Касцюшку пагражаў суд. І што яму было рабіць, калі ні занятку, ні месца, ні шчасця не знайшоў на радзіме? Шукаць на чужыне… Стала вядома, што англійскія калоніі ў Амерыцы падняліся на вайну за незалежнасць. Касцюшка адправіўся ў Амерыку.

У Амерыцы ж Тадэвушу не прыйшлося сядзець без справы. Сем гадоў ён ваяваў у рэспубліканскай арміі за незалежнасць Амерыкі. І нездарма ваяваў: вайна закончылася перамогай амерыканцаў. 13 кастрычніка 1783 года амерыканскі Кангрэс надаў Касцюшку чын брыгаднага генерала, пажыццёвую пенсію і грамадзянства. Вашынгтон узнагародзіў яго парай пісталетаў. Але самай дарагой узнагародай для Касцюшкі было ўзнагароджанне ордэнам Цынцыната і сяброўства ў таварыстве Цынцынатаў, які ставіў сабе за мэту мацаваць свабоду сярод людзей. Ордэнскі знак у выглядзе арла з надпісам «Усё зрабіў дзеля абароны Рэспублікі» Касцюшка павесіць на абразе Маці Божай Апякункі, перад якім малілася яго маці. Сваю ўзнагароду ён прысвяціў той, хто дала яму жыццё, — матулі.

Аднак пасля вайны Касцюшка не застаўся ў Амерыцы і ў 1784 годзе вярнуўся дадому. Але і цяпер, як і раней, яму не знайшлося пасады ў войску. Пяць гадоў пражыў ён без справы ў Сяхновічах і толькі ў 1789 годзе ў чыне генерал-маёра атрымаў пад сваё камандаванне брыгаду ў польскім войску.

Брыгада Касцюшкі стаяла на Падоллі ў мястэчку Меджыбок. Тут ён і сустрэў сваё другое каханне — васемнаццацігадовую дачку пінскага харунжага Жыроўскага Тэклю. І на гэты раз шчасцю закаханых стала пагражаць бацькоўская нязгода. Журоўскі пыхліва выказаўся пра Тадэвуша: «Гойсаў па Амерыцы дзесяць гадоў, як казак. Нічога не прыдбаў! Хацеў пана Сасноўскага дачку ўкрасці. Ласы на чужыя грошы!» Вось так думала магнатэрыя — гонар нацыі. Той варты пашаны, хто мае грошы, а высакароднасць сэрца і светлая душа — нічога не вартыя. Касцюшка сапраўды адчуваў сябе чужынцам, выгнаннікам са сваіх рамантычных мар. І чаго дзівіцца, што не кранулі Журоўскага слёзы і просьбы дачкі. Не пра шчасце яе дбаў, а пра свой напышлівы гонар ды грошы. Сардэчная драма і душэўная скруха Касцюшкі выліліся ў яго развітальным лісце да каханай: «Ты, сэрца майго ажыўленне, ты, якая павінна была стаць асалодай усяго майго жыцця, Таклюся, даруй, што не знайду патрэбных слоў, але, хаваючы вочы ў хустку, схіляю галаву, каб пацалаваць твае ножанькі…» Вось такім кранальна-пяшчотным і ўзнёслым быў гэты суровы і мужны чалавек. Да канца жыцця кахала Тэкля Тадэвуша, а ён застаўся адзін. Сямейнае жыццё было не для яго. Лёс выбраў яго для іншага…

І вось прыйшоў час, калі баявы досвед Тадэвуша Касцюшкі спатрэбіўся. У 1792 годзе рускае войска выступіла на дапамогу антыканстытуцыйнай Таргавіцкай канфедэрацыі. 18 ліпеня дывізія Касцюшкі ў пяць тысяч жаўнераў у бітве пад Дубенкай спыніла наступ дваццацітысячнага корпуса генерала Кахоўскага. Гэтая перамога прынесла Касцюшку чын генерал-лейтэнанта і ордэн «Віртуці Мілітары». Пасля пераходу караля на бок таргавічан Касцюшка падаў у адстаўку. У караля ён больш не верыў. Але ён не змірыўся з паражэннем, ён быў гатовы змагацца…

Касцюшка прыехаў у Лейпцыг. На пасяджэнні кіраўнікоў патрыятычнага руху на чале з Гуга Калантаем Касцюшку прапанавалі ўзначаліць паўстанне. «Табе аднаму Айчына яшчэ давярае». 11 верасня 1793 года ў мястэчку Падгужы каля Кракава адбылася патаемная нарада, на якой Касцюшка пагадзіўся ўзначаліць паўстанне, але папярэдзіў: «Толькі за шляхту ваяваць не буду. Жадаю свабоды для ўсяго народа і толькі для яго гатовы ахвяраваць жыццём».

Паўстанне пачалося ў Кракаве. 24 сакавіка 1797 года абвешчаны Акт паўстання. «Мы выбіраем і прызнаём гэтым актам Тадэвуша Касцюшку вышэйшым і адзіным начальнікам нашых збройных сіл і кіраўніком нашага паўстання». Касцюшка ўрачыста прысягнуў, што нададзеную яму ўладу ён выкарыстае для «абароны нашых межаў, для аднаўлення народнага самаўладдзя і ўмацавання ўсеагульнай свабоды».

Першую перамогу паўстанцы атрымалі 4 красавіка ў бітве з рускім войскам каля вёскі Рацлавічы. Гэтая перамога натхніла на паўстанне Польшчу, а ўслед паднялася і Літва. Вайсковыя абставіны не дазвалялі Тадэвушу Касцюшку выехаць на Літву і непасрэдна ўзначаліць там паўстанне, але палымянымі заклікамі ён падтрымліваў у літвінаў агонь змагання. «Закліканы вамі, прыняў я начальства і гатовы ахвяраваць для вас жыццё… Ідзіце за мной. Вас чакае слава і гонар вызвольцаў Айчыны. Імем народа я камандую вамі, а разам з вамі ж намагаюся перамагчы або памерці. Спадзяюся, што і вы выбераце пагібель, а не ганебнае рабства». У гэты нялёгкі час Касцюшка быў прыкладам для паўстанцаў. «Касцюшка адзін не траціў сэрца… кідаўся ва ўсе бакі і адбіваў атакі», — пісаў яго ад'ютант Юльян Нямцэвіч. А ворагі ішлі сапраўды з усіх бакоў. 29 верасня начальнік прыехаў на дзень у Гародню, дзе сустрэўся з кіраўнікамі паўстання ў Літве.

Сцякаючы крывёю, паўстанцы адбіваліся ад трох раз'юшаных драпежнікаў. Заставалася ці перамагчы, ці загінуць. Пра гэта і мовіў Касцюшка перад бітвай пад Мацяёвіцамі: «Не маем адсюль адступаць. Тут загінуць альбо перамагаць трэба». Гэтая трагічная для ўсяго паўстання бітва адбылася 10 кастрычніка. Супраць 13-тысячнага корпуса генерала Ферзена Касцюшка выставіў сем тысяч паўстанцаў. Сілы былі няроўныя. Слава пераможаным — яны змагаліся па-геройску, яны змагаліся за свабоду. Густы град куляў і ядраў ударыў па паўстанцах, і яны вытрымалі гэты смяротны абстрэл. Не пахіснуліся. Аднак жалезных шыхтоў рускага войска нельга было спыніць. Да Касцюшкі слалі трывожныя весткі, што паўстанцы не вытрымаюць — трэба адступаць. Такога загаду начальнік не даваў. Ён сам кінуўся ў бой. Каля яго свісцелі кулі. Ад'ютант Нямцэвіч атрымаў раненне. Паў пад начальнікам конь. Смерці Касцюшка не баяўся, бо страшней за яе была ганьба і няволя. І вось паўстанцы пачалі ўцякаць. Касцюшка паспрабаваў спыніць іх, але, захоплены плынню уцекачоў, і ён вымушаны быў пакінуць поле сечы. Аднак начальніка дагналі казакі. Усё! Касцюшка прыставіў пісталет да рота, націснуў на курок — асечка. Паранены куляй, падае конь і прыціскае сабой вершніка. На бездапаможнага начальніка наляцелі ворагі, ударылі пікай у нагу, секанулі палашом па галаве. Касцюшка страціў прытомнасць. Палонныя паўстанцы пазналі свайго правадыра і, каб выратаваць яго ад смерці, паведамілі рускім. Начальніка прывялі ў прытомнасць, і ён прызнаўся: «Я Касцюшка, вады». Правадыр паўстання трапіў у палон. Гэтую навіну ў Варшаве ўспрынялі са слязамі і адчаем. Людзі плакалі. «Няма Касцюшкі! Загінула Айчына!»

Параненага Касцюшку пад моцнай вартай павезлі ў Пецярбург. Кацярына ІІ наказала даставіць героя патаемна: «Избегать всякой огласки, никому не показывать, а лучше всего, чтобы и по дороге не знали, кого везут». Як ні хавалі гэта ў вялікім сакрэце, але людскі погалас праляцеў па гарадах і вёсках, праз якія везлі ў закратаванай карэце начальніка — Касцюшку! У Магілёве натоўп людзей сустракаў жандарскі картэж. Стары шляхціц пабег за карэтай, каб толькі рукой дакрануцца да яе, як да святыні. У Віцебску сялянскія хлопцы, якіх забралі ў рэкруты, віталі вязня, зняўшы магеркі і схіліўшы галовы перад зняволеным героем. Яны

плакалі. Гэта было сімвалічна. Пасаромленая Бацькаўшчына аплаквала свайго мужнага сына і развітвалася з ім назаўжды.

Касцюшку кінулі ў казематы Петрапаўлаўскай крэпасці. Стан яго здароўя быў цяжкім: параненая нага не згіналася, не залечвалася рана на галаве. І тым не менш Касцюшку штодня дапытвалі. Два гады знаходзіўся Касцюшка ў палоне. Імператрыца аблегчыла ўмовы зняволення: перавяла яго з каземата ў дом каменданта крэпасці, дазволіла прагулкі. Тугу і горкія думкі вязень праганяў працай за такарным станком. Не з-за чуласці Кацярына аблегчыла становішча Касцюшкі, а з-за палітычных меркаванняў. У палітычнай гульні з Аўстрыяй і Прусіяй Касцюшка быў для Кацярыны казырным тузом. На выпадак пагаршэння адносін з гэтымі краінамі можна было падняць паўстанне на захопленых імі польскіх землях, а Касцюшка павінен быў узначаліць паўстанцаў. І ў далейшым славу Тадэвуша не раз спрабавалі выкарыстаць розныя палітыкі, нават сам Напалеон, але, да свайго гонару, Касцюшка адмаўляўся ўдзельнічаць у палітычных авантурах.

Вызваліў Касцюшку новы імператар Павел І. 27 лістапада 1796 года Павел І наведаў яго і абвясціў яму волю. І першы клопат Тадэвуша пра Айчыну: «Найяснейшы пан, ніколі не спагадаў уласнаму лёсу, але ніколі не перастану гаварыць пра лёс маёй Айчыны». Але Айчына была зняволенай, і жыць у ёй — значыць жыць у няволі. «Ужо ў тым краі, у якім нарадзіўся, не знайду Айчыны, але ў тым, дзе сваё жыццё закончу, а гэта Амерыка. За свабоду адной і другой нясу на ахвяру жыццё. Прыемней сузіраць другой Айчыны шчасце, якое суцяшаць будзе жаль сэрца па няшчасцю першай», — гэтак Касцюшка растлумачыў імператару сваё жаданне выехаць у Амерыку. Павел дазволіў яму пакінуць Расію. Па просьбе Касцюшкі імператар вызваліў 12 тысяч паўстанцаў. За гэта давялося Касцюшку даваць прысягу на вернасць.

У Амерыцы Касцюшка пасяліўся ў Філадэльфіі, жыў у двухпакаёвай кватэры разам з верным сябрам і паплечнікам Юльянам Нямцэвічам. На жыццё хапала, бо Кангрэс выплаціў Касцюшку жалаванне ў 22 тысячы доляраў. Са скрухай бачыў змагар за свабоду і роўнасць, што ў свабоднай Амерыцы няма гэтай свабоды і роўнасці. Улада належыць багацеям, а замест прыгонных тут больш жахлівае рабства неграў. Нібыта ў дакор аўтару Дэкларацыі незалежнасці Амерыкі Томасу Джэферсану Касцюшка

пры ад’ездзе ў маі 1798 года запаведаў яму выкарыстаць сваю маёмасць і пенсію на выкуп неграў з няволі. Хоць так, але паслужыць свабодзе людзей!

У Еўропу Касцюшка вяртаўся з надзеяй на рэвалюцыйную Францыю. У свой час менавіта паўстанне пад яго кіраўніцтвам выратавала Францыю ад вайны з Аўстрыяй і Прусіяй, і за гэта французы прызнавалі яго сваім нацыянальным героем. Няўжо цяпер яны не дапамогуць пасаромленаму народу? У французскай арміі знаходзіліся польскія легіянеры. Узначаліць іх Касцюшка быў гатовы пры ўмове прысягі «У нянавісці да каралёў і арыстакратыі, вернасці прынцыпам Французскай рэвалюцыі і вечным прынцыпам свабоды і роўнасці». Вось за гэта хацеў змагацца Касцюшка. Надзеі не спраўдзіліся. Польскія легіянеры пралівалі кроў за амбіцыйныя планы генерала Напалеона, які ваяваў за Італію з Аўстрыяй. Калі ж Напалеон захапіў уладу, стала ясна, што рэвалюцыя нарадзіла дыктатара. І было немагчыма быць у хаўрусе з душыцелем свабоды. Таму і адмовіўся Касцюшка ў 1806 годзе выступіць з заклікам да палякаў падтрымаць французаў у вайне з Прусіяй. Раззлаваны Напалеон рэзка адазваўся пра яго: «Не прыпісваю ніякага значэння Касцюшку, не карыстаецца ён такой павагай у краі, як сабе ўяўляе… ёсць проста дурань». Так, для ворагаў свабоды ён быў дурнем, бо дзе ім было зразумець памкненні вольналюбівай душы!

Памыляўся Напалеон. Слава Касцюшкі не згасла з часам, а наадварот — ператваралася ў легендарную, станавілася міфам і сімвалам свабоды.

Хацеў выкарыстаць славу Касцюшкі і расійскі імператар Аляксандр І. У палітычным гандлі за польскія землі з Аўстрыяй і Прусіяй імператар абяцаў Касцюшку аднавіць Рэч Паспалітую, стварыць канстытуцыйны ўрад, вызваліць з прыгнёту «няшчасных» сялян і даць ім зямлю, «чым адным зрабіўся б бессмяротным», — як адзначыў Тадэвуш. Абяцанне імператар даў, але выконваць яго не збіраўся. Занепакоены Касцюшка напісаў Аляксандру: «Нарадзіўся я ліцвінам, найяснейшы пане, і няшмат гадоў жыцця мне застаецца, а заслона яшчэ пакрывае будучы лёс маёй роднай зямлі і шматлікіх яе ўскраін». Аляксандр не адказаў, і, як горка наракаў Касцюшка ў лісце да Джэферсана, «усё з дымам пайшло». Хоць якая, але была карысць у гэтых дамовах з Аляксандрам. Імператар настаяў перад Аўстрыяй і Прусіяй на ўтварэнні

Варшаўскага княства. Больш Касцюшка нічога не мог зрабіць — «не магу з карысцю служыць сваёй Айчыне». Касцюшка адышоў ад палітыкі і пераехаў у 1815 годзе з Францыі ў ціхі швейцарскі гарадок Салюры.

Да апошніх дзён не пакідаў яго смутак па радзіме. «Я ад душы жадаў служыць Айчыне, але не здолеў гэтага зрабіць і вельмі смуткую аб тым». Перад смерцю ён у тастаменце наказаў вызваліць сяхновіцкіх сялян «на вечныя часы ад прыгоннай залежнасці, выкарыстання іх працоўнай сілы і выплаты даніны». Ды і цяпер рэчаіснасць была мацнейшай. Па просьбе пляменніцы Тадэвуша цар адмяніў апошнюю волю «ворага прыгнятальнікаў».

15 кастрычніка 1817 года Тадэвуш Касцюшка памёр. Шануючы яго, будучы прэзідэнт Амерыкі Вільям Гарысан мовіў у Кангрэсе: «Слава яго жыць будзе датуль, пакуль дух вольнасці панаваць будзе над светам. Пакуль на алтар вольнасці яе абаронцы будуць класці ў ахвяру сваё жыццё, імя Касцюшкі будзе жыць сярод нас». Так і ёсць.

KAMUNIKAT.org

**ЮЛІЯ АЛЯХНОВІЧ**

*(15 гадоў, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.)*

## МАЕ КАРАНІ

Шмат Аляхновічаў жыве на свеце сёння,
І гэты род вядзецца ўжо здаўна.
І знакамітых, і разумных ў ім бяздонне,
А Беларусь, як маці, ў іх адна.

*Віктар Аляхновіч*

Я — звычайная беларуская дзяўчына Юля Аляхновіч. Жыву на нашай роднай зямлі ўжо пятнаццаты год. Мой родны горад Баранавічы. Расла і гадавалася ў пасляперабудовачны час, калі Беларусь абвясціла сваю незалежнасць. Дзякуючы майму бацьку Віктару, апантанаму змагару за ўсё беларускае, нашчадку шляхецкага роду, я з самага нараджэння выхоўвалася як беларусачка. У той час шпаркімі тэмпамі наладжвалася беларускае жыццё, узнікалі беларускамоўныя садкі, школы. У адзін з гэтых садкоў хадзіла і я. То быў садок ля чыгуначнага вакзала Баранавічы-Цэнтральныя. Усё жыццё там было пастаўлена па-нашаму, па-беларуску гульні, спевы, адзначэнне розных святаў. Усё гэта адбывалася натуральна, без ніякага прымусу, ад душы.

Першая мая сустрэча з непрыемнымі пераменамі сталася ў 1995 годзе, калі я пайшла ў першы клас сярэдняй школы № 12. У той час да ўлады прыйшоў тав. Лукашэнка. Было загадана па ўсёй Беларусі ліквідаваць беларускае навучанне. Маю сястру Алесю, якая скончыла тры беларускія класы, дабравольна-прымусова перавялі ў чацвёрты рускамоўны клас. Аргумент быў адзін — што ўсё адно ў нашай дзяржаве няма беларускамоўных ВНУ. Гэта гучала як непрыхаваны здзек. Гэтак зрабілі і з трэцімі, і з другімі класамі нашай школы. Як цяжка дзеткам было перавучвацца на чужую мову навучання! Сястра Алеська неаднойчы плакала з гэтай нагоды. Калі мяне прымалі ў школу, то з сямі першых класаў не знайшлося ніводнага беларускамоўнага, хаця школа мела статус беларускай. Я глядзела на сваю першую настаўніцу, слухала яе, але разумела з цяжкасцю. Гэта тое самае, што расейца вучыць на роднаснай балгарскай: і словы падобныя, і гучанне славянскае, а разабраць што-небудзь немагчыма. Пра што думалі кіраўнікі ад

адукацыі, праводзячы гэткі гвалт над малымі дзецьмі?! Чаму гэтак адбываецца, я ў той час яшчэ не разумела, але сваё, роднае выбіць з мяне гэтым не ўдалося. З цягам часу мяне стала цікавіць: хто мы, адкуль мы, навошта жывем? Усе гэтыя веды я атрымоўвала дома, у сваёй сям'і. Мой тата заўжды стараўся больш даведацца пра праўдзівую гісторыю нашай Бацькаўшчыны, пра гісторыю свайго роду. Збіраў дадзеныя ад старэйшых і з кніг. Атрымалася не проста гісторыя роду Аляхновічаў, а гісторыя нашай краіны ў мініяцюры. З гэтай гісторыяй я і хачу вас пазнаёміць.

Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Еўрапейскія народы здаўна ўплывалі адзін на аднаго сваёй культурай. Не вельмі далёка ад Беларусі знаходзіцца Скандынаўскі паўвостраў. Адтуль да нас заўсёды лёгка было трапіць водным шляхам, што праходзіў з варагаў у грэкі. Пачатак гэтага шляху праходзіў па рэчцы Заходняя Дзвіна. Там жылі і цяпер жывуць прадстаўнікі скандынаўскіх народаў. Даўней яны зваліся нарманамі, варагамі. Іхнія воі мелі назву вікінгі. Гэтыя народы ўшаноўвалі сваіх багоў. Аднаго з іх звалі Хольг. Свята Хольг адзначалі вясной, калі прырода абуджалася ад зімовага сну. У гонар гэтага бога шмат вікінгаў насіла гэта імя.

У Скандынавіі, краіне фіёрдаў, было мала ворнай зямлі. Каб пракарміць свае сем'і, мужчыны адпраўляліся на караблях рабаваць навакольныя народы. Дабіраліся яны і да Беларусі. Гэта былі вельмі адважныя воі. Нашы продкі змагаліся супраць захопнікаў і амаль заўсёды перамагалі іх. Каб яшчэ лепш абараняць свае землі, беларусы наймалі сабе ў ваяводы самых адважных з вікінгаў. Ваяводы жаніліся з мясцовымі дзяўчатамі, заводзілі сем'і, і радзіма нашых продкаў стала радзімай іхніх дзяцей. Мясцовыя людзі з цяжкасцю вымаўлялі імя Хольг. Гэтае імя ператварылася спачатку ў імя Ольх, а пасля ў Алег, Алехна. Дзяцей сталі зваць Аляхновічавымі. Гэтак і ўтварылася прозвішча Аляхновіч.

Першую згадку пра імя Алег мы знайшлі ў летапісе «Аповесць мінулых гадоў». Там гаворыцца, што пасля смерці Рурыка (879 г.) княжыць прызначылі ў горадзе Ноўгарадзе яго малалетняга сына Ігара. Апекуном стаў блізкі родзіч Алег. Гэтым самым ён зрабіўся паўнапраўным гаспадаром Наўгародскага княства. Я лічу гэта першай згадкай пра вытокі майго роду. У літаратуры, напісанай на аснове летапісаў, першая згадка прозвішча Аляхновіч памечана

1508 годам. У гэты час Пётр Аляхновіч, што служыў пры каралі польскім, вялікім князе літоўскім Жыгімонце Казіміравічы паслом, ездзіў з пасольскай місіяй да князя маскоўскага Васілія.

Першы вядомы нашай сям'і наўпроставы продак Аляхновіч зваўся Вікенціем. Дадзеныя пра яго ўзяты з захаваўшайся купчай на зямлю. У ёй сказана, што Вікенцій Аляхновіч са сваім сынам Пятром купілі за 500 рублёў 34 дзесяціны 1820,5 квадратных сажаняў зямлі на хутары Котлішча. Вікенцій прыходзіцца мне прапрапрадзедам. Прапрадзед Пётр жыў на той купленай сядзібе, якая знаходзілася ў Смалянскім павеце Круглянскай воласці Магілёўскага ўезда. Сям'я была беларуская, рыма-каталіцкага веравызнання. Паходзіў ён з сям'і аднадворцаў, а гэта значыць, што яго продкі раней мелі шляхецкае званне. Пасля драпежнага захопу нашых земляў Расійскай імперыяй шляхецкае званне і прывілеі былі гвалтоўна забраны ў бяднейшай шляхты. Памёр ён прыкладна ў 1922 годзе. Меў жонку Закржэўскую Петрунелю Антонаўну. Сярод іхніх шасці дзяцей быў і мой прадзед Віктар.

Прадзед Аляхновіч Віктар Пятровіч (25.02.1878–30.08.1933), атрымаўшы ўсебаковую адукацыю, у тым ліку і музычную, працаваў арганістам у розных касцёлах Беларусі: да 15.05.1915 года ў Лунінецкім касцёле, у Новай Мышы. Зарабіўшы грошай, з сям'ёй пераехаў на радзіму і купіў зямлю ў тым павеце, дзе і нарадзіўся. У нашым сямейным архіве захоўваецца яго шлюбнае пасведчанне. Ён быў абвенчаны з Марыяй Дамарацкай у Абалецкім касцёле 19.11.1907 года ва ўзросце 29 гадоў. Гэты шлюб даў свету чацвёра дзяцей, сярод якіх быў і мой дзядуля Станіслаў (19.07.1912–13.10.1990).

Віктар Пятровіч адбываў воінскую павіннасць у царскім войску ратнікам апалчэння прызыву 1899 года. Віктар Аляхновіч шчасліва жыў на сваёй зямлі, гадаваў дзяцей, займаўся сялянскай гаспадаркай. Але з прыходам камуністычнай улады бязбеднае жыццё скончылася. Пачаліся харчразвёрсткі, якія даводзілі людзей да галечы, і замененыя пасля не на шмат лепшыя харчналогі. А знішчыла гаспадарку ўшчэнт калектывізацыя ў 1933 годзе. Пад прымусам майго прадзеда, як і астатніх сялян яго вёскі, загналі ў калгас. Забралі для агульнага карыстання зямлю, кабылку, прылады для працы. Да жывёлы, асабліва цяглавай, у людзей вельмі цёплыя адносіны. Яны яе вельмі любілі, добра даглядалі, шкадавалі. Праз невялікі тэрмін сяляне рашылі выйсці з калгаса і пазабіралі сваіх

коней дадому. Камуністычная ўлада прабачыць гэтага не магла! Каб задушыць супрацiў у зародку, паарыштоўвала самых разумных і, па іхняму меркаванню, завадатараў. Мой прадзед як чалавек адукаваны, музыкант, царкоўны служка выдатна падыходзіў для гэтай ролі. Арыштаваных звезлі ў Аршанскую турму. Следства вялося на працягу пяці месяцаў з прымяненнем вытанчаных катаванняў. Так нічога і не выбіўшы, тагачасныя ўлады ўжылі падлейшы прыём! Прапалілі ў лазні, каб нібыта даць магчымасць вязням памыцца, але юшкі знарок пазачынялі раней, чым трэба. У памяшканні сабралася шмат угарнага газу. У гэтую лазню і загналі ўсіх муляючых дзяржаве мужыкоў. Пасля іхняй смерці ад атручэння калгас быў арганізаваны вельмі лёгка. Гэтак, без усялякага намёку на справядлівасць, загінуў мой прадзед Віктар. Светлая яму памяць. Ягонай удаве Марыі ў Еўнухоўскім сельсавеце Талачынскага раёна выдалі адрыўны талон запісу акта аб смерці, у якім гаворыцца, што Аляхновіч Віктар Пятровіч памёр 30.08.1933 года ад хваробы. Крывадушнікі! Не палічылі нават патрэбным напісаць, ад якой! Кінуўшы ўсё, сямейнікі пайшлі са слязамі на вачах жыць далей ад уласнай карміцелькі зямлі ў гарады.

Мой дзядуля Стась скончыў дзесяць класаў, што па тым часе было нямала. Працаваў у горадзе Оршы электрыкам на электрычнай станцыі. Там пабраўся шлюбам з маладой настаўніцай Федаровіч Сафіяй Іосіфаўнай. Гэта адбылося 31.07.1939 года.

Мой прапрадзед па гэтай лініі Фелікс Федаровіч быў таксама са збяднелай беларускай шляхты, пазбаўленай свайго звання і пераведзенай у сялянскае саслоў’е. Жыў на хутары Котаўка Віцебскай губерні. Першым вядомым ягоным і маім продкам лічу маскоўскага першадрукара Федаровіча, вучня Францыска Скарыны, што нарадзіўся і ўзгадаваўся на нашых землях, сапраўднага літвіна, прозвішча якога расейцы запісалі па-свойму — Фёдараў. Фелікс таксама паходзіў з беларускай рыма-каталіцкай сям’і. Ягоную жонку звалі Петрунеля. Мелі шасцёра дзяцей. Апошнім сынам быў Іосіф, мой прадзед.

Іосіф Феліксавіч Федаровіч (1855–1936) доўга служыў у царскім войску. Вярнуўся толькі ў 1892 годзе, маючы 37 гадоў ад роду, у чыне фельдфебеля. Будучы не зусім маладым чалавекам, жадаў завесці сабе сям’ю. Неяк зайшоў з гэтай мэтаю да ўдавы Марыі Губарэвіч, якая мела сямёра дзяцей. Некалькі разоў завітаўшы да

ўдавы, заўважыў, што самая старэйшая з іх Бранiслава (1875–1927), хаця i на дваццаць гадоў маладзейшая за яго, але вельмi прыгожая i ўжо дзеўка на выданнi. Нядоўга думаючы, паслаў сватоў i справiў вяселле ў 1896 годзе.

У той час былыя шляхцiцы будавалi сваё жытло на хутарах, каб быць больш незалежнымi. Ягоны бацька Фелiкс купiў у пана Славiнскага на дваiх з братам Цэзарам семнаццаць гектараў зямлi. У асноўным гэта было балота, трохi лесу i яшчэ меней ворыўнай зямлi. Бацька заплацiў толькi задатак, а астатняе павiнны сплочваць сыны. Прыйшоў Iосiф з жонкаю на сваё ляда, павесiў торбу з салам i хлебам на галiну дрэва i сказаў: «Тут будзе хата». Колькi было ўкладзена сiл у карчаванне пнёў, хмызняку, асушэнне балота, будоўлю, не падлiчыць. Падросшыя дзецi таксама прымалi непасрэдны ўдзел у гэтай працы. На ачышчанай зямлi сеялi збожжа i iншыя сельскагаспадарчыя культуры, займалiся жывёлагадоўляй. Навокал былi вялiкiя лясы. З iх прыходзiлi i з'ядалi пасаджанае начныя гаспадары мядзведзi. Пабудавалi вышку, i з яе стралялi ў шкоднiкаў. Аднаго разу атрымалася гэтак, што дзед не справiўся ўцячы ад мядзведзя, i той яго моцна паранiў. Iосiф умомант поўнасцю ссiвеў.

Прайшло гадоў 25 пасля куплi зямлi. Усе гэтыя гады сплачвалi запазычанасць пану. У 1923 годзе расплацiлiся напоўнiцу. А ў 1932 годзе гвалтоўна забралi зямельку ў калгас. О зямелька! Колькi табе аддадзена сiлаў, пралiта поту, крывi!

Ад страшэннага стрэсу ўсё цела прадзеда пакрылася карычневымi плямамi, якiя так i не сышлi да самай смерцi. Iосiф адкрыта выказваў сваё незадавальненне. Ад фiзiчнага знiшчэння яго, як у вёсцы казалi, былога афiцэра, выратоўвалi толькi старэчыя гады. Кiнуўшы сваю камянiстую зямлю, ён падаўся на радзiму жонкi, у вёску Губарава, дзе зямля была нашмат лепшая. Там былi ўсе знаёмыя i ў тамтэйшы калгас прынялi без праблемаў. Там ён i памёр у 1936 годзе.

У маёй бабулi Сафii (1915–2003) было яшчэ 15 братоў i сясцёр. Яна была трынаццатая ў сям'i. Мацi рана памерла ад сухотаў, i ва ўзросце 12 гадоў яна асталася сiратою са старым бацькам. Меншыя трое яшчэ раней памерлi ад хваробаў i трагiчных выпадкаў. Жыццё i пры мацi не было лёгкiм. Хадзiлi босыя ад снегу да снегу. Абутак быў на зiму толькi ў тых, хто ўзiмку хадзiў у школу. Пра адукацыю ў сям'i былых шляхцiцаў не забывалiся нiколi, знаходзiлi на гэта

грошы. Калі дзеці выраслалі, іх жанілі, выдавалі замуж. Трэба было нешта даць у пасаг, зрабіць вяселле. Дзеці нараджаліся амаль кожны год, таму і да шлюбу ішлі штогадова. Калі меншыя пыталіся ў маці, чаму ў кашы мала мяса, то тая казала: «Вяселле з'ела». Нягледзячы на нястачу, Сафія здолела скончыць школу, потым педагагічны тэхнікум. Выйшла замуж. Нарадзілася дзіця, мой дзядзька Леанард (1940).

Але тут пачалася Другая сусветная вайна. Беларусь была захоплена ўжо іншымі акупантамі. У Оршы ўжо не было на што існаваць, і сям'я з'ехала на радзіму Сафіі ў вёску. Немцы падзялілі калгасную зямлю паміж сялянамі і прызначылі цярпімы падатак на зямлю. Ураджаю хапіла, каб яго сплаціць, сябе пракарміць і пракарміць партызанаў, што пачалі арганізоўвацца ў лесе. Мінула тая галадуха, што была пры калгасах.

Каб забяспечыць прыток людской сілы ў партызанскія атрады, савецкія камандзіры пачалі нападаць на малалікія гарнізоны немцаў. Тыя пачалі прымяняць рэпрэсіўныя меры да мясцовага насельніцтва, аб'явілі мабілізацыю ў паліцыю. Камуністы пачалі патроху перамагаць на фронце. Узважыўшы ўсё, дзядуля вырашыў падацца да партызан. Але як гэта зрабіць? Сям'я застаецца ў вёсцы. Як партызанскую яе хутка расстраляюць. Тады па яго просьбе партызаны прыйшлі да яго са зброяй і як бы сілком забралі з сабою. Гэта было 2.09.1943 года. Трапіў ён у атрад № 24 брыгады № 8 у званні шарагоўца. Адной з мэтаў брыгады была рэйкавая вайна. Аршанскі чыгуначны вузел даваў вялікія магчымасці для гэтага. На падрыў чыгункі мой дзядуля хадзіў неаднаразова. Каб здабыць сабе бяспеку, акупанты вырашылі знішчыць партызанскі атрад. Наладзілі блакаду, у час каторай майго дзядулю цяжка параніла. Яму яшчэ пашанцавала, вайна для яго скончылася. І яшчэ вялікае шанцаванне — праз тры тыдні самалётам адвезлі яго ў шпіталь. Лячылі яго да 1.09.1944 года. Вярнуўся да сям'і ў зноў савецкую Беларусь інвалідам 2-й групы. Нага не гнулася ні ў калене, ні ў бядры і была на шэсць сантыметраў карацейшая.

Пасля сканчэння вайны брата бабулі Сафіі Антося Федаровіча аправілі ў былую Заходнюю Беларусь у якасці савецкага спецыяліста-ветэрынара. Трапіў ён у горад Баранавічы. Пацешыўшыся «радасцямі» калгаснага жыцця, дзядуля Стась з бабуляй Сафіяй вырашылі пераехаць у гэты горад, каб трохі лепей пажыць да часу, пакуль тут расцвіце камунізм. Тут згадалася і

жыхарства прадзеда Віктара ў Новай Мышы. Дзядуля Антось дапамог з пропускам, і горад Баранавічы стаў радзімай для майго бацькі і для мяне. Каб неяк кампенсаваць нягоды дзядулі Стася, улады далі невялічкую пенсію і медаль «За перамогу над Германіяй», юбілейныя медалі, у 1985 годзе ордэн Айчыннай вайны I ступені. Працаваў на чыгунцы, адзначаны Ганаровымі граматамі, медалём «Ветэран працы».

Бабуля Сафія працавала ў Баранавічах настаўніцай малодшых класаў у школах № 41 і 15, а ў 1952 годзе перайшла працаваць па стану здароўя на чыгунку праваднічай. За выдатную працу адзначалася неаднаразова Ганаровымі граматамі. Памерла ў 2003 годзе.

Станіслаў і Сафія мелі траіх дзяцей. Малодшы Віктар, мой бацька, нарадзіўся ў 1953 годзе. Прымаў актыўны ўдзел у музычным гуртку школы. Служыў у войску вучэбнай танкавай дывізіі. Пасля паўгадавога шкалення ў 1971 годзе яго адправілі ў Цэнтральную групу войск (акупацыйныя войскі ў Чэхаславакіі), у горад Есенік. Бацьку было цяжка. Да акупантаў людзі адносіліся варожа. За гады акупацыі нават не здолелі пасціраць усе надпісы накшталт «Акупанты, прэч дамоў!». Калі вайсковай калонай прыходзілася ездзіць па іхніх дарогах, то амаль кожны лічыў сваім абавязкам патрэсці ўслед чужым войскам кулаком, палкай ці матыкай.

Бацька звольніўся з войска ў 1973 годзе ў званні малодшага лейтэнанта запасу. Працаваў электрыкам. У 1983 годзе скончыў тэхнікум па спецыяльнасці тэхнік-электрык. Працаваў некаторы час энергетыкам, механікам. Пасля перабудовы пракарміць сям’ю было вельмі цяжка. Прыйшлося пайсці на будоўлю і перакваліфікавацца ў цесляра. Новую прафесію асвоіў выдатна. Тройчы быў назіральнікам на выбарах ад праваабарончага цэнтра «Вясна».

У 1986 годзе пабраўся шлюбам з маёй маці, Макарэвіч Тамарай Іванаўнай. Мама нарадзілася на Палессі, у сяле Малькавічы. Мае сястру і двух братоў. Сям’я працавітага роду. У свой час мой прапрапрадзед Аляксей Шапялевіч меў у сваёй гаспадарцы 40 кароў. Не проста меў, а з сям’ёй карміў, даіў, пасвіў, працаваў на зямлі. Узаемадапамога, узаемавыручка з’яўляюцца асноўнай рысай характару маіх паляшуцкіх продкаў. Жылі ў сваім краі. Радзіма была для іх не простым гукам.

Прапрадзед Мікалай таксама меў моцную гаспадарку. Прадзед Міхась праявіў свае здольнасці ў высокапрафесійнай працы на чыгунцы. Бабуля Валя працавала ў саўгасе бухгалтарам. Тым жа шляхам пайшла і мая мама Тамара.

У мяне ёсць старэйшая сястра Алеся. Працавітая, старанная дзяўчына. Вельмі добра скончыла адзінаццаць класаў. Зараз вучыцца ў Польшчы, ва універсітэце горада Катавіцы. Яшчэ да паступлення вывучыла польскую мову, таму навучанне ў іншай дзяржаве на іншай мове не стварае ёй вялікіх праблемаў.

Я таксама стараюся не асароміць сваіх продкаў, не лянуюся. Вывучаю мову нашых заходніх суседзяў. Удзельнічаю ў мастацкай самадзейнасці, спяваю ў касцельным хоры. Можа, гэта і дзіўна, але з архіўных дакументаў вынікае, што маімі продкамі былі толькі беларусы — з боку бацькі рыма-католікі, з боку маці — праваслаўныя. Хрысціянская ідэалогія ўздзейнічае і на мяне з дапамогай выпрацаванага маімі продкамі вопыту. Я пастараюся, каб і мае нашчадкі з годнасцю неслі гэтую культуру, здабывалі для сваёй Радзімы Беларусі славу і дабрабыт сваёй плённай працай. Хай наша Беларусь жыве вечна! Набытая намі нядаўна незалежнасць — гэта тая аснова, ад якой нам ніяк нельга адмаўляцца. Нельга, каб намі кіравалі акупанты і розная навалач. Хай нашы нашчадкі жывуць у сваёй незалежнай краіне. Мы ж сваімі дзеяннямі будзем старанна садзейнічаць гэтаму.

ЗМЕСТ


Мікулік Ганна

Нашчадкі змагарнай славы ................................

Варшук Валерыя

Стэфан Баторый ..................................................

Пісьмо з XVI стагоддзя .....................................

Казак Міхась

Леў Сапега — гонар маёй Айчыны ...................

Юруць Ганна

Я — нашчадак ....................................................

Наваградская Аксана

Малады. Гарачы. Смелы Нарбут.......................

Еўфрасіння Полацкая .........................................

Усяслаў Чарадзей...............................................

Паліўка Аляксандр

«Марыська чарнаброва, галубка мая...» ...........

Зоськін вір...........................................................

Тадэвушу Касцюшку прысвячаецца .................

Мегель Аляксандр

Памяці каліноўцаў .............................................

Волкава Марыя

Давыд Гарадзенскі .............................................

Шмідава Аліна

Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі ........................

Кісялёва Ірына

Ратную славу набыў Канстанцін Астрожскі .....

Глыбоўскі Іван

Нашчадкі змагарнай славы ..................................

Гапеева Наталля
Грунвальдская бітва 1410 года..........................

Борыс Алена
Герой Бітвы Народаў: *Балада* ...........................

Сцяпанава Кацярына
Янка................................................................
Ігнат...............................................................
Мікола............................................................

Даўгалёва Людміла
Узгадкі маіх родных..........................................

Сыч Марына
Скопцы............................................................

Грыневіч Яўген
За нашу і вашу свабоду!: *Ацалелыя старонкі з дзённіка невядомага паўстанца*
Уступ..........................................................
Дзённік.......................................................
Вершы, знойдзеныя ў запісах паўстанца ...

Калеснікава Алена
Паўстанне 1863—1864 гг. на Беларусі і Літве..

Корсак Павел
Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі........................

Навуменка Васіль
Роднае ............................................................
Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы...

Абібак Ксенія
Беларусам .......................................................

Сычкоў Раман
«Шмат гадоў таму назад...» ...............................

Пешчур Яўген
Рагнеда ............................................................................

Паліўка Таццяна
490-годдзе бітвы пад Оршай...............................

Стасенка Марына
Успамін пра іх ..................................................
Тадэвушу Касцюшку .........................................

Шыцік Вольга
Дзядулева памяць .............................................

Котух Вольга
Мінуўшчыны героям.......................................

Зайкоўская Данута
«Справа ўваскрэсне, як прыспее час...» ............

Жук Максім
Яго Амерыка .....................................................

Карпейчык Надзея
«Сябар прыгнечаных, вораг прыгнятальнікаў»

Аляхновіч Юлія
Мае карані .........................................................

**Нашчадкі змагарнай славы:** Сачыненні пераможцаў дзіцячага конкурсу / МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». — Мн.: Бел. кнігазбор, 2004. — 168 с.
ISBN 985-6730-60-0.

У кнігу ўвайшлі лепшыя творы пераможцаў дзіцячага лігаратурна-мастацкага конкурсу, праведзенага Міжнародным грамадскім аб'яднаннем «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» ў лютым–красавіку 2004 г.

УДК 373.18(079):882.26.09
ББК 74.200.58

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Нашчадкі змагарнай славы**

*Сачыненні пераможцаў дзіцячага конкурсу*

Рэдактар *Н. Давыдзенка*
Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Камп'ютэрны набор *Л. Ваўчок, Н. Шыдлоўская*
Вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *Н. Аляксеева*

Пры афармленні вокладкі
выкарыстаны малюнкі Арцёма Барздова (г. Барань)
«Вялікі князь Гедымін і Давыд Гарадзенскі»
і Давіда Сяргея (в. Рабінавая, Ваўкавыскі р-н)
«Гады выпрабаванняў»

Падпісана да друку 20.07.2004 г. Фармат 84х108 $^{1}/_{32}$.
Друк афсетны. Папера афсетная.
Ум. друк. 8,8 арк. Ул.-выд. 5,17 арк.
Наклад 300 паас. Зак. 1114.

МГА «Беларускі кнігазбор».
220034, Мінск, вул. Фрунзе, 5.
**Тэл./факс (017) 220-70-27.**
Ліцэнзія ЛВ № 02330/0056929 ад 1.04.04.

Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка
ў друкарні УП «Ходр» БелТІЗ.
220004, г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.
Ліцэнзія ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.04.